Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

# 1921 Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт 1927

ДА 10-й ГАДАВІНЫ

КАСТРЫЧНІКАВАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

МЕНСК — 1927 г.

37
Б34

Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

# Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт

**1921 — 1927**

### ДА 10-й ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКАВАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

МЕНСК — 1927 г.

БИБЛИОТЕКА
№ 1684

# Прадмова.

*Праўленьне Унівэрсытэту выпускае гэты зборнік, прысьвечаны 10-годзьдзю Кастрычнікавай Рэвалюцыі.*

*Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт быў вызваны да жыцьця толькі дзякуючы Кастрычнікавай Рэвалюцыі, і з прычыны гэтага сьвяткаваньне 10-годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі зьяўляецца для БДзУ асабліва ўрачыстым.*

*Гэты зборнік у кароткіх рысах знаёміць з гісторыяй і становішчам БДзУ напярэдадні 10-годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі. Гісторыя заснаваньня і разьвіцьця Унівэрсытэту сьведчыць аб тым, што толькі дзякуючы напружанай працы прафэсароў і студэнцтва, пры дапамозе Беларускага ўраду, Наркамасьветы, партыйных і прафэсыйных арганізацыі удалося заснаваць Унівэрсытэт на тэрыторыі Савецкай Беларусі.*

В. І. ПІЧЕТА.

# Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт напярэдадні 10-годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі.

## І. Гісторыя Унівэрсытэту.



Праф. В. І. Пічэта.

Першая вышэйшая школа на Беларусі была заснавана ў XVI стагодзьдзі, калі распараджэньнем Сьцяфана Баторыя была адчынена Віленская Ізэуіцкая Акадэмія, якая па сваёй арганізацыі ставіла мэтай падрыхтоўку прафэсыйных дзеячоў на рэлігійным груньце. Гэта канфэсыянальная школа была ў той час і школай шляхецкай па свайму сацыяльнаму складу. У апошнія гады існаваньня Рэчы Паспалітай Віленская Ізэуіцкая Акадэмія была зачынена і рэфармавана ў Галоўную Школу. Рэфарматары Вышэйшай Школы мелі на ўвазе арганізацыю такой вышэйшай школы, якая-б больш адпавядала тагачаснаму жыцьцю і тым поглядам, якія ў той час зьяўляліся пануючымі. Ня гледзючы на рэформу, Галоўная Вышэйшая Школа заставалася каталіцкай і шляхецкай. Галоўная Вышэйшая Школа, указам 17 чэрвеня 1803 г., была рэфармавана ў Віленскі Унівэрсытэт, у складзе факультэтаў: Мэдыцынскага, Фізыка-Матэматычнага, Навук Моральных і Палітычных, Славеснага і Вольных Мастацтв.

Віленскі Унівэрсытэт, у арганізацыі якога прымаў дзейны ўдзел кн. Адам Чартарыйскі, стаў цэнтрам польскай культуры і асьветы. Будаўнікі Віленскага Унівэрсытэту запрасілі для выкладаньня найбольш выдатныя сілы таго часу. Дзякуючы таму, што найбольш адукаванай клясаю зьяўлялася духавенства, вельмі значная частка кафэдр была занята прадстаўнікамі духавенства, якія былі захоплены клерыкальнымі тэндэнцыямі. І ў сацыяльных адносінах Віленскі унівэрсытэт заставаўся ўнівэрсытэтам шляхецкім. Нельга адмаўляць таго, што Віленскі Унівэрсытэт, ня гледзючы на свае польскія тэндэнцыі, часткова зьвяртаў увагу на літоўска-беларускую культуру ў яе мінулым. Дзеячы Віленскага Унівэрсытэту паклалі пачатак навуковай распрацоўцы гістарычных, гісторыка—юрыдычных проблем

якія былі зьвязаны з мінулай культурай Беларускай краіны. Праўда, гэтыя проблемы разглядаліся скрозь прызму полёнафільскага настрою і сьветапогляду, але ўсё-ж такі распрацоўка цэлага шэрагу проблем мае сваё навуковае значэньне і ў сучасны момант.

Паўстаньне 1830 г. было крытычным момантам у гісторыі Віленскага Ўнівэрсытэту, студэнты якога былі прыхільнікамі рэвалюцыйных ідэй і настрояў. Мікалай I, маючы на ўвазе правядзеньне русіфікатарскай палітыкі, пачаў апошнюю з зачыненьня Віленскага Унівэрсытэту, лічучы, што да таго моманту, пакуль існуе навуковы цэнтр, як Віленскі Унівэрсытэт, барацьба з польскім уплывам на тэрыторыі Літвы і Беларусі будзе вельмі цяжкай. З прычыны гэтага ўрадавым указам ад 1-га мая 1832 году Віленскі Ун-т быў зачынены. З гэтага моманту Беларусь засталася бяз вышэйшай навучальнай установы.

Урад Мікалая I падымаў пытаньне аб арганізацыі вышэйшай навучальнай установы ў іншым месцы на абшарах Беларусі, але з гэтых прапаноў нічога ня выйшла. І ў далейшыя часы падымалася пытаньне аб арганізацыі вышэйшай школы на Беларусі. Падымаліся розныя гутаркі, хадайнічалі перад Урадам прадстаўнікі Гарадзкіх Дум і Земстваў, але з гэтых хадайніцтваў нічога ня вышла. Царскі урад баяўся даць на Беларусі вышэйшую школу зтым, каб яна ня стала цэнтрам апазыцыйнага, нацыянальна-культурнага і палітычнага руху.

У часы нямецкай акупацыі, беларускія буржуазныя дзеячы таксама паднялі пытаньне аб арганізацыі Унівэрсытэту па тыпу старых унівэрсытэтаў, уключаючы сюды і Багаслоўскі Факультэт з аддзяленьнямі розных рэлігійных вызнаньняў. Аднак, і гэтыя праэкты засталіся толькі праэктамі.

Толькі з моманту ўтварэньня Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі зьявілася мажлівасць адчыненьня вышэйшай школы, ня гледзячы на тое, што Беларусь, дзякуючы вайне і грамадзкай барацьбе, знаходзілася ў вельмі вялікім гаспадарчым зруйнаваньні. Беларускі Савецкі ўрад добра зразумеў неабходнасьць арганізацыі вышэйшай школы на Беларусі, каб, з аднаго боку, адчыніць сьцены Ун-ту працоўным масам, якія да сучаснага моманту не маглі ўвайсьці ў сьцены Ун-ту, а з другога боку, каб мець практычных дзеячоў працоўнага складу для будаўніцтва новай культуры, а таксама для гаспадарчага і нацыянальна-культурнага адраджэньня Беларусі.

Па ініцыятыве Беларускага Ўраду, пад агульным кіраўніцтвам Наркамасьветы БССР, была арганізавана камісія для падрыхтоўкі адчыненьня Ун-ту. Гэта Камісія падзялілася на дзьве часткі: адна працавала ў Менску, другая працавала ў Маскве. У склад апошняй увайшлі выдатныя вучоныя сілы з ліку маскоўскіх вучоных.

Маскоўская Камісія займалася распрацоўкай навучальных пляпаў, запрашэньнем прафэсароў і навуковых сіл для Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, а таксама пакупкай неабходнага навукова-навучальнага інвэнтару. Наркамасьветы РСФСР, які меў вопыт у арганізацыі вышэйшых школ, даваў агульнае кіраўніцтва гэтай Камісіі і дапамагаў апошняй у яе працы.

Уся праца па арганізацыі Унівэрсытэту была скончана ў пачатку красавіка 1921 году. На 3-яй сэсіі Цэнтр. Выканаўчага Камітэту Савету БССР было пастаноўлена адпавіць праэкт адчыненьня ў Менску Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, адчыніць апошні ў складзе факультэтаў, Рабочага, Грамадзкіх Навук, Мэдыцынскага,

Сельска—Гаспадарчага і Фізыка—Матэматычнага. Прымаючы пад увагу агульнае эканамічнае становішча, было пастаноўлена адчыніць у першую чаргу Рабочы Факультэт, Мэдыцынскі, Грамадзкіх Навук, у якіх асабліва адчувалася патрэба. У сувязі з гэтым ЦВК Савету БССР выдаў пастанову, каб усе органы лічылі ўсе пытаньні ў сувязі з арганізацыяй Ун-ту тэрміновымі, і ў першую чаргу дапамагалі задавальняць патрэбы Ун-ту. Ня гледзячы на розныя матар'яльныя перашкоды, усе пытаньні, у сувязі з арганізацыяй Ун-ту былі вырашаны, і Урад БССР знайшоў магчымым фармальна прыступіць да арганізацыі Ун-ту.

11-га ліпеня 1921 году, у дзень вызваленьня гораду Менску ад палякаў, адбылося ўрачыстае пасяджэньне, на якім прысутнічалі ўрад БССР і прадстаўнікі партыйных і прафэсыйных арганізацый. На гэтым пасяджэньні быў агалошаны дэкрэт Ураду аб адчыненьні Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, а таксама быў агалошаны склад Праўленьня Ун-ту, з рэктарам У. І. ПІЧЭТА, які быў прызначаны Наркамасьветы БССР 10-га ліпеня 1921 году. Дзень 11-га ліпеня застанецца вельмі памятным у гісторыі нацыянальна-культурнага адраджэньня і ў гісторыі Савецкай улады на Беларусі, якая знайшла мажлівым палажыць пачатак вышэйшай школе на Беларусі. На ўрачыстым пасяджэньні прадстаўніком Беларускага ўраду, А. Г. ЧАРВЯКОВЫМ, адказным сэкратаром Цэнтральнага Бюро КП(б)Б. т. В. Г. КНОРЫНЫМ, а таксама Нар. Камісарам Асьветы, У. М. ІГНАТОЎСКІМ, і цэлым шэрагам партыйных і прафэсыйных прадстаўнікоў былі выражаны пажаданьні, каб Б.Дз.У. стаў сапраўдным цэнтрам навуковай марксыцкай думкі і месцам, дзе-б працоўныя масы маглі атрымаць сваю вышэйшую адукацыю.

30-га кастрычніка 1921 году адбылося фактычнае адчыненьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. На ўрачыстым пасяджэньні прысутнічалі прадстаўнікі беларускага ўраду, на чале з А. Г. Чарвяковым, а таксама і прадстаўнікі прафэсыйных, партыйных і грамадзкіх арганізацый. З 1-га лістападу 1921 году пачаліся заняткі на ўсіх факультэтах. Да гэтага моманту ўдалося запрасіць цэлы шэраг выдатных навуковых працаўнікоў, а таксама і падрыхтаваць будынкі і памяшканьні для навучальных заняткаў.

Б. Д. У. быў заснаваны ў вельмі цяжкіх абставінах, калі гаспадарка Беларусі была зьнішчана, а краіна наогул была зруйнавана. Аднак, ня гледзячы на ўсе гэтыя перашкоды, Б. Д. У. да моманту свайго адчыненьня меў усё неабходнае для навучальных заняткаў. У першы год існаваньня Ун-ту здарыўся вялікі голад на Паволжжы, што таксама аказала вядомы ўплыў на арганізацыйную працу па будаваньню Ун-ту. Ун-т адчуваў адсутнасьць неабходных сродкаў, што затрымлівала ўзрост навучальнага абсталяваньня. Першыя два гады існаваньня Ун-ту былі асабліва цяжкімі. Пачынаючы з 3-га году, калі Ун-т ужо меў неабходны сталы бюджэт, матар'яльнае становішча Ун-ту палепшылася, а ў сувязі з гэтым значна павялічылася і навуковае абсталяваньне Б. Д. У.

## 2. Арганізацыя Кіраўніцтва Унівэрсытэтам.

У момант адчыненьня Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту ў аснову яго кіраўніцтва былі пакладзены Унівэрсытэцкі статут, які быў прадметам абгаварэньня ў Маскве, на сходзе прадстаўнікоў розных навучальных устаноў. У гэтым статуце былі толькі намечаны агульныя прынцыпы, і Б. Д. У. прыходзілася ўносіць свае

папраўкі, прымаючы пад увагу мясцовыя ўмовы. 18-га кастрычніка 1921 году было апублікавана палажэньне аб вышэйшых навучальных установах. Апошняе было ўведзена ў жыцьцё Б. Д. У.

Новы ўнівэрсытэцкі статут утвараў новыя формы жыцьця, якія былі невядомы ў старых унівэрсытэтах. Студэнцтва Ун-ту павінна было прымаць значны ўдзел у справах Ун-ту. Унівэрсытэцкія арганізацыі складаюць неабходную частку ўнівэрсытэцкага жыцьця. Новы ўнівэрсытэцкі статут скасаваў старыя факультэцкія і ўнівэрсытэцкія саветы, і цэнтр унівэрсытэцкага жыцьця перанёс у прадметныя Камісіі, у якіх прымалі ўдзел ня толькі навуковыя працаўнікі, а таксама прадстаўнікі студэнцтва ў вядомай прапорцыі.

Лік Прадметных Камісій устанаўліваўся Праўленьнем Ун-ту; паседжаньні Прадметных Камісій маглі быць таксама аб'яднанымі, на якіх разглядаліся розныя пытаньні, якія датычыліся ўсяго унівэрсытэцкага выкладаньня. Новы унівэрсытэцкі статут будаваўся на прынцыпах цэнтралізацыі і індывідуальнай адказнасьці перад урадам за ўсё тое, што адбываецца ва Ун-це. Дэканы факультэтаў таксама зьяўляліся адказнымі перад Праўленьнем Ун-ту за ўсё тое, што адбывалася ва Ун-це. Новы унівэрсытэцкі статут уводзіў Саветы Факультэтаў і Саветы Ун-ту. Аднак, гэтыя ўстановы былі іншымі па складу ў параўнаньні з унівэрсытэтамі дарэвалюцыйных часоў. У Савет факультэту ўваходзілі Старшыні прадметных камісій, прадстаўнікі ад выкладчыкаў і навуковых супрацаўнікоў, прадстаўнікі ад студэнцтва, а таксама прадстаўнікі ад тых прафэсыйных арганізацый, якія найбольш былі зацікаўлены ў жыцьці факультэту. Што датычыцца да складу Савету, то ў склад яго ўваходзіла Праўленьне Ун-ту, прадстаўнікі між саюзных прафэсыйных аб'яднаньняў, прадстаўнікі зацікаўленых наркаматаў альбо іншых установаў, 5 прадстаўнікоў ад прафэсароў, 5 ад навуковых супрацоўнікаў і 5 ад студэнтаў. Дэканы факультэтаў таксама уваходзілі ў склад Саветаў.

Удзел прафэсыйных арганізацый і ўрадавых установаў у Савеце Факультэтаў Ун-ту меў сваёй мэтай зьвязаць Ун-т, як вышэйшую навучальную ўстанову, з прафэсыйнымі і ўрадавымі арганізацыямі, каб даць мажлівасьць апошнім арганізацыям прыняць значны ўдзел у працы вышэйшай установы.

Рабочы факультэт заняў асаблівае месца. У яго арганізацыю былі накладзены прынцыпы арганізацыі рабочых факультэтаў РСФСР. Рабочы факультэт з першага моманту складаў састаўную частку Ун-ту наогул, і на гэтым груньце ня было ні якіх непаразуменьняў. Прадметныя Камісіі, Саветы факультэтаў і Савет Ун-ту, разглядалі ўсе пытаньні, якія датычыліся жыцьця Ун-ту. Свае думкі Прадметныя Камісіі прадстаўлялі на разгледжаньне Дэканату; думкі Савету Факультэтаў прадстаўляліся на зацьверджаньне Праўленьня Ун-ту і пастановы Савету Ун-ту—на зацьверджаньне органаў Наркамасьветы.

Новы унівэрсытэцкі статут быў уведзены ў жыцьцё, але досыць хутка ён паказаў сваю нямэтазгоднасьць. Жыцьцё паказала, што унівэрсытэцкія саветы не зьяўляюцца жывымі арганізацыямі. Поўная мажлівасьць даводзіць да ведама ўраду і Наркамасьветы аб патрэбах Ун-ту рабіла лішнімі унівэрсытэцкія саветы, і ўдзел у іх прадстаўнікоў Ураду, Наркамасьветы і прадстаўнікоў прафэсыйных арганізацый. Дзякуючы гэтаму, Унівэрсытэцкія Саветы фактычна спынілі сваё існаваньне. З другога боку і Саветы факультэтаў таксама паказалі сябе, як вельмі добрыя арганізацыі. Для Наркамасьветы БССР была яснай неабходнасьць, каб у справах агульна уні-

вэрсытэцкага жыцьця прымалі ўдзел усе працаўнікі факультэту. Для гэтай мэты былі арганізаваны аб'яднаныя пасяджэньні ўсіх Прадметных Камісій, з удзелам студэнцтва ў ліку 50 проц. агульнай колькасьці навуковых працаўнікоў. Акрамя гэтага, Наркамасьветы БССР лічыў неабходным прадаставіць Прадметным Камісіям мэтадычную працу, абгаварэньне розных пытаньняў, у сувязі з арганізацыяй кафэдры і пастаноўкай выкладаньня, папаўненьне навукова-навучальным інвэнтаром і г. д. Пытаньні аб запрашэньні новых выкладчыкаў былі перададзены з Прадметных Камісій непасрэдна ў Дэканаты, якія даручалі спэцыялістым складаць навуковыя водзывы аб запрошаных кандыдатах і, на падставе апошніх, рабіў сваё заключэньне, якое потым паступала на зацьверджаньне Праўленьня Ун-ту і Наркамасьветы БССР.

Статут аб навуковых працаўніках, апублікаваны ўрадам БССР ад 8 чэрвеня 1927 году, уносіў парадак ў справу запрашэньня выкладчыкаў, і, такім чынам, ўтвараў сталыя нормы, з якімі патрэбна было лічыцца пры запрашэньні розных навуковых працаўнікоў на кафэдры, а таксама прызначэньне таму альбо іншаму навуковаму працаўніку стану: асьпіранта, асыстэнта, дацэнта і прафэсара. Той-жа самы статут утвараў навуковую ступень доктара адпаведнай навукі пасьля абароны дысэртацыі ў адпаведных навуковых установах. Пратакол, які прызначаў навуковую ступень, быў павінен паступіць на зацьверджаньне Праўленьня і потым Наркамасьветы БССР.

Згодна ўнівэрсытэцкага статуту, Рэктар Ун-ту і сябры Праўленьня зацьверджваліся Наркамасьветы БССР, з ліку кандыдатаў, якія былі прадстаўлены навуковымі працаўнікамі, студэнцтвам, партыйнымі і прафэсыйнымі арганізацыямі і урадавымі ўстановамі. Аднак, такі парадак існаваў у працягу толькі 3-х год. Жыцьцё паказала, што гэта арганізацыя зьяўляецца вельмі складанай, і з прычыны гэтага, згодна дазволу Наркамасьветы БССР, кандыдаты на пасаду Рэктара і сяброў Праўленьня намячаліся 2-ма арганізацыямі: навуковымі працаўнікамі і студэнцкімі арганізацыямі. Кандыдаты, вызначаныя абодвымі арганізацыямі, прадстаўляліся на зацьверджаньне Наркамасьветы. Сучаснае ўнівэрсытэцкае жыцьцё паказала неабходнасьць сталага ўнівэрсытэцкага статуту. Па даручэньню Наркамасьветы, апошні быў складзены Праўленьнем Ун-ту і прадстаўлены ў Наркамасьветы для далейшага разгледжаньня.

З пачатку арганізацыі Унівэрсытэту, агульнае кіраўніцтва, дзейнасьцю апошняга знаходзілася пад уплывам Галоўпрафасьветы РСФСР. Наркамасьветы БССР пакінуў за сабою кантроль над ажыцьцяўленьнем тых пастаноў, якія рабіліся адносна вышэйшай школы Галоўпрафасьветай РСФСР. Такая залежнасьць была на працягу 2-х год. Калі жыцьцё на Беларусі больш менш упарадкавалася, дык, на аснове згоды Галоўпрафасьветы РСФСР, агульнае кіраўніцтва Ун-там перайшло да Наркамасьветы БССР. Ужо з заснаваньня БДУ, пры Наркамасьвеце БССР быў арганізаваны Аддзел ВНУ, які ведаў вышэйшымі навучальнымі ўстановамі на БССР, ў тым ліку і Унівэрсытэтам. З перадачай Унівэрсытэту ў веданьне Галоўпрафасьветы, зьявілася неабходнасьць рэарганізацыі гэтага аддзелу і арганізацыі асобнага Савету, па справах вышэйшых навучальных устаноў і навуковых устаноў. 25 ліпеня 1924 году, Савет Народных Камісараў БССР апублікаваў статут Савету па справах Вышэйшых Навучальных Устаноў, у склад якога ўваходзілі, акрамя Галоўпрафасьветы прадстаўнікі ВНУ, пралетарскага студэнцтва, навуковых працаўні-

коў, прадстаўнік Наркамзему, прадстаўнікі ЦК КП(б)Б і ЛКМСБ. Гэты Савет пераглядаў усе тыя пытаньні, якія знаходзіліся ў сувязі з агульна ўнівэрсытэцкім жыцьцём. На пасяджэньні Савету была высунута думка аб складзе статуту вышэйшых навучальных установ. Для гэтай мэты была абрана асобная камісія, якая намеціла агульныя прынцыпы статуту, а таксама распрацавала і палажэньне аб навуковых працаўніках.

Савет па справах ВНУ ня доўга існаваў, дзякуючы таму, што Галоўпрафасьветы меў мажлівасьць прымаць непасрэдны ўдзел ў агульным кіраўніцтве Ун-ту, самы Савет зьявіўся лішнім. Замест Савету Галоўпрафасьветы ў сьнежані 1926 году арганізаваў Рэктарскую Нараду, з удзелам у апошняй і загадчыка навучальнай часткай. Гэта нарада разгледзіла цэлы шэраг пытаньняў, якія датычыліся навучальнага жыцьця вышэйшых навучальных установ і былі павінны ўсю ўнівэрсытэцкую справу паставіць на сталы грунт.

### 3. Урачыстыя пасяджэньні ўнівэрсытэту.

У працягу ўсяго свайго існаваньня Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт арганізаваў урачыстыя пасяджэньні, якія былі прысьвечаны розным здарэньням, як унівэрсытэцкім, палітычным, грамадзкім, гістарычным. 30-га кастрычніка 1921 году быў арганізаваны першы ўрачысты сход з прычыны пачатку фактычных заняткаў ва ўнівэрсытэце. На гэтым пасяджэньні былі дакладзены дзьве актавых прамовы —праф. М. Б. КРОЛЯ „Мышление и речь“ і праф. И. М. САЛАЎЁВА „Школа и задачи научной педагогики“.

7-га лістапада быў арганізаваны сход, прысьвечаны Кастрычнікавай Рэвалюцыі з адпаведнымі дакладамі. У працягу году былі аргаізаваны 2 ўрачыстых пасяджэньні, прысьвечаныя беларускім пісьменьнікам, Якубу Коласу і Янку Купалу. Акрамя гэтага, Унівэрсытэт арганізаваў урачыстае пасяджэньне памяці Дастаеўскага і Некрасава паводле іх юбілейных дат.

12-га сакавіка 1922 г. адбылося ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае 5-годзьдзю заняпаду царызму. На гэтым пасяджэньні былі зроблены адпаведныя даклады.

20-га лютага 1922 году адбылося пасяджэньне—дыскусія па пытаньню аб зьмене Вех.

Акрамя гэтага ў працягу 1921-22 г. цэлым шэрагам выкладчыкаў былі прачытаны публічныя лекцыі, прыбыткі з якіх паступалі ў камісію па арганізацыі дапамогі галоднаму Паваложжу.

30-га кастрычніка 1922 г. адбылося ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае гадавіне адчыненьня Ун-ту. На гэтым пасяджэньні былі зроблены дзьве акадэмічных прамовы, праф БЭРКЕНГЕЙМ на тэму: „Сучаснае становішча аб хэмічным элемэнце“ і праф. Н. М. НІКОЛЬСКАГА на тэму: „Религия, как предмет науки“.

У працягу другога году існаваньня Унівэрсытэту быў арганізаваны цэлы шэраг пасяджэньняў:

1. Памяці Шарля Фур'е, прысьвечанае 150--ай гадавіне дню нараджэньня.
2. Памяці Люі Пастэра.
3. 12-га сакавіка было арганізавана пасяджэньне, прысьвечанае Лютаўскай Рэвалюцыі.
4. Парыская Камуна выклікала асобнае пасяджэньне.
5. Было арганізавана пасяджэньне, прысьвечанае Капэрніку на выпадку 450-годзьдзя са дню яго нараджэньня.

6. Было арганізавана пасяджэньне, прысьвечанае 1-му мая.

30-га кастрычніка 1923 г. адбылося два гады са дню заснаваньня Унівэрсытэту. На адбыўшымся ўрачыстым акце былі дакладзены дзьве актавых прамовы — С. МЕЛКІХ, на тэму: „О роли клиник и медицинского образования“ и С. З. КАЦЭНБОГЕНА на тэму: „О спорных вопросах генеономии“.

3-я гадавіна існаваньня Унівэрсытэту сьвяткавалася ўрачыстым актам з актавымі прамовамі: праф. М. Н. ПІАТУХОВІЧА на тэму: „Францыск Багушэвіч як ідэолёг беларускага адраджэньня і як мастак“ і праф. С. Я. ВАЛЬФСОН - „Да пытаньня аб поглядах марксызму на дзяржаву“. У працягу 3-га году жыцьця Унівэрсытэту былі арганізаваны публічныя пасяджэньні, прысьвечаныя асабліва гісторыка-палітычным датам і ў першую чаргу Кастрычнікавай Рэвалюцыі, Лютаўскай Рэвалюцыі, Парыскай Камуне і 1-му мая.

4-ая гадавіна таксама сьвяткавалася ўрачыстым актам, які адбыўся 2-га лістапада, дзякуючы таму, што ў гэты момант адбывалася сэсія ЦВК БССР у Віцебску, і ўрад БССР ня меў мажлівасьці прыняць непасрэдны ўдзел у паседжаньні. Урачыстае паседжаньне саўпала з сьмерцьцю Старшыні Рэваенсавету, т. Ф р у н з э, памяць якога была ўшанавана ўставаньнем. На ўрачыстым пасяджэньні актавая прамова была зроблена праф. па кафэдры фізыкі, Е.Е. С і р о ц і н ы м. БДУ і на 4-ты год свайго існаваньня застаўся верным сваім традыцыям і імкнуўся арганізаваць публічныя пасяджэньні,але адсутнасьць актавай залі не давала мажлівасьці разгортваць сваю працу вельмі шырока. Затое на 5-ым годзе існаваньня Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт атрымаў мажлівасьць арганізаваць цэлы шэраг урачыстых пасяджэньняў. Так, было арганізавана пасяджэньне, прысьвечанае Янку Купалу, па выпадку 20-годзьдзя яго літаратурнай дзейнасьці. Кастрычнікавая Рэвалюцыя таксама была прычынай арганізацыі ўрачыстых пасяджэньняў. 400-годзьдзе беларускай кнігі сьвяткавалася ўрачыстым пасяджэньнем. Былі таксама арганізаваны пасяджэньні, прысьвечаныя Лютаўскай Рэвалюцыі, Парыскай Камуне і 2-ой гадавіне сьмерці Леніна. 30-га кастрычніка 1926 году споўнілася 5-год з моманту заснаваньня Унівэрсытэту, 5-га сьнежня 1926 г. адбылося ўрачыстае пасяджэньне, пад старшынствам Народнага Камісара Асьветы т. Б а л і ц к а г а. Па выпадку юбілею Савет Народных Камісараў і Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР апублікавалі грамату на імя Унівэрсытэту, у якой былі адзначаны дасягненьні Унівэрсытэту на працягу 5-ці год і ацэнена праца прафэсароў выкладчыкаў Унівэрсытэту па будаўніцтву Ун-ту. На ўсіх урачыстых пасяджэньнях па выпадку сьвяткаваньня гадавін Ун-ту прысутнічалі прадстаўнікі ЦВК, Савету Народных Камісараў і ЦК КП(б)Б, а таксама прадстаўнікі іншых прафэсыйных і партыйных арганізацый. Прадстаўнікі ўраду, партыі і прафэсыйных арганізацый, пасьля сканчэньня ўрачыстага пасяджэньня, прыносілі Ун-ту прывітаньні, у якіх адзначалі дасягненьні Ун-ту за мінулы год.

30-га кастрычніка 1927 году Унівэрсытэт сьвяткаваў 6-ую гадавіну існаваньня Ун-ту, якой Рэктар Ун-ту У. І. П і ч э т а, зрабіў справаздачу аб дзейнасьці Ун-ту за мінулы год.

І на шосты год існаваньня Ун-ту ўрачыстыя пасяджэньні адбываліся па розных прычынах, на якіх чыталіся адпаведныя даклады. Акрамя ўрачыстых пасяджэньняў, прысьвечаных рэвалюцыйным датам, БДУ, арганізаваў пасяджэньне памяці венскага вучонага Камэрэра, які скончыў жыцьцё самагубствам, Памяці Бакуніна, а таксама іншым гістарычным датам. Трэба яшчэ адзначыць, што ў

дні сьвяткаваньня гадавін Ун-ту ў мясцовай прэсе „Зьвяздзе" і „Савецкай Беларусі" былі надрукаваны артыкулы рэктара і выкладчыкаў Ун-ту, а таксама прадстаўнікоў прафэсыйных і партыйных арганізацый па выпадку юбілею Ун-ту і беларускага ўраду, у якіх разглядаліся розныя бакі ўнівэрсытэцкага жыцьця і падкрэсьліваліся вынікі яго працы.

### IV. Савет Унівэрсытэту і агульна-прафэсарскія сходы.

З моманту заснаваньня Унівэрсытэту і ўтварэньня сталай групы выкладчыкаў, Праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту так павяло сваю працу, каб яна знаходзілася ў сталай сувязі з выкладчыкамі Ун-ту, без дапамогі якіх ніякая арганізацыйная праца была немагчыма.

Апублікаваньне статуту аб ВНУ дала мажлівасьць гэтым сходам выкладчыкаў прыдаць некалькі іншы характар. На апошніх прымалі ўдзел прадстаўнікі прафэсыйных, партыйных і грамадзкіх арганізацый, што, бязумоўна, мела вялікі ўплыў на агульны ход будаваньня БДУ. На гэтых сходах рэктар Унівэрсытэту выступаў з дакладамі, у якіх ён знаёміў усіх прысутных, як з працай Б. Д. У., так і з тымі недахопамі, якія намячаліся ў гэтай працы, дзякуючы адсутнасьці сталых матар'яльных сродкаў. Трэба сказаць, што такія сходы мелі вялікае значэньне ў жыцьці Б. Д. У., з прычыны таго, шта яны падтрымлівалі сувязь з адпаведнымі арганізацыямі, якія былі зацікаўлены ў жыцьці Ун-ту, і якія мелі мажлівасьць сваім саветам і садзейнічаньнем прысьці на дапамогу Ун-ту. Гэтыя Саветы мелі яшчэ тым асаблівае значэньне, што ў першыя гады існаваньня Б. Д. У.—апошні знаходзіўся пад кіраўніцтвам Галоўпрафасьветы РСФСР. Акрамя гэтага, думкі такіх Саветаў прадстаўляліся на разгледжаньне Старшыні ЦВК і СНК БССР, і гэта мела вялікае значэньне, з прычыны таго, што адпаведныя ўрадавыя органы разглядзелі пастаўленыя пытаньні і, па мажлівасьці, іх вырашалі з боку матар'яльнага. Бяз гэткіх Саветаў і сталай сувязі з адпаведнымі арганізацыямі, Унівэрсытэт ня мог-бы так хутка ўзмацніцца, як ён узмацніўся.

На трэці год існаваньня Б.Д.У.—унівэрсытэцкія Саветы, у тым ліку, як яны былі прадугледжаны Статутам ВНУ спыніліся. Б. Д. У. знаходзіўся ў сталай сувязі з адпаведнымі органамі, як вышэйшымі, таксама з Наркамасьветы, і гэтыя Саветы згубілі сваё значэньне. Аднак, каб мець сталую сувязь з выкладчыкамі Ун-ту, зьбіраліся агульныя сходы Прадметных Камісій, на якіх рэктарам, Праўленьнем Ун-ту і Дэканамі факультэтаў рабіліся справаздачы, ставіліся на разгледжаньне розныя акадэмічныя і фінансавыя пытаньні. Такія сходы таксама мелі вялікае значэньне. З дапамогаю прафэсароў Ун-ту, можна было будаваць Беларускі Унівэрсытэт з большым посьпехам і з больш значнымі вынікамі, ня гледзячы на матар'яльныя недахопы. Энэргія Загадчыкаў кафэдраў таксама садзейнічала будаваньню Ун-ту.

На унівэрсытэцкіх Саветах, а таксама на агульных сходах Прадметных Камісій абмяркоўваліся пытаньні і іншага характару. Ун-т лічыў неабходным выразіць сваю думку па цэламу шэрагу пытаньняў. Так, Унівэрсытэцкі Савет вынес рэзолюцыю адносна заявы польскай дэлегацыі па рэалізацыі Рыскага міру, адносна архіваў, якія зьяўляюцца беларускімі па свайму паходжаньню. Унівэрсытэцкі Савет прызнаў неабходным выдачу палякам архіву нацыя-

нальнага значэньня, адnак падкрэсьліўшы, што архівы, як Літоўская Мэтрыка, якая мае галоўнае значэньне для гісторыі Беларусі, павінны застацца ў СССР. Вядомы ўльтыматум Ангельшчыны, прад'яўлены Кэрзонам, забойства Вароўскага ўсхвалялі прадстаўнікоў Ун-ту. На агульным прафэсарскім сходзе быў прыняты зварот да вучоных Захаду, у якім прафэсары Б. Д. У. лічылі сваім абавязкам падкрэсьліць мірную культурную справу ўраду СССР і выразілі свой пратэст з прычыны агрэсыўнай палітыкі Ангельшчыны, якая павінна згубіць канчаткова ўсе вынікі мірнай працы і паставіць краіну ў такія ўмовы, пры якіх ні якая культурная праца не зьяўляецца магчымай.

У жыцьці Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту адбываўся яшчэ адзін від агульна-унівэрсытэцкіх сходаў, на якіх прысутнічаў выключна настаўніцкі пэрсанал. Такія агульныя сходы зьбіраліся ў той час, калі было неабходна намеціць кандыдатаў на пасаду рэктара, з прычыны таго, што, згодна унівэрсытэцкага Статуту, прафэсарская курыя мела права намячаць гэткіх кандыдатаў.

Акрамя прафэсарскага пэрсаналу, кандыдатаў на пасаду сяброў Праўленьня, намячалі студэнцкія арганізацыі, партыйныя і прафэсыйныя арганізацыі. Усе гэтыя кандыдаты паступалі на зацьверджаньне адпаведных урадавых органаў.

Першы склад Праўленьня быў зацьверджаны 11-га ліпеня 1921 г. ў складзе рэктара, У. І. ПІЧЭТА, сяброў Праўленьня: У. М. ІГНАТОЎСКАГА, В. Ф. ТУРУКА, М. Я. ФРУМКІНАЙ, прадстаўніка ад студэнтаў Рабочага ф-ту. У гэткім складзе Праўленьне Б. Д. У. працавала да сьнежня 1922 году, калі адбыліся перавыбары, згодна якім рэктарам Ун-ту быў абраны праф. ПІЧЭТА, Намесьнікамі Рэктара праф. С. З. КАЦЭНБОГЕН І. У. ІВАНОЎСКІ, настаўнік Рабочага факультэту КОРСАК і студэнт Мэдыцынскага ф-ту т. БАРКУСЕВІЧ. У працягу году сябар Праўленьня КОРСАК адмовіўся ад сваіх абавязкаў сябра Праўленьня і на агульным сходзе аднагалосна быў абраны выкладчык Рабочага ф-ту, І. В. ГЕРЧЫКАЎ. Гэты склад Праўленьня існаваў да сакавіка 1923 году, калі адбыліся перавыбары. На падставе апошніх склад Праўленьня быў наступны: рэктар, У. І. ПІЧЭТА, члены Праўленьня: С. З. КАЦЕНБОГЕН і У. Н. ІВАНОВСКІ—яны-ж намесьнікі Рэктара, і С. І. БАРКУСЕВІЧ, а таксама І. В. ГЕРЧЫКАЎ.

У сакавіку 1924 году адбыліся перавыбары Праўленьня. Склад Праўленьня быў наступны: Рэктар, У. І. ПІЧЭТА, Нам. Рэктара—С. З. КАЦЭНБОГЕН, сябры Праўленьня—ад студэнтаў—т. ГАРБУЗ, настаўнік Рабфаку, І. В. ГЕРЧЫКАЎ і прадстаўнік партыйных арганізацый—т. ДЗЯКОЎ. Праз год адбыліся новыя выбары Праўленьня, у чэрвені месяцы 1925 году. Гэтыя выбары далі наступныя вынікі: Рэктарам быў абраны У. І. ПІЧЭТА, намесьнікам па акадэмічнай частцы – С. З. КАЦЭНБОГЕН і па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы—дэкан Рабфаку, С. З. СЛОНІМ. Акрамя гэтага сябрамі Праўленьня былі абраны: праф. А. С. ШЧАПОЦЬЦЕЎ і прадстаўнік студэнцтва-студэнт І. А. ЛАПОТКА.

13 чэрвеня 1926 году адбыліся новыя перавыбары. Агульным сходам быў абраны ў якасьці Рэктара, У. І. ПІЧЭТА, Намесьнікам рэктара—С. З. СЛОНІМ, Загадчыкам Вучэбнай часткі—праф. М. КРОЛЬ, які да гэтага моманту займаў пасаду дэкана Мэдыцынскага факультэту. Акрамя гэтага ў склад Праўленьня ўвайшлі: дацэнт В. Д. ДРУШЧЫЦ і прадстаўнік студэнцтва—І. А. ЛАПОТКА. Упаўнаважаньні гэтага складу Праўленьня скончыліся ў чэрвені 1927 г.

Аднак, Праўленьне прызнала, што чэрвень м—ц зьяўляецца непадабаючым для выбараў і пастанавіла хадайнічаць перад Галоўпрафасьветы БССР аб адтэрмінаваньні перавыбараў да пачатку новага навучальнага году з тым, каб гэтыя выбары ўзгадніць з агульнай канфэрэнцыяй прафэсыйных студэнцкіх арганізацый. Галоўпрафасьветы дала на гэта сваю згоду.

Улетку, 1927 году было пастаулена пытаньне аб скарачэньні складу Праўленьня, у мэтах рацыяналізацыі працы сяброў Праўленьня Унівэрсытэту. Галоўпрафасьветы, на падставе думак Праўленьня, вырашыла, што Праўленьне Ун-ту павінна складацца з 3-х асоб: рэктара, намесьніка рэктара і прадстаўніка ад студэнцтва.

У пачатку кастрычніка 1927 году адбыліся перавыбары Праўленьня, якія далі гэткія вынікі: рэктарам быў абраны У. І. ПІЧЭТА, намесьнікам рэктара, С. З. СЛОНІМ і прадстаўніком ад студэнцтва— т. КЛЫС. На абавязках рэктара ляжала агульнае кіраўніцтва ўнівэрсытэцкім жыцьцём, а таксама загадваньне навучальнай часткаю. На абавязках намесьніка рэктара—агульнае кіраўніцтва адміністрацыйна-гаспадарчай дзейнасьцю. Агульнастудэнцкія справы, пытаньні аб стыпэндыях і аб аплаце за навучаньне ва Унівэрсытэце складалі абавязкі сябра Праўленьня, прадстаўніка ад студэнтаў. Гэтыя пытаньні папярэдне, разглядаліся асобнымі камісіямі, вынікі працы якіх канчаткова зацьвярджаліся Праўленьнем Ун-ту. Адначасна кандыдатаў на пасаду рэктара і сяброў Праўленьня прадстаўляла і студэнцтва, а таксама ў першыя тры гады—прафэсыйныя і партыйныя арганізацыі. На гэтым грунье між усімі арганізацыямі ня было ніякіх спрэчак. НКАсьветы, таксама з свойго боку, ня супярэчыў супроць намечаных кандыдатаў і зацьвярджаў пастановы Калегіі.

Дэканы факультэтаў з пачатку існаваньня Ун-ту ўваходзілі ў склад Праўленьня. Кожны Дэкан, па свайму факультэту меў рашучы голас, а па іншым пытаньнях распалагаў дарадчым голасам. З пачатку 1927/28 году ўсе дэканы ўваходзяць у склад Праўленьня з рашучым голасам па ўсіх пытаньнях. Акрамя гэтага, у працах Праўленьня Ун-ту прымаў удзел прадстаўнік ад Мясцкому і прадстаўнік Выканбюро Прафсэкцыі БДУ, таксама з дарадчым голасам па ўсіх пытаньнях. Пры разгледжаньні тых ці іншых навукова-навучальных пытаньняў запрашаліся на пасяджэньні Праўленьня Ун-ту тыя ці іншыя навуковыя працаўнікі, што давала Праўленьню Ун-ту поўную мажлівасць азнаёміцца з усімі пытаньнямі, якія ставіліся ўнівэрсытэцкім жыцьём з розных бакоў.

### 5. Дзейнасьць праўленьня.

Праўленьне Унівэрсытэту зьяўлялася тым органам, які даваў агульнае кіраўніцтва ўсяму ўнівэрсытэцкаму жыцьцю. Гэтым самым Праўленьне Унівэрсытэту трымала на сябе адказнасьць за ўсю справу ва Унівэрсытэце. Рэктар Унівэрсытэту, як кіраўнік агульна унівэрсытэцкага жыцьця, нёс пэрсанальную адказнасьць перад адпаведнымі ўрадавымі органамі за пастаноўку ўсяе навучальнае працы ва Унівэрсытэце і за ўсю арганізацыйную, адміністрацыйна гаспадарчую справу ва Ун-це.

Праўленьню Унівэрсытэту ў працягу першых трох год прыходзілася падтрымліваць самыя цесныя сувязі з СНК і ЦВК БССР. Рэктар Унівэрсытэту меў кожны тыдзень даклад у Старшыні ЦВК і СНК БССР, т. А. Г. ЧАРВЯКОВА, якога ён знаёміў з працай па арганізацыі Ун-ту ад якога ён атрымліваў адпаведныя ўказань-



Праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

ні. Гэта цесная сувязь з вышэйшымі ўрадавымі органамі працягнулася і ў наступныя гады, калі Рэктар Ун-ту рабіў пэрсанальна даклады перад Старшынёю СНК, т. АДАМОВІЧАМ і Старшынёю ЦВК, А. Г. ЧАРВЯКОВЫМ. У канцы сьнежня 1921 году Рэктар Ун-ту зрабіў даклад на зьезьдзе Саветаў на якім азнаёміў сяброў з гісторыяй ўтварэньня Ун-ту, а таксама адзначыў тыя перашкоды і тыя цяжкасьці, якія стаялі і будуць стаяць на шляхох яго будаўніцтва. Сябры Зьезду Саветаў з вялікай прыхільнасьцю аднесьліся да дакладу Рэктара. Гэты-ж зьезд Саветаў вынес адпаведную рэзалюцыю, якая мела вялікае значэньне для далейшага росту Ун-ту, і адначасна абрала Рэктара Ун-ту сябром ЦВК БССР. Гэтым абраньнем Зьезд Саветаў выявіў свае адносіны да Ун-ту, як Вышэйшай Навучальнай Установы на Беларусі. І ў далейшым у працягу 5 год Рэктар Ун-ту абіраўся сябром Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, а таксама быў сябром усіх Зьездаў Саветаў. Трэба сказаць, што абіральнікі гораду Менску, партыйныя і прафэсыйныя арганізацыі, прызнаючы заслугі прафэсароў БДзУ у справах будаўніцтва Ун-ту, абіралі цэлы шэраг прафэсараў сябрамі Зьезду Саветаў. Апошні Зьезд Саветаў, які адбыўся вясною 1927 году, абраў сябрамі ЦВК—Намесьніка Рэктара С. З. СЛОНІМА і праф. С. Я. ВАЛЬФСОНА—кандыдатам у лік сяброў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту.

Рэктар Ун-ту выступаў на Зьездзе Саветаў, які адбыўся ў сьнежні 1922 году. Пасьля дакладу Нар. Кам. Асьветы, т. ІГНАТОЎСКАГА, ім быў зроблены даклад, у якім ён азнаёміў сяброў Зьезду Саветаў з агульнай працай Унівэрсытэту ў працягу аднаго году. Прысутнічаючы на Зьездах, Рэктар Ун-ту прыносіў Зьезду Саветаў прывітаньні ад імя Ун-ту і даводзіў да ведама Зьезду Саветаў аб бязупынным жаданьні прафэсароў і выкладчыкаў БДзУ прымаць шчыры ўдзел у справах сацыялістычнага будаўніцтва.

На 3-яй сэсіі ЦВК Саветаў БССР, у чэрвені 1925 году, Рэктар Ун-ту зрабіў даклад аб дзейнасьці Ун-ту і яго матар'яльным становішчы. Рэктарам было даложана аб неабходнасьці вышуканьня матар'яльных сродкаў для навуковага абсталяваньня Ун-ту. Сябры сэсіі ЦВК аднесьліся вельмі ўважліва да дакладу Рэктара і выразілі свае адносіны ў адпаведнай рэзалюцыі, якая зьяўляецца эпохільнай у арганізацыйнай працы Ун-ту. ЦВК даручыў усім урадавым органам з асаблівай уважлівасьцю адносіцца да справы Ун-ту і прыняць мерапрыемствы да таго, каб Ун-т быў забясьпечаны, як сродкамі, таксама і памяшканьнем у якім адчувалася вялікая патрэба. 25-га жніўня 1922 году Рэктарам Ун-ту быў зроблены даклад на пасяджэньні Савету Народных Камісараў БССР, у якім намячаліся неабходныя мерапрыемствы для яго росту. Напярэдадні сьвяткаваньня 5-й гадавіны існаваньня Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту, Рэктар Ун-ту зрабіў даклад аб становішчы БДзУ ў працягу 5 год. Савет Народных Камісараў у сваей рэзалюцыі адзначыў значныя дасягненьні БДзУ, які ўзрос у вялікую Вышэйшую Навучальную ўстанову, а таксама адзначыў і працу прафэсараў БДзУ па арганізацыі Ун ту. Акрамя гэтага, СНК апублікаваў для Ун-ту грамату, з прычыны яго юбілею, у якой таксама адзначыў тыя дасягненьні, якія былі зроблены Унівэрсытэтам у працягу 5 год, а таксама адзначыў тую культурную ролю, якую меў БДзУ у справах культурнага адраджэньня Беларусі. Акрамя гэтага, Рэктарам Ун-ту было зроблена некалькі дакладаў у Прэзыдыуме ЦВК.

БДУ з моманту свайго заснаваньня адчуваў неабходнасьць у памяшканьнях. Сэсія ЦВК у красавіку 1921 году вынясла рэзалюцыю,

згодна якой Ун-ту быў прадастаўлены цэлы шэраг памяшканьняў, якія трэба было адрэмантаваць з тым, каб у іх можна было весьці заняткі. Гэтыя унівэрсытэцкія будынкі былі раскіданы па ўсяму гораду, што, ў вядомай меры, было павінна мець уплыў на расклад заняткаў ва Ун-це. Студэнтам прыходзілася хадзіць з аднаго будынку ў другі, што аднімала ў іх шмат часу. Калі Інстытут Сельскай і Лясной Гаспадаркі, які быў адчынены 7-га кастрычніка 1922 году, быў зьліты з Інстытутам Сельскай Гаспадаркі ў Горках і рэфармаваны ў Сельска-Гаспадрчую Акадэмію імя Кастрычнікавай Рэвалюцыі, дык Унівэрсытэт узбудзіў хадайніцтва перад Старшынёю СНК БССР Я. Адамовічам, аб перадачы Унівэрсытэту ўсіх будынкаў, у тым ліку і Газавага заводу, якія належалі да рэфарміраванага Інстытуту, з прычыны таго, што Акадэмія была адчынена ў Горках. Старшыня, СНК Я. Адамовіч, вельмі ўважліва аднёсься да хадайніцтва ун-ту і ўсе будынкі былі яму прадастаўлены. Гэта дало мажлівасьць у вядомай меры сканцэнтраваць заняткі ва Ун-це ў адным месцы. Але ўсё-ж такі гэтым самым справа з будынкамі ня была вырашана. Будынкі былі раскіданы і студэнтам прыходзілася хадзіць з аднаго месца ў другое. Вось чаму НКАсьветы БССР падняў пытаньне перед СНК БССР аб пабудове унівэрсытэцкага гарадку ў працягу наступных год. СНК і ЦВК БССР прызналі неабходным пабудову унівэрсытэцкага гарадку. Былі адпушчаны неабходныя сродкі на аб'яву конкурсу. Гэты конкурс даў значныя вынікі, і праэкт унівэрсытэцкага будынку, які адтрымаў прэмію, быў прыняты, распрацаваны для далейшай рэалізацыі. Унівэрсытэцкае будаўніцтва будзе пачата з наступнага году, у першую чаргу будзе пабудаваны Галоўны Корпус, а таксама Анатамічны Інстытут.

Арганізацыя ў Менску Сельска-Гаспадарчага Дасьледчага Інстытуту імя Леніна дала мажлівасьць сканцэнтраваць усе унівэрсытэцкія будынкі ў адным месцы. Згодна пастановы СНК БССР, Ун-т перадаў нанова утворанаму інстытуту свой будынак на Шырокай вуліцы, дзе была толькі пакінута лябараторыя неарганічнай хіміі. Іншыя навуковыя ўстановы былі пераведзены ў памяшканьне каля Ун-ту, і такім чынам была праведзена канцэнтрацыя памяшканьняў. Ун-т, хадайнічаючы перад СНК аб новых памяшканьнях, адначасна меў на ўвазе частку памяшканьняў перабудаваць для студэнцкага інтэрнату і, тым самым, палепшыць становішча студэнцтва ў кватэрнай справе, хаця-б для часткі студэнтаў-стыпэндыятаў. Савет Народных Камісараў таксама пайшоў насустрэч інтарэсам беларускага студэнцтва.

Недахопы ў матар'яльных сродках быў бязўмоўна вялікай перашкодай на шляхох будаўніцтва Ун-ту. На гэтаму пытаньню Праўленьне Ун-ту часта дакладвала ЦВК і СНК. Вышэй пералічаныя органы вельмі ўважліва адносіліся да просьбы Ун-ту, і ў той ці іншай меры яны былі здаволены, што давала мажлівасьць БзДУ будавацца і пашырацца.

БДЗУ спачатку,—упрацягу 2¹/₂ год, знаходзіўся ў загадваньні Галоў-прафасьветы РСФСР. Рэктар Ун-ту падтрымліваў цесную сувязь з Галоў-прафасьветы РСФСР і прымаў удзел у Рэктарскіх Нарадах, якія адбываліся ў Маскве. Адначасна Рэктар Ун-ту рабіў даклады Нар. Кам. Асьветы і Галоўпрафасьветы БССР і атрымліваў ад іх адпаведныя ўказаньні. Калі БССР эканамічна і палітычна замацавалася, дык Ун-т, на падставе рашэньня СНК, быў перададзены ў непасрэднае кіраўніцтва НКамАсьветы БССР. Галоўпрафасьветы БССР стаў тым органам, які даваў агульныя ўказаньні Праўленьню Ун-ту

і тым самым садзейнічаў яго разьвіцьцю. Даклады Рэктара і яго Намесьніка Галоўпрафасьветы, а таксама справаздачы Рэктара Калегіі НКАсьветы мелі вялікае значэньне, з прычыны таго, што ўказаньні Галоўпрафасьветы і рэзалюцыі Калегіі НКАсьветы давалі Праўленьню Ун-ту адпаведныя ўказаньні і, тым самым, правільным тэмпам і правільным шляхам будаваць Беларускі дзяржаўны унівэрсытэт.

Калі Б. Дз. У. у працягу 6 год так хутка ўзрос, дык гэта тлумачыцца тым, што Праўленьне Ун-ту заўсёды знаходзілася ў цеснай сувязі з вышэйшымі органамі беларускага ўраду, які заўсёды прыходзіў на дапамогу ў самыя цяжкія моманты ўнівэрсытэцкага жыцьця, калі адчуваліся недахопы, то ў тым, то ў іншым.

У сувязі з першым убуйненьнем Беларусі ў Менску адбыўся надзвычайны Зьезд Саветаў. Праўленьне Ўн-ту знаходзіла неабходным адзначыць гэты важны момант ў разьвіцьці БССР надзвычайным пасяджэньнем, прысьвечаным Зьезду Саветаў, сябры якога былі запрошаны на апошняе. Рэктар Ун-ту, прафэсары У. Н. Ігнатоўскі, С. З. Кацэнбоген, М. М. Піотуховіч, С. Я. Вольфсон, В. Д. Друшчыц І. А. Сербаў і І. А. Савіч, зрабілі на гэтым пасяджэньні, якое адбылося 17 лютага 1925 году, адпаведныя даклады. Сябры Зьезду Саветаў мелі мажлівасьць азнаёміцца з працай Ун-ту па вывучэньню мінулага і сучаснага на Беларусі.

Праўленьню Ўн-ту прыходзілася зьвярнуць шмат увагі на адчыненьне новых факультэтаў і рэфармаваньне ўжо тых, якія існавалі. Шмат працы і ўвагі патрабаваў Мэдыцынскі факультэт. Праўленьне Ўн-ту сумела, ня гледзячы на матар'яльныя недахопы, так арганізаваць габінэты і лябараторыі, што ў першыя гады ў лябараторыях мелася ўсё тое, што патрэбна для навучальных заняткаў студэнтаў, а потым зьявілася мажлівасьць весьці і навуковую працу ў лябараторыях. У канцы першага году Праўленьне Ун-ту пастанавіла адчыніць 3-ці курс Мэдыцынскага факультэту, прымаючы пад увагу тое, што ў Менску знаходзіўся цэлы шэраг студэнтаў Беларусі, якія па розных умовах ня мелі мажлівасьці прадаўжаць сваю адукацыю на Мэдыцынскім факультэце іншых Унівэрсытэтаў. Праўленьне Ўн-ту, прымаючы пастанову аб адчыненьні 3-га курсу, мела таксама на ўвазе тое, каб паступова падрыхтаваць клінікі для першага сталага курсу студэнтаў Мэдыцынскага факультэту. Камунальная ўлада гораду Менску прадставіла Ўн-ту свае больніцы, зноў адрамантавала, і такім чынам, Унівэрсытэт атрымаў неабходныя клінікі, што дало поўную мажлівасьць паставіць выкладаньне на Мэдыцынскім факультэце на вельмі добры грунт.

Арганізацыя факультэту Грамадзкіх Навук ужо ў першы год існаваньня Ўн-ту не здавальняла поўнасьцю, ні Праўленьня Ўн-ту, ні органы НКАсьветы. Апошні лічыў неабходным адчыніць асобны Пэдагагічны факультэт, які быў павінен выдзяліцца з факультэту Грамадзкіх Навук. НКАсьветы лічыў неабходным зачыніць існуючы Пэдагагічны Інстытут, а студэнтаў перавесьці на адпаведныя курсы Пэдагагічнага факультэту. Такім чынам, факультэт Грамадзкіх Навук застаўся ў складзе двох аддзяленьняў, Эканамічнага і Прававога, а Пэдагагічны факультэт пачаў сваю працу ў складзе аддзяленьняў: Расійскай мовы, Беларускай мовы, Яўрэйскай мовы і Польскай мовы, а таксама адпаведных аддзяленьняў Расійскай Культуры, Беларускай Культуры, Польскай Культуры і Яўрэйскай Культуры. Акрамя гэтага былі адчынены: Фізыка-Матэматычнае аддзяленьне і Прыродазнаўчае. У працягу 6 год Праўленьне БДзУ зварочвала асаблівую

ўвагу на Пэдфак і кожны год разглядала пытаньне аб апошнім з розных бакоў. Перш-на-перш Праўленьне Ун-ту прызнала непатрэбным існаваньне Расійскага аддзяленьня мовы, а таксама і Культуры, якое было зачынена. Потым кожны год разглядаліся пляны Пэдагагічнага факультэту, у мэтах зьнішчэньня шматпрадметнасьці, такой арганізацыі факультэту, каб апошні адпавядаў свайму прызначэньню.

Вясной 1927 году Праўленьне Ун-ту павяло вялікую працу па распрацоўцы новых навучальных плянаў Пэдфаку з тым, каб гэтыя пляны былі сталымі ў працягу наступных 5 год. Гэта справа была выканана з вялікім посьпехам, і пляны Ун-ту былі зацьверджаны Галоўпрафасьветы БССР.

Што датычыцца да факультэту Грамадзкіх Навук, дык апошні, згодна прапановы Праўленьня, быў зачынен. Аднак, студэнты 2-х апошніх курсаў атрымалі поўную мажлівасьць яго скончыць, а студэнты 1-га курсу былі пераведзены на Пэдфак, альбо ім быў дадзены дазвол перавесьціся ў іншыя вышэйшыя ўстановы, альбо паступіць на Беларускія Эканамічна-Прамысловыя і Каапэрацыйна-Прамысловыя Тэхнікумы.

Зачыняючы Факультэт Грамадзкіх Навук, Праўленьне адначасна падняла пытаньне аб адчыненьні Факультэту Права і Гаспадаркі з такім рахункам, каб яго арганізацыя больш адпавядала свайму прызначэньню,—падрыхтоўваць практычных дзеячоў на эканамічным і юрыдычным грунце. Прапанова праўленьня Ун-ту была ўхвалена НКАсьветы БССР і зацьверджана СНК БССР. Пачынаючы з восені 1926 году стаў функцыянаваць новы Факультэт Права і Гаспадаркі. Праўленьне Ун-ту зьвяртала асаблівую ўвагу на арганізацыю Рабочага Факультэту, які меў для Ун-ту першараднае значэньне. Толькі дзякуючы Рабочаму факультэту Ун-т мог атрымаць добра падрыхтаваную працоўную масу. Першыя два гады Праўленьне Ун-ту ня мела мажлівасьці даць шмат сродкоў для добрай арганізацыі Рабочага факультэту, але ў працягу 3-х год Рабочы факультэт атрымаў усё тое, што яму было неабходна, каб заняткі на Рабфаку ішлі правільна.

Дэканы ўсіх факультэтаў ў працягу кожнага году рабілі даклады аб становішчы іх факультэтаў, і, такім чынам, ўсё Праўленьне ун-ту было вельмі добра знаёма з становішчам факультэтаў. Праўленьне Ун-ту было вельмі заклапочана тым, каб мець добры, сталы склад выкладчыкаў. Запрашэньне выкладчыкаў сустракала шмат перашкод. Цэлы шэраг выкладчыкаў спачатку ня меў мажлівасьці жыць у Менску і быў прымушаны выкладаць лекцыі наездамі ў Менск. Бязумоўна, такая пастаноўка не здавальняла Праўленьня Ун-ту. Апошняе прыняла ўсе мерапрыемствы да таго, каб забясьпечыць прафэсароў кватэрамі, палепшыць іх матар'яльнае становішча і, тым самым, утварыць умовы для іх пераезду ў Менск. Трэба сказаць, што СНК і ЦВК БССР, а таксама органы камунальнага кіраўніцтва ўсё зрабілі залежнае ад іх, каб утварыць умовы для жыцьця прафэсароў у Менску. Гэта праца Праўленьня дала поўныя вынікі. Мэдыцынскі факультэт ужо на другі год свайго існаваньня меў сталы склад прафэсараў, а прафэсары астатніх факультэтаў, пачынаючы з 3-га году існаваньня Ун-ту, усе пераехалі ў Менск. У сучасны момант усе выкладчыкі жывуць у Менску.

Адчыняючы новыя факультэты і новыя курсы, Праўленьне Ун-ту перш-на-перш імкнулася да таго, каб даць прафэсарам памяшканьні. Ня гледзячы на крызыс, Праўленьне Ун-ту спраўлялася з сваёю мэ-

тай, але ўсё-ж такі ня ўсё ўдалося зрабіць, і ў сучасны момант ня ўсе прафэсары маюць свае кватэры.

З убуйненьнем Беларусі НКАсьветы, пастановай Калегіі, зачыніў Віцебскі Пэдагагічны Інстытут, а студэнтаў і прафэсароў перавёў ў склад студэнтаў і прафэсароў Пэдфаку. Праўленьне Ун-ту напружыла ўсе ўсільлі, каб забясьпечыць і прафэсароў з Віцебску неабходнымі памяшканьнямі. Наогул, гэта палітыка Ун-ту дала добрыя вынікі. Ун-т быў забясьпечаны цэлым шэрагам высока-кваліфікаваных выкладчыкаў, якія зьяўляліся добрымі кіраўнікамі цэлага шэрагу маладых дацэнтаў і асыстэнтаў, якія пачалі сваю працу ў Б. Дз . У.

Праўленьне Ун-ту прымала ўдзел у розных урачыстасьцях, як мясцовага, так і агульнасаюзнага значэньня. Праўленьне Б. Дз. У. прымала ўдзел у сьвяткаваньні 15-ці годзьдзя літаратурнай дзейнасьці беларускага пралетарскага песьняра і мастака-літаратара Д. Жылуновіча (Цішка Гартны). 15-годзьдзе навуковай і грамадзкай дзейнасьці народнага камісара Асветы, У. М. Ігнатоўскага было адзначана асобнай пастановай Праўленьня Ун-ту, на падставе якой рэктарам ун-ту быў адпраўлены прывітальны ліст. Акрамя гэтага, калі адбываліся ўрачыстыя пасяджэньні па выпадку юбілею У. М. Ігнатоўскага, ад імя Ун-ту, рэктарам Ун-ту быў прачытаны адпаведны адрас.

У маі месяцы 1925 году адбылося 20 год літаратурна-мастацкай дзейнасьці беларускага песьняра Янкі Купалы. Праўленьне Ун-ту арганізавала ўрачыстае пасяджэньне ў гонар Я. Купалы, а рэктар Ун-ту адаслаў адпаведны прывітальны ліст на імя юбіляра.

У верасьні 1925 году Праўленьне Ун-ту прымала ўдзел ў сьвяткаваньні 200 годзьдзя Расійскай Акадэміі Навук, на якое быў камандыраваны рэктар, які перадаў Прэзыдэнту Акадэміі Навук адрас.

20-ці годзьдзе літаратурна-мастацкай дзейнасьці другога беларускага песьняра і мастака слова, Якуба Коласа, якое адбылося ў 1926 годзе, таксама было адсьвяткавана ўрачыстым пасяджэньнем і пасылкай прывітальнага лісту ад імя Праўленьня Ун-ту.

1-га студзеня 1926 году выканалася 5 год бязупыннага прабываньня, ў якасьці Старшыні ЦВК, А. Р. Чарвякова. Рэктар Ун-ту на пасяджэньні 20 студзеня ахарактарызаваў дзейнасьць Чарвякова, як будаўніка Савецкай Беларусі. Згодна адпаведнай рэзалюцыі Старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР, быў пасланы прывітальны ліст.

30 кастрычніка 1926 году Праўленьне Ун-ту прымала ўдзел у юбілеі Рэктара Ун-ту, У. І. Пічэты, па выпадку 25-годзьдзя яго навукова-грамадзкай дзейнасьці. НКАсьветы па гэтаму выпадку прадставіў Рэктару Ун-ту стан заслужанага прафэсара БССР.

Акрамя гэтага, Праўленьне Ун-ту прывітала пасылкай тэлеграм асобных навуковых дзеячоў, а таксама навуковыя ўстановы ў часы сьвяткаваньня розных юбілейных дат.

29 кастрычніка 1927 году выканалася 30 год навукова-пэдагагічнай дзейнасьці прафэсара па кафэдры Акушорства і Гінэколёгіі, М. Л. Выдрына рэктарам Ун-ту, згодна пастановы Праўленьня, быў пасланы прывітальны ліст.

Гаспадарчая дзейнасьць Праўленьня наогул працякала ў вельмі дрэнных умовах. У працягу цэлага шэрагу год, Ун-т адчуваў адсутнасьць неабходных сродкаў. Бязумоўна, гэта ў значнай меры за-

трымлівала агульны працэс арганізацыйнай працы ва Унівэрсытэце. Толькі з таго моманту, калі Ун т стаў мець сталы бюджэт, арганізацыйна-гаспадарчая праца ва Ун-це пайшла больш хуткім тэмпам, асабліва з таго моманту, калі адміністрацыйна-гаспадарчымі пытаньнямі стаў займацца намесьнік Рэктара, С. З. Слонім. Праўленьню Ун-ту прыйшлося адрамантаваць і падтрымліваць парадак у тых будынках, якія былі адведзены Ун-там для заняткаў, а таксама ў іх прыстасаваньні да практычных заняткаў. Трэба адзначыць, што ўсе унівэрсытэцкія будынкі, пачынаючы з 1914 году, не рамантаваліся, і, ўсё-ж такі, Ун-т у працягу 6 год сумеў зрабіць капітальны рамонт усіх сваіх будынкаў і даць ім належны ўнутраны і надворны выгляд.

Другой мэтай гаспадарчай дзейнасьці Праўленьня зьявілася абсталяваньне памяшканьняў Ун-ту неабходнаю мэбляй. І гэта справа была вырашана, больш-меньш, здавальняючым чынам. Шмат увагі і сродкаў патрабаваў ад Праўленьня рамонт атапленьняў, як драўнянага, таксама вадзянога, паровага, які знаходзіўся таксама ў вельмі дрэнным становішчы. І гэта мэта была выканана. Шуканьне і прыстасаваньне памяшканьняў пад кватэры супрацоўнікам Ун-ту, а таксама для інтэрнатаў студэнтаў складала важную частку гаспадарчай дзейнасьці Праўленьня. Нельга сказаць, каб усе патрэбы супрацоўнікоў Ун-ту, а таксама студэнтаў былі-б здаволены, але ўсё-ж такі Праўленьне зрабіла ўсё тое, што яно магло зрабіць. Толькі тады, калі будзе пабудаваны студэнцкі інтэрнат—галоўны корпус—супрацоўнікі Ун-ту і студэнты будуць здаволены кватэрамі поўнасьцю

Праўленьне Ун-ту, жадаючы аслабаніць студэнцкія акадэмічныя і прафэсыйныя арганізацыі ад усялякіх гаспадарчых клапот, арганізавала 2 сталоўкі для Рабфаку і асобна для іншых студэнтаў. Па ініцыятыве Намесьніка Рэктара С. З. Слоніма студэнты Рабочага факультэту былі забясьпечаны харчаваньнем поўнасьцю. У працягу 6 год напружанай гаспадарчай дзейнасьці, ня гледзячы на невялікія срэдкі, Праўленьне Ун-ту перамагло ўсе перашкоды, якія стаялі на шляхох разьвіцьця. Гэта было мажлівым толькі дзякуючы дапамозе і падтрыманьню з боку ўрадавых, партыйных і прафэсыйных арганізацый.

Пытаньне аб навуковым і навучальным абсталяваньні зьяўлялася балючым месцам у жыцьці Унівэрсытэту. Праўленьне У-ту зьвяртала на гэта асаблівую ўвагу, ня гледзячы на тое, што гэта мэта была вельмі цяжкая, і часам здавалася, што Праўленьне Ун-ту ня мае ніякай мажлівасьці перамагчы ўсе тыя перашкоды, на шляхох навуковага і навучальнага абсталяваньня Ун-ту.

Агульнае фінансавае становішча БССР, а таксама і Саюзу ССР спачатку затрымлівала працу Ун-ту. Аднак, атрымаўшы з агульнага залатога фонду грошы, а потым атрымліваючы ліцэнзіі на закупку тавараў за межамі, Праўленьню Ун-ту ўдалося абсталяваць належным чынам лябараторыі і габінэты Мэдыцынскага факультэту і Прыродазнаўчага аддзяленьня Пэдфаку. Аднак, трэба сказаць, што яшчэ ў гэтай галіне зроблена мала; навуковае абсталяваньне габінэтаў і лябараторый вельмі далёка ад ідэалу, і Праўленьню Ун-ту прыдзецца яшчэ шмат працаваць у гэтым напрамку.

Адначасна Праўленьне Ун-ту зьвяртала шмат увагі на абсталяваньне габінэтаў па навукам гуманітарным, ў гэтай галіне зроблена шмат. У кожным выпадку, у сучасны момант ужо маецца фундамант для поўнага абсталяваньня Ун-ту, і ўжо можна весьці дасьледчую працу ва Ун-це.

Пытаньні мэтодычнага характару таксама былі прадметам абгаварэньня з розных бакоў Праўленьнем Ўн-ту, якое ня было здаволена панаваньнем лекцыйнага мэтаду выкладаньня, які карэктаваўся абавязковымі для студэнтаў практычнымі заняткамі. На Рабочым Факультэце ўдалося перавесьці выкладаньне на дальтон-плян. На Факультэце Пэдагагічным і Права і Гаспадаркі быў уведзены лябараторна-групавы мэтад па тым прадметам, якія мелі неабходнае навуковае абсталяваньне. Вопыт 1925/26 нав. году наогул даў значныя вынікі, але Праўленьне, падлічваючы недахопы ў выкладаньні па лябараторна-групавому мэтаду скараціла значную частку прадметаў, якія выкладаліся па гэтаму мэтаду і пакінула выкладаньне па лекцыйнаму і сэмінарскаму мэтаду. Вядома, на Прыродазнаўчым і Фізыка-Матэматычным аддзяленьнях Пэдфаку, а таксама на факультэце Мэдыцынскім, лябараторна-групавым мэтадам адведзена вялікае месца, з прычыны таго, што ён у працягу 1925-26 акад. году поўнасьцю апраўдаў сябе.

## 6. Бюджэт Унівэрсытэту.

Б. Дз. У. з пачатку свайго заснаваньня фінансаваўся з дзьвёх крыніц: ЦВК БССР і з сродкаў Галоўпрафасьветы РСФСР. Акрамя гэтага, Менскі Гарвыканком ня раз прыходзіў на дапамогу Ўн-ту ў яго цяжкіх матар'яльных справах. Сродкі, якія адпускаў ЦВК Савету БССР, складалі вельмі важную частку бюджэту Ўн-ту ў першыя два гады. Можна сказаць, што наогул да 70 проц. усяго бюджэту Ўн-ту складалася з асыгнаваньняў ЦВК Савету Беларусі.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт быў заснаваны у вельмі цяжкіх абставінах. Гаспадарка Беларусі была зьнішчана. Краіна наогул была зруйнавана, і ўладзе Беларусі трэба было напружваць усе сваe сілы, каб палепшыць становішча краіны і насельніцтва. Акрамя гэтага, у год заснаваньня на Беларусі Унівэрсытэту здарыўся вялікі голад на Паволажжы, што таксама было павінна аказаць вялікі ўплыў на арганізацыйную працу па будаваньню Ўнівэрсытэту. Унівэрсытэт з першага моманту ня меў неабходных сродкаў, і гэта было павінна аказаць свой уплыў на яго навучальнае абсталяваньне. Першыя два гады былі вельмі цяжкімі ў жыцьці Унівэрсытэту. Адсутнасьць грошай рабіла немагчымым павялічваць абсталяваньне, адчыняць габінэты і лябараторыі, а таксама трымаць нашы будынкі ў тым становішчы, у якім яны павінны былі знаходзіцца. І, тым ня менш, ня гледзячы на гэтыя цяжкія ўмовы, ужо ў першыя два гады Унівэрсытэт вельмі ўзрос і замацаваўся. Астатнія тры гады, асабліва апошнія два гады, былі вельмі прыемнымі для ўзросту Унівэрсытэту. Унівэрсытэт стаў атрымліваць неабходныя сродкі для свайго ўтрыманьня і стаў мець сталы бюджэт. Агульная сума выдаткаў выразілася ў 1924-25 акад. годзе ў ліку 696.053 руб. 36 к. З гэтай сумы на ўтрыманьне асабовага складу пайшло 344.227 руб. 91 к., у тым ліку на ўтрыманьне прафэсарка-настаўніцкага складу —213.277 руб. 54 кап. Другім, важным пунктам выдатковага бюджэту былі выдаткі па ўтрыманьню студэнтаў. Яны выразіліся ў ліку 196.978 руб. 02 кап., з ліку якіх было выдадзена на стыпэндыі 173.604 руб. 67 кап. Трэцьцім, важным пунктам у выдатковым бюджэце былі выдаткі на навукова-навучальную частку, якая выразілася ў ліку 63.582 руб. 72 кап., у тым ліку—на абсталяваньне габінэтаў і лябараторый было адпушчана 48.745 руб. 66 к. Чацьвертым выдатковым пунктам быў рамонт будынкаў Унівэрсытэту, які выразіўся ў ліку 44.073 руб. 29 кап. Урэшце, гаспадарчыя выдаткі патрабавалі

36.782 руб. 87 кап., у тым ліку на апал будынкаў Унівэрсытэту—10.000 руб. Асобнае месца ў бюджэце Унівэрсытэту займае выданьне „Прац Б. Дз. У.", на якое было адпушчана 4.000 руб., а таксама на дарожныя выдаткі 4.550 руб. Гэтыя сродкі былі расходаваны на выдачу дапамогі па камандыроўкам, а таксама на пакрыцьце выдаткаў па переезду прафэсараў, якія былі запрошаны ў Менск.

Бюджэт Унівэрсытэту на 1925-26 год значна ўзрос. Ён выразіўся ў суме 1.131.057 р. 44 к. Утрыманьне асабістага складу па-старому займала першае месца ў выдатковым бюджэце. Яно выразілася ў суме 535.706 руб. Таксама значна ўзрасьлі і выдаткі па ўтрыманьню студэнтаў. На стыпэндыі было адпушчана 271.595 руб. На ўтрыманьне інтэрнатаў—18.901 руб. і на санаторна-курортную дапамогу студэнтам—10.000 руб. Таксама павялічыліся сродкі, якія былі адпушчаны на навукова-навучальную частку. У бюджэце 1925-26 году яны займалі трэцяе месца і выразіліся ў суме 103.817 руб. Значнае месца ў бюджэце Унівэрсытэту занялі розныя гаспадарчыя выдаткі і дробны рамонт—27.277 руб., а таксама і капітальны рамонт будынкаў—47.000 руб. Павялічыліся сродкі на выданьне „Прац Б. Дз. У." —5.000 руб. і на дарожныя выдаткі—5.210 руб. Гэткім чынам, Б.Дз.У., які быў пераведзены на сталы дзяржаўны бюджэт, пачаў атрымліваць неабходныя сродкі для свайго ўзросту.

Бюджэт Унівэрстытэту на 1926-27 год выразіўся ў суме 1.212.840 р. 53 кап. У лік гэтага бюджэту ўваходзяць выдаткі па Ун-ту, па Рабфаку і 2-м Досьледча-Паказальным Школам: Беларускай і Яўрэйскай. і ня ўваходзяць выдаткі па дзяржаўнай бібліатэцы, якія раней ўваходзілі ў бюджэт БДУ. На ўтрыманьне асабовага складу было выдадзена 581.277 руб. 23 кап.

Другі выдатковы артыкул—былі стыпэндыі студэнтам, у суме 318.677 руб. 50 кап.

На ўтрыманьне інтэрнату і сталовых было асыгнавана 16.749 руб. 88 к. і на куротную дапамогу студэнтам—8:224 руб.

Выдаткі на навучальную частку выразіліся ў суме 105.536 руб. 01 кап. Выдаткі на выдавецтва 5.499 руб. 23 кап. І, ўрэшце, на падарожныя выдаткі 5.015 руб. 73 кап.

Той-жа самы факт, што Ун-т за апошнія 4 гады пачаў мець сталы бюджэт, даў магчымасьць Ун-ту шырока павесьці вялікую арганізацыйную працу і паставіць Вышэйшую Навучальную Установу ў тое самае становішча, у якім яно было павінна знаходзіцца, каб Ун-т меў права насіць назву вышэйшай школы.

### 6. Навуковае абсталяваньне.

Узрост асобных факультэтаў зьяўляецца паказацелям узросту Унівэрсытэту наогул. Так, калі Рабочы факультэт быў адчынены і пачаў сваю дзейнасьць, дык ён ня меў нічога ў поўным сэнсе гэтага слова. Рабочы факультэт за апошнія два годы ўтварыў новыя лябараторыі, габінэты, і ў сучасны момант мае ўсе тое, што яму неабходна, каб выкладаньне ішло належным чынам. Можна сказаць з ўпэўненасьцю, што Рабочы факультэт у сучасны момант абсталяваны ня горш, чым абсталяваны рабочыя факультэты Ленінграду і Масквы. Дзеля гэтага Рабочы факультэт меў магчымасьць перайсьці на выкладаньне ўсіх прадмэтаў па лябараторнаму мэтаду, што зьяўляецца немагчымым без навучальнага абсталяваньня. Усе гэтыя факты

зьяўляюцца паказацелям значных дасягненьняў па будаваньню Рабочага факультэту.

І на Пэдагагічным факультэце справа абсталяваньня таксама перш-на-перш знаходзілася ў вельмі дрэнным становішчы, і тым ня менш, на працягу пяці год узрасьлі новыя лябараторыі, якія далі магчымасьць поўнасьцю забясьпечыць навучальныя заняткі і часткова весьці самастойную навуковую працу. Хэмічныя лябараторыі Пэдфаку, Інстытут Зоолёгіі і Батанікі, Фізычны Інстытут і розныя габінэты па іншым прадмэтам зьяўляюцца навочным паказацелям узросту Пэдагагічнага факультэту, хаця трэба адзначыць, што ён яшчэ ня мае ўсяго таго, што яму неабходна. Так, зусім не абсталявана кафэдра астраноміі. Інстытут Фізыкі яшчэ ня мае ўсіх тых інструмэнтаў і прыладаў, якія неабходны для навуковай і навучальнай працы інстытуту. Можна лічыць, што ў сучасны момант Фізычны Інстытут мае толькі 15 проц. усяго неабходнага яму абсталяваньня. Лябараторыі хэмічныя маюць больш 60 проц. неабходнага ім абсталяваньня. Трэба адзначыць, што Інстытут Зоолёгіі быў утвораны праф. Фядзюшыным, які на працягу 3-х год зрабіў экскурсіі па ўсёй Беларусі і зьбіраў неабходны яму матар'ял зоолёгічны і орніталёгічны. У сучасны момант Інстытут Зоолёгіі мае вялікую колькасьць беларускіх птушак, але нажаль, за адсутнасьцю сродкаў, яны яшчэ ня могуць быць апрацаваны і пастаўлены ў Музэй Інстытуту. Трэба таксама сказаць, што і калекцыі Інстытуту Батанікі таксама падрыхтоўваліся дзякуючы экскурсіям асыстэнтаў і студэнтаў. Што ж датычыцца да іншых габінэтаў, асабліва па навукам гуманітарным, дык іх кніжныя багацьці, неабходныя для сэмінарскіх заняткаў вельмі павялічыліся, але і тут габінэты нямаюць усяго таго, што неабходна для практычных заняткаў.



Габінэт Марксызму і Ленінізму. [redacted]

Пэдагагічны факультэт яшчэ мае Музэй Першабытнай Культуры, на які ў свой час былі выдадзены вялікія сродкі, і які цяпер адчувае

патрэбу ў папаўненьні. Ня гледзячы на гэтыя недахопы ў абсталяваньні лябараторый і габінэтаў Пэдагагічнага факультэту, можна лічыць, што, калі будуць дадзены неабходныя сродкі, дык на працягу наступных гадоў гэтыя недахопы будуць зьнішчаны і ўсе Інстытуты і габінэты будуць добра абсталяваны.

Мэдыцынскі факультэт таксама вельмі ўзрос. З дапамогай Акруговага Аддзелу Народнага Здароўя, а таксама Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя былі арганізаваны клінікі Унівэрсытэту, якія ў сучасны момант знаходзяцца ў такім становішчы, пры якім можна весьці вельмі значную клінічную працу. Трэба адзначыць, што ня ўсе клінікі роўным чынам абсталяваны. Найлепшым чынам абсталявана лябараторыя Нэрвовае клінікі, Дзіцячай клінікі, 2-ой Тэрапэўтычнай клінікі, абодзьвух Хірургічных клінік. Трэба адзначыць, што, з другога боку, Псыхіятрычная клініка яшчэ ня мае нічога, і ў сучасны момант, як у адносінах памяшканьня, так і ў адносінах абстляваньня, знаходзіцца ў вельмі дрэнных умовах. Лябараторыі і Інстытуты Мэдыцынскага факультэту ў сучасны момант поўнасьцю забясьпечаны для выкладаньня, і часткова даюць магчымасьць весьці навуковую працу. Вядома, Мэдыцынскі факультэт яшчэ таксама не абсталяваны поўнасьцю, ён яшчэ мае шмат недахопаў, але што ў наступныя гады гэтыя недахопы павінны быць зьнішчаны. Трэба адзначыць, што Мэдыцынскі факультэт яшчэ ня мае добрага Анатамічнага Інстытуту, які перш-на-перш, за адсутнасьцю сродкаў, быў абсталяваны вельмі прымітыўна, і які не адказвае сучасным патрабаваньням з боку навукі. Будаваньне Анатамічнага Інстытуту, у якім павінны аб'яднацца кафэдры нармальнае анатоміі опэратыўнай хірургіі і тапаграфічнай анатоміі, зьяўляецца чарговай мэтай з прычыны таго, што ў працоўным выпадку заняткі па гэтым дысцыплінам ня могуць быць пастаўлены так, як іх трэба паставіць у нармальна-дзеячаячай вышэйшай школе. Таксама неабходна памяшканьне і для Інстытуту Патолёгічнай Анатоміі і Гістолёгіі, сучаснае памяшканьне якіх не адказвае свайму прызначэньню.

Факультэт Права і Гаспадаркі, які існуе толькі другі год, атрымаў габінэты ад зачыненага Факультэту Грамадзкіх Навук. На працягу аднаго году свайго існаваньня ён вельмі пашырыў свае габінэты і арганізаваў габінэт Марксызму і Ленінізму, які зьяўляецца агульным для ўсяго Унівэрсытэту. Ужо ў мінулым годзе Факультэт Права і Гаспадаркі пачаў арганізоўваць габінэт тавараназнаўства і габінэт па вывучэньню Злачынцы і Злачынства. Праца Факультэту Права і Гаспадаркі сустракае перашкоды з прычыны адсутнасьці памяшканьня. Недахоп у памяшканьні будзе вельмі адчувацца ў наступным годзе, калі будзе адчынены 3-ці курс Факультэту Права і Гаспадаркі.

### 8) Настаўніцкі пэрсанал і навуковая праца.

Б.Дз.У. з моманту свайго заснаваньня сустракаў шмат перашкод у справах запрашэньня неабходных выкладчыкаў. Справа ў тым, што шмат выдатных выкладчыкаў баяліся пераехаць у Менск, што БДзУ ня будзе наогул існаваць. Аднак, цэлая група выкладчыкаў ўсеж такі пераехала і пачала весьці шырокую, арганізацыйную, будаўнічую справу. Калі Ун-т арганізаваўся, дык запрошаныя навуковыя выкладчыкі бачачы ўзрост Ун-та знайшлі мажлівым пакінуць старыя пасады і месца свайго жыцельства і пачаць працу ў Менску. Праўда, невялікая група праф. усёж такі жыла ў Маскве займаючы там кафэдры і толькі час—ад—часу наяжджала у Менск.

БДзУ жадаючы мець высока-кваліфікаваных прафэсароў павіннэн быў лічыцца з гэтым ня гледзячы на тое, што гэта ўносіла ў працу Ун-ту перашкоды. Праўленьне БДзУ імкнулася да таго, каб запрасіць для працы ў БДзУ праф. беларусоў, якія працавалі ў інш. навуч. установах.

Аднак, трэба сказаць, што не адзін з праф. беларусоў ня даў сваей згоды на працу ў БДзУ. Праўленьне БДзУ імкнулася, каб скарыстаць тую навуковую моладзь беларускага паходжаньня, якая знаходзілася ў Менску, безумоўна, такая палітыка была правідловая. І ў далейшым Праўленьне БДзУ сачыла за навуковым рухам у Беларусі і запрашала ў якасьці выкладчыкаў тыя сілы, якія сябе паказалі, як здольныя працаўнікі.

У складзе прафэсароў БДзУ было 2 групы выкладчыкаў:

Першая высака-кваліфікаваная, якая мела даволі вялікі навуковы пэдагагічны стаж і другая, якая толькі пачынала сваю навуковую дзейнасьць.

Праўленьне Ўн-ту паступіла правільна. Пад уплывам і кіраўніцтвам ква-ліфік. праф. маладыя сілы далі простор сваім здольнасьцям і на працягу 5 год выраслі ў выдатную навуковую сілу.

Праўленьне Ўн-ту падлічыла гэтыя дасягненьні і знайшло неабходным прадставіць цэлы шэраг навуковых працаўнікоў на дацэнцкія і прафэсарскія пасады. Трэба сказаць, што большая частка гэтых навуковых сіл была беларускага паходжаньня.

На працягу 6 год склад настаўнікаў БДзУ увесь час павялічваўся ў якасьці росту Ун-ту, адчыненьнем новых курсаў і новых факультэтаў. У сучасны момант Ун-т поўнасьцю забясьпечан выкладчыкамі, але ўсёж такі трэба адзначыць, што на Мэд. факультэце асобныя кафэдры па сьмежнай спэцыяльнасьці аб'яднаны ў адных руках. У далейшым Праўленьне БДзУ павінна прыняць меры, каб забясьпечыць кафэдры спэцыяльн. выкладчыкамі. Гэта асабліва неабходна ў сучасны момант, калі Мэд. факультэт перайшоў на сыстэму штатаў.

Такім чынам, БДзУ з боку складу праф. пэрсаналу стаіць на цьвёрдым груньце.

На працягу 6 год склад выкладчыкаў зьмяніўся да таго, што невялікая група праф. выбыла з Ун-ту. Выдатны прафэсар і буйны вучоны па гісторыі Расійскага права Д. М. МЕЙЧЫК, які толькі атрымаў мажлівасьць пачаць сваю навуковую працу ў БДзУ памёр. Таксама памёр і праф. па кафэдры Арганічнай хіміі А. С. УСАЎ і П. А. ЯНЧУК, праф. на кафэдры этнаграфіі.

Дацэнт А. А. САВІЧ пасьля 2-х гадовае працы ў БДзУ заняў кафэдру Расійскай гісторыі ва Ун-це. Праф. па кафэдры Зах. Эўрапэйскай літаратуры А. Н. ЕЎЛАХАЎ перамяніў каф. БДзУ на кафэдру па тамуж прадмету ў Азэрбайджанскім Ун-це. Праф. па кафэдры Неарганічнай хіміі В. М. БЕРКЕНГЕЙМ пакінуў Ун-т дзякуючы ад'езду ў Маскву. Праф. па кафэдры Эканамічнае палітыкі В. КНОРЫН за атрыманьнем пасады у Маскве таксама пакінуў БДзУ. Праф. па кафэдры старажытнае Гісторыі Д. М. КАНЧАЛОЎСКІ і Праф. па кафэдры Новай Гісторыі В. Н. ДЗЯКОВ і Я. М. САЛОВЫ праф. па кафэдры тэхнікі сталі працаваць у Маскве. Праф. па кафэдры Ўсясьветнай Гісторыі С. М. ЛЯСКОЎСКІ атрымаў кафэдру ў Самаркандскім Пэд. Ун-це. Пакінулі Менск праф В. М. ДОВНАР-ЗАПОЛЬСКІ і І. Д. МАРКІН і С. З. КАЦЭНБОГЕН.

Таксама пакінулі Ун-т цэлы шэраг ардынатараў, асыстэнтаў па сканчэньні іх стажу. Такім чынам, толькі невялікая частка працоўнікаў пакінулі БДзУ, рэшта засталася ў Ун-це і з вялікім посьпехам вядзе ў ім працу.

Не гледзячы на тое, што БДзУ ня меў сталага, поўнага навуковага выкладаньня, прафэсары і выкладчыкі ўвесь час вялі навуковую працу, друкуючы свае працы, як у „ПРАЦАХ БДзУ“ таксама ў розных выданьнях, як за межамі СССР, так і ў часопісах РСФСР і УССР. Шмат прадстаўнікоў Мэд. факультэту выдавалі сваю працу ў нямецкіх часопісах, а праф. М. Н. НІКОЛЬСКІ надрукаваў вялікую працу аб магічнай літаратуры Дрэўняга Ізраіля.

Навуковая праца шырока разгарнулася ва Ун-це, але нажаль цэлы шэраг прац яшчэ не надрукаваны за адсутнасьцю сродкаў.
Акрамя гэтага навуковая праца праф. адбівалася ў працы ў Навуковым тавырыстве ў БДзУ. Прафэсары і інш. выкладчыкі прымалі значны ўдзел на пасяджэньнях навуковага тав-ва, як агульных, так і сэкцыйных. Самае Навуковае тав. падзялілася на сэкцыі: Сацыяльна Гістарычную Літаратурна-мовазнаўчую, Юрыдычную, Прыродазнаўчую Матэматычную, Мэдычную і Пэдагагічную.

Акрамя гэтага, цэлы шэраг праф. прымалі ўдзел у працы Інбелкульту, Наркамаюсту, Наркамздраву і Наркамасьветы.
Праф. БДзУ таксама выступалі з навуковымі дакладамі на Прадмэтных камісіях. Пры клініках і навуковых лабяраторыях Мэд. факультэту арганізаваліся навуковыя канфэрэнцыі, у якіх прымалі ўдзел супрацоўнікі кафэдры, альбо лябораторыі альбо габінэту.
Вельмі часта ўтвараліся аб'яднаныя пасяджэньні агульных і сумежных па спэцыяльнасьці кафэдр. Акрамя гэтага ў Прад. Камісіях таксама выступалі з навуковымі дакладамі. Усё гэта сьведчыла аб шырока разгорнутай працы ў БДзУ.

Прафэсары і выкладчыкі БДЗУ прымалі ўдзел у розных канфэрэнцыях і зьездах, як на тэрыторыі Беларусіі, таксама і на абшарах СССР і за межамі. На працягу 6 год Наркамасьветы камандыраваў цэлы шэраг навуковых працаўнікоў за межы СССР дзеля навуковай працы. Прага, Нямеччына, Аўстрыя і Францыя былі тымі краінамі ў якія адкамандыроўваліся навуковыя працаўнікі.

Такія камандыроўкі, вядома, мелі вялікае значэньне. Так, яны далі магчымасьць цэламу шэрагу навуковых працаўнікоў пачаць альбо скончыць сваю працу. БДзУ знаходзіўся ў навуковым абмене сваімі выданьнямі, з навуковымі ўстановамі Польшчы, Латвіі, Эстоніі, Нямеччыны, Чэхаславакіі, Злучанных Штатаў Паўночнае Амэрыкі.
Усе гэта сьведчыць аб тым, што БДзУ вельмі замацаваўся, як навуковая ўстанова і гэтым самым БДзУ стаў цэнтрам навуковай думкі і асьветы на Беларусі.

Праўленьне БДзУ лічылася з неабходнасьцю прыняць цэлы шэраг мерапрыемстваў для падрыхтоўкі новых сіл. Для гэтай мэты ў мінулым годзе было пакінута пры Ун-це 20 асьпірантаў, якія пад кіраўніцтваў спэц. павінны падрыхтавацца да навуковае працы.

Большасьць асьпірантаў будуць працаваць у Менску, аднак, па асобным кафэдрам, якія яшчэ ў Ун-це ня вельмі добра абсталяваны асьпіранты будуць камандыраваны ў Маскву, альбо ў Ленінград.

Праўленьне БДзУ, упэўнена ў тым, што асьпіранты атрымаюць адпаведную падрыхтоўку і будуць здольнымі, да таго, каб пачаць сваю навуковую дзейнасьць у сценах Ун-ту.

На падставе тых навуковых прац, якія імі будуць напісаны і якія гэтым самым будуць сьведчыць аб іх навуковай падрыхтоўцы.

Устаў аб навуковых працаўніках прадаставіў Ун-ту мажлівасьць выдаваць вучоныя ступені. Бязумоўна, гэта будзе садзейнічаць яшчэ большаму пашырэньню навуковых прац, акрамя гэтага працаўнікі БДзУ пажадаюць атрымаць вуч. ступень доктара адпаведнае навукі. Трэба яшчэ адзначыць, што з пачатку заснаваньня Ун-ту праф. БДзУ прымаюць значны ўдзел у чытаньні публічных лекцый, як у Менску, так і за яго межамі.

Гэта грамадзкая дзейнасьць значна пэвялічала тую вялікую рэпутацыю, якой карыстаецца Ун-т.

На 1-е кастрычніка 1927 г. па сьпіскам БДзУ лічылася:
49 прафэсараў, 51 дацэнт, 74 асыстэнта, 39 ардынатараў, 8 лектароў моў, 36 выкладчыкаў на раб. факультэце, 36 выкладчыкаў вузорных Беларускай і Яўрэйскай школ. З гэтага ліку настаўніцкага пэрсаналу Ўн-ту за выключэньнем Рабфаку было 16 проц. парт., з ліку якіх было 3 праф., 20 дац., 7 асыст. і 6 ардынатараў.

У нац. адносінах: да бел. нац. належыць 34 проц. настаўніцкага пэрсаналу, з іх 6 праф., 20 дацэнтаў, 28 асыстэнтаў, 19 ардынатараў. Гэта павялічэньне даволі вялікае, калі параўнаць яго з данымі 1925/26 г., калі толькі 25 проц. было беларускага пахаджэньня.

Праўленьне БДзУ пачынаючы з 1926 г. будавала сваю працу і ў сучасны момант вышла 15 выпускаў і друкуюцца новыя.

Гэтыя працы толькі часткова далі мажлівасьць праф. БДзУ, дацэнтам і інш. навуковаму пэрсаналу надрукаваць сваю працу.

## 9) Нацыянальная палітыка ва Ўн-це.

Б. Дз. У. з пачатку свайго існаваньня імкнуўся да таго, каб арганізаваць выкладаньне на мясцовых мовах. З другога боку. Праўленьне Ўн-ту і Наркамасьветы лічылі неабходным арганізаваць выкладаньне, каб яно выдавалася на мясцовым матар'яле, вось чаму на факультэце Права і Гаспадаркі, а таксама на пэдагагічным факультэце выкладаецца шмат прадметаў краязнаўчага характару. Надаючы вялікае значэньне краязнаўчаму руху і лічачы. што Беларусь усебакова ня вывучана, БДзУ арганізавала экспэдыцыю для збору рознага матар'ялу навуковага характару. На працягу 3-х год праф. А. Ф. Фядзюшын прымаў удзел ў кспэдыц. аднотолёгічнага характару, праф. М. М.—Бмодух у экспэд. біолёгічнага характару і праф. У. С. Сербаў у экспэдыцыі этналёгічнага характару.

Праўленьне Ун-ту аргаізавала краязнаўчае т-ва для вывучэньня Тураўскага раёну Мазырскае акругі.

Усе гэтыя экспэдыцыі прайшлі з вялікім посьпехам і быў дабыт значны навуковы матар'ял. Акрамя гэтага праф. і выклад. Мэдычнага факультэту вытвараліся розныя расьсьледаваньні Мэдычнага характару. Факультэт вывучаў пашырэньне маляры, рынасьціромы, базэдавай хваробы і інш. хвароб, якія пашыраны на Беларусі. У гэтым руху прымалі ўдзел і студэнты. Акрамя гэтага для набыцьця навуковага матар'ялу былі арганізаваны экспэдыцыі на Мурман, Урал, Паўднёвы Каўказ, Крым, Растоў-на-Дану, а таксама экспэд. па Беларусі. Навуковы матар'ял быў прадастаўлен у распараджэньне адпаведных кафэдраў.

БДзУ з самага пачатку імкнуўся, каб арганізаваць выкладаньне на бел. мове. Аднак, гэта справа сустракала шмат перашкод з прычыны адсутнасьці выкладчыкаў, якія-б ведалі бел. мову.

У справах беларусізацыі было шырока пастаўлена выкладаньне і вывучэньне студ. бел. мовы. Аднак, на працягу 6 год БДзУ атрымаў значныя вынікі ў справах беларусізацыі. Больш усяго беларусізаваны. Пэдфак, на якім у гэтым годзе 65 вуч. гадзін выкладаецца на бел. мове. Акрамя гэтага, 15 проц. гадзін выклад. на яўрэйскай мове і толькі 20 проц. на расейскай мове.

На Мэдычным факультэце ўсе практычныя заняткі выключаючы лекцыі, будуць чытацца на бел. мове, што будзе складаць 50 проц. вуч. гадзін факультэту. На Праўгасе 30 проц. вуч. гадзін будзе чытацца на бел. мове.

На рабфаку ўсё выкладаньне вядзецца на бел. мове. Акрамя гэтага, на Рабфаку адчынена Яўрэйскае аддзяленьне. На польскай мове на Пэдагагічным факультэце таксама чытаецца на польскай некалькі курсаў. Ня гледзячы на гэтыя значныя дасягненьні Праўленьне БДзУ будзе і далей весьці сваю працу па беларусізацыі, каб у наступныя два гады БДзУ быў беларусізаван поўнасьцю. Праўленьне БДзУ прыступае да выданьня навуковых курсаў на беларускай мове. Беларускія падручнікі павінны яшчэ больш замацаваць усю працу Ўнівэрсытэту па беларусізацыі.

Ў апошнія два гады студэнты Ўнівэрсытэту пры паступленьні ва Ўн-т павінны былі трымаць залікі і па беларускай мове.

## 10) Студэнцтва БДзУ.

Прыём стдэнтаў у БДзУ адбываўся ў канцы жніўня і пачатку верасьня кожнага акадэмічнага году. Для гэтае мэты ўтваралася Прыймовая камісія, ў склад якой уваходзілі прадстаўнікі Праўленьня Унівэрсытэту, партыйных і прафэсыйных арганізацый. Пры Главпрафобры ўтваралася цэнтральная камісія, у якую паступалі ўсе апэляцыі. Ў сучасным годзе была ўтворана Прыймовая Камісія пры Праўленьні Ўнівэрсытэту і ўсе апэляцыі паступалі на разгляданьне Праўленьня Такая дэцэнтралізацыя, бязумоўна, зрабіла тэмп працы Прыймовай камісіі больш хуткім.

Ўсё студэнты, якія падавалі заявы ва Ўнівэрсытэт незалежна ад факультэтаў былі павінны трымаць залікі. Трэба сказаць, што прыймовыя залікі паказалі, што з кожным годам падрыхтоўка студэнтаў паляпшаецца. Асабліва ў сучасным годзе, калі большая частка падаўшых заявы паказалі, што яны зьяўляюцца вельмі добра падрыхтаванымі. Такое палепшаньне падрыхтоўкі тлумачыцца тым, што сыстэма народнае асьветы на Беларусі ўжо стала цьвёрдай і выкладаньне ў школах значна палепшылася.

. Асьпіранты, якія скончылі Пэдтэхнікум былі залічаны на другі курс Пэдфаку з прычыны таго, што першы курс быў агульнага характару, тыя жа асобы якія скончылі Эканамічныя Прамысловыя Тэхнікумы, а таксама Мэдыцынскі тэхнікум залічаліся на 1-ы курс без залікаў. Прымаючы пад увагу, што Нар. Кам. Аховы Здароўя трымаў курс на скасаваньне фэльдшарызму Прыймовая камісія выэна-

чала кожны раз значны процант вольных мейсц для школьных фэльдшароў, якія былі павінны трымаць уступныя залікі па 2-м дысцыплінам, грамадазнаўству і прыродазнаўству.

Першыя годы было шмат-ва жадаючых уступіць ва Ўнівэрсытэт дзякуючы чаму ў лік студэнтаў было залічана больш чым гэта патрэбна для Беларусі. Каб мінуць перапаўненьня Глаўпрафобру прышлося пры прыёме ва Ўнівэрсытэт карыстацца сталымі лічбамі і значна паменьшыць агульны лік студэнтаў на мэдыцынскі факультэт.

Агульная колькасьць студэнтаў з адчыненьнем новых курсаў увесь час павялічвалася.

Урад Беларусі, адчыняючы Ўнівэрсытэт,імкнуўся да таго, каб ён стаў мейсцам дзеб адтрымалі сваю адукацыю сяляне і рабочыя Беларусі, якія ня мелі ніякай мажлівасьці вучыцца ў старыя часы. Дзякуючы гэтаму Прыймовая камісія зварачвала сваю увагу на сацыяльны склад студэнцтава і ў пэршую чаргу залічвала тых студэнтаў, якія належалі да працоўных і сялян.

Дзякуючы гэтаму, з кожным годам агульны склад студэнтаў з сацыяльнага боку значна паляпшаўся.

На 1-е кастрычніка 1927 г. у БДзУ лічылася 2672 студэнтаў. Лік студэнтаў па факультэтам па сацыяльнаму складу, нацыянальнаму складу, партыйнаму складу можна яскрава прадставіць у наступнай табліцы: (гл. ст. 30)

Матар'яльнае становішча беларускага студэнцтва было вельмі цяжкае. Беларускі ўрад аб гэтым добра ведаў і з першых дзён існаваньня Ўнівэрсытэту зьвярнуў на гэта сваю ўвагу і імкнуўся, каб забясьпечыць студэнтаў неабходнымі стыпэндыямі. Адсутнасьць матар'яльных сродкаў студэнцтва, бязумоўна, зьяўлялася перашкодаю для павялічэньня пасьпяховасьці студэнтаў. Прымаючы пад уваґу патрэбы студэнцтва, беларускі ўрад паступова павялічваў лік стыпэндый. У сучасны момант лік стыпэндый падняты да 1037 асоб, але гэта вельмі мала, у параўнаньні з тэй патрэбай, якая адчуваецца студэнтамі. Адсутнасьць у горадзе памяшканьняў таксама зьяўлялася вялікаю перашкодаю ў студэнцкім жыцьці. Праўленьне Ўн-ту ўжо ў першы год існаваньня Ўнівэрсытэту прыняла мерапрыемствы да таго, каб забясьпечыць студэнцтва, хаця-б яго частку, інтэрнатам. Выканаць гэтую мэту было вельмі цяжка, за адсутнасьцю ў Менску адпаведных памяшканьняў, але ўсё-ж такі, трэба прызнаць, што ў гэтым напрамку было зроблена вельмі шмат. Усе студэнты Рабочага факультэту забясьпечаны памяшканьнем для інтэрнату, а таксама яшчэ маецца інтэрнат для 500 асоб.

Каб утварыць больш лепшыя ўмовы для жыцьця студэнцтва, студэнцкія арганізацыі адчынілі сталовыя для харчаваньня студэнцтва. У мінулым годзе гэтымі сталовымі загадвала Праўленьне Ўн-ту і прыклала ўсе ўсільлі да таго, каб палепшыць харчаваньне студэнтаў. Аднак, трэба адзначыць, што пры невялікай па разьмерам колькасьці стыпэндыі вельмі цяжка здаволіць мінімальныя запатрабаваньні ў харчаваньні і адзеньні. Апрача гэтага, і іншыя культурныя запатрабаваньні студэнцтва, за адсутнасьцю сродкаў, ня могуць быць здаволены. Праўленьне Ўн-ту заўсёды падтрымлівала самую цесную сувязь з студэнцкімі арганізацыямі. Таксама і прафэсары

# С К Л А Д

**студэнтаў Беларускага Дзяржаўнага Ўнівэрсытэту на 15 кастрычніка 1927 г.
(ня ўключаючы студэнтаў Рабфаку).**

| ФАКУЛЬТЭТ | Сацыяльны склад | | | | | Нацыянальны склад | | | | | | Партыйны склад | | | | Па полу | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Раб. | Сял. | Служ. | Інш. | Усяго | Бел. | Яўр. | Рас. | Пал. | Інш. | Усяго | КПБ | КСМ | Бесп. | Усяго | Муж. | Жан. | Усяго |
| Мэдыцынскі . | 137 | 156 | 307 | 108 | 708 | 338 | 311 | 45 | 3 | 11 | 708 | 54 | 97 | 557 | 708 | 420 | 288 | 708 |
| Пэдагагічны . | 161 | 524 | 467 | 164 | 1316 | 815 | 391 | 61 | 23 | 26 | 316 | 119 | 252 | 945 | 316 | 772 | 544 | 1316 |
| Праўгас . . | 105 | 176 | 321 | 46 | 648 | 295 | 301 | 28 | 13 | 11 | 648 | 181 | 171 | 296 | 648 | 494 | 154 | 648 |
| Усяго па Ў-ту. | 403 | 856 | 1095 | 318 | 2672 | 1448 | 1003 | 134 | 39 | 48 | 2672 | 354 | 520 | 1798 | 2672 | 1686 | 986 | 2672 |
| | 15% | 32% | 41% | 12% | | 54% | 37,5% | 5% | 1,5% | 2% | | 13% | 19% | 68% | | 63% | 37% | |

БДУ вялі кантактавую працу з студэнцкімі арганізацыямі. Прадстаўнік Выканбюро зьяўляўся сталым сябром Праўленьня БДУ, акрамя спэцыяльнага прадстаўніка ад імя студэнцтва. Прафэсары і выкладчыкі Ўнівэрсытэту прымалі ўдзел у розных студэнцкіх арганізацыях, сярод якіх Краязнаўчае Таварыства займае вельмі важнае месца. Дзякуючы такой палітыцы Праўленьня, у працягу 6 год былі ўтвораны нармальныя адносіны да студэнцтва і іх арганізацый, і на гэтым груньце ня было ніякіх непаразуменьняў. Кожны год, калі адбываліся студэнцкія профэсыйныя канфэрэнцыі, Праўленьне Ўн-ту выступала з дакладамі на апошніх, і гэтым самым давала мажлівасьць прадстаўнікам студэнцтва выказаць свае думкі адносна працы Праўленьня і становішча Ўн-ту. Праўленьне лічыла правільнай такую палітыку. Дзякуючы гэтаму студэнцкія масы былі ў курсе ўсіх мерапрыемстваў Праўленьня, рэалізацыя якіх ня выклікала ніякіх перашкод. Аўтарытэтны голас студэнцкіх арганізацый быў зусім дастатковы, каб студэнцкія масы прынялі гэтыя пастановы і ўводзілі іх у жыцьцё.

У першыя гады існаваньня Ўнівэрсытэту, калі агульныя ўмовы жыцьця Ўнівэрсытэту былі вельмі цяжкія, пасьпяховасьць студэнцтва была ня вельмі высокая. Для пераходу з курсу на курс была прынята сыстэма „мінімум", як у іншых Унівэрсытэтах, але гэта сыстэма, трэба адзначыць, мала садзейнічала пасьпяховасьці студэнтаў. Праўленьне Ўнівэрсытэту знаходзіла неабходным падтрымліваць гэтую сыстэму „мінімум," з прычыны таго, што Ўнівэрсытэт ня меў шмат падручнікаў, ня меў добра абсталяваных лябараторый і, такім чынам, студэнцтва ня мела мажлівасьці так працаваць, каб можна было прад'яўляць студэнцтву найбольш высокія патрабаваньні. Толькі тады, калі палепшылася абсталяваньне Ўн-ту, калі зьявілася мажлівасьць адчыніць габінэты і лябараторыі, і забясьпечыць іх усім неабходным, можна было стаць на шлях павялічэньня акадэмічнай пасьпяховасьці. Праўленьне Ўн-ту прынцыпова перайшло на шлях „максымуму". Ужо ў першы год яго ўвядзеньня, гэта сыстэма „максымум" дала значныя вынікі.

Падлічэньне вынікаў мінулага году паказала вельмі значны крок ў пасьпяховасьці студэнцтва. Звыш 40 проц. студэнтаў кожнага курсу эдалі „максымум". Бязумоўна, гэта пасьпяховасьць залежыць гэтак сама і ад лепшай падрыхтоўкі студэнцтва. Усё гэта сьведчыць аб тым, што заняткі ва Ўнівэрсытэце сталі ісьці нармальным шляхам, і што ў наступныя гады Унівэрсытэцкае жыцьцё стане канчаткова нармальным.

### 11. Факультэт права і гаспадаркі.

З пачатку існаваньня Ўнівэрсытэту быў адчынены Факультэт Грамадзкіх Навук, які не адказваў свайму прызначэньню і быў зачынены. Потым быў адчынены Факультэт права і гаспадаркі, які стаў працаваць, пачынаючы з 1925-26 акад. году, у складзе 2-х аддзяленьняў—Эканамічнага і Прававога. Кіруючым органам Факультэту Грамадзкіх Навук, а потым Факультэту Права і Гаспадаркі зьяўляўся Дэканат і Савет Факультэту. У 1921-22 акад. годзе Дэканам быў У. М. Ігнатоўскі, намесьнікам—С. Я. Вальфсон, сэкратаром—А. Н. Вазьнясенскі. Калі Факультэт Грамадскіх Навук быў выдзелен у Пэдагагічны факультэт, дык склад Дэканату ў 1922/23 акад. годзе быў наступны: Дэкан—праф. С. З. Кацэнбоген, Нам. Дэкана—С. Я. Вальфсон сэкратар—А. І. Барычэўскі. Такі склад Дэканату заставаўся без

усякіх зьмен пакуль функцыяніраваў факультэт Грамадзкіх Навук. Акрамя гэтага, ў склад Дэканату ўваходзіў Нар. Кам. Юстыцыі т. ГЭТНЭР.

З адчыненьнем Факултэту Права і гаспадаркі Дэканам быў прызначаны С. Я. ВАЛЬФСОН, а Сэкратаром—студэнт ПРАКОПЧЫК. У чэрвені м-цы 1926 году адбыліся перавыбары Дэканату. Дэканам застаўся С. Я. ВАЛЬФСОН, Сэкретаром—студэнт КУБАН і сябром Дэканату—Нарком Юстыцыі—т. СЭГАЛЬ. У кастрычніку 1927 году адбыліся перавыбары, згодна якім Дэканам быў абраны—С. Я. ВАЛЬФСОН, Нам. Дэкана—Нар. Ком. Юстыцыі т. СЭГАЛЬ і прадстаўніком ад студэнцтва—т. КУБАН. Пасяджэньні Дэканату адбываліся вельмі рэгулярна, і на іх разглядаліся ўсе бягучыя пытаньні. Асаблівую ўвагу зьвяртаў Дэканат на распрацоўку навучальных плянаў, на разгляд кандытатур прафэсароў, выкладчыкаў і асыстэнтаў, на арганізацыю габінэтаў і лябараторый. Саветы факультэту, а потым аб'яднаныя пасяджэньні Прадметных Камісій адбываліся ў залежнасьці ад розных спраў. Як агульнае правіла, Дэканат Факультэту знаёміў Савет Факультэту з агульнай працай на Факультэце, з яго бягучымі патрэбамі. Навучальныя пляны таксама разглядаліся і зацьвярджаліся на такіх агульных сходах. Прымаючы пад увагу агульную нацыянальную палітыку, Дэканат Факультэту Права і Гаспадаркі прымаў адпаведныя мерапрыемствы да таго, каб перавесьці цэлы шэраг прадметаў на беларускую мову. У мэтах забясьпячэньня Факультэту Права і Гаспадаркі навуковымі працаўнікамі, у першы год існаваньня Факультэту Права і Гаспадаркі, Дэканат залічыў ў якасьці аспіранта К. М. ТАЎСТАЛЕС па кафэдры гісторыі рускага і літоўска—беларускага права, ня гледзячы на тое, што яна скончыла Юрыдычны факультэт Ленінградскага Ўнівэрсытэту.

Пры распрацоўцы навучальных плянаў Дэканат выказаўся з 4 гады, пры ўмове, каб усе лекцыі і практычныя заняткі былі скончаны ў працягу 3$^1/_2$ год, апошніх поўгода былі прысьвечаны абароне дыплёмнай працы.

Каб больш падрыхтаваць студэнтаў да практычнай працы навучальныя пляны былі так складзены, што ў іх займае важнае месца абавязковая практыка ў адпаведных установах, як судовых, гэтак сама і гаспадарчых. Дэканат факультэту не знайшоў мажлівым падзяліць юрыдычнае аддзяленьне на цыклы, але. Эканамічнае аддзяленьне, у мэтах большай спэцыялізацыі, было падзелена на цыклы: Адміністрацыйна—Прамысловы, Коопэрацыйны і Банкава—Фінансавы. Такое дзяленьне на цыклы, вядома, дасьць магчымасьць студэнтам больш практычна падрыхтавацца. Пытаньне аб мэтадах выкладаньня, таксама зьвяртала на сябе ўвагу з боку Дэканату. Прызнаючы неабходным лекцыйны на сэмінарскі мэтад выкладаньня, Дэканат Фак. Права і Гаспадаркі перавёў асобныя прадметы на лябараторна-групавы мэтад, і гэты перавод даў свае вынікі. Што датычыцца да парадку заняткаў, дык, як агульнае правіла, апошнія яліся раніцай, але, у відзе выключэньня, заняткі на 3-ім курсе адбываліся ўвечары.

Склад выкладчыкаў Факультэту Грам, Навук быў наступны: С. Я. ВАЛЬФСОН займаў кафэдру дыалектычнага матэрыялізму, ГРЭДЫНГЕР М. О. -кафэдру грамадзянскага права і грамадз. працэсу, ГУРВІЧ Г. С. кафэдру грамадз. права; (загадваў кафэдру ў 1922 г.); ГАРБУНОЎ А. В. быў прафэсарам адміністрацыйнага права ДУРДЗЕНЕЎСКІ У. М. займаў кафэд-

ру дзяржаўнага права; (пакінуў кафэдру з зачыненьнем Факультэту Грамадзкіх Навук); Дзякоў В. Н. займаў кафэдру ўсеагульнай гісторыі; пакінуў кафэдру ў 1923 г. Праф. М. В. Даўнар-Запольскі займаў кафэдру гісторыі народнай гаспадаркі Расіі на Факультэце Права і Гаспадркі; пакінуў кафэдру за пераводам у Маскву. Жарынаў Д. А. займаў кафэдру расійскай гісторыі на Факультэце Грамадзкіх Навук; Каплан Г. А. займае кафэдру тавараазнаўства; Краўчэнка Н. Н. займаў кафэдру міжнароднага права; Кнорын В. Г. займаў кафэдру эканамічнай палітыкі, якую пакінаў за пераездам у Маскву; Кацэнбоген С. З. займаў кафэдру сацыолёгіі, якую пакінуў за пераездам у Саратаў; Крыльцоў І. І.—кафэдру дзяржаўнага права; Маркаў Г. М. займаў кафэдру грамадзянскага права да 1923 г. (быў забіты на масковскайдачы бандытамі); Перцаў У. М.—займаў кафэдру гісторыі народнай гаспадаркі Заходняе Эўропы; Лубны-Герцык Л. І. займаў кафэдру статыстыкі—пакінуў Унівэрсытэт, дзякуючы зачыненьню Факультэту Грамадзкіх Навук; Пічэта У. І. кафэдру народнай гаспадаркі Расіі і Беларусі, а таксама гісторыі расійскага і літоўскага-беларускага права; Щыраяў В. М. займае кафэдру крымінальнага права і крымінальнага працэсу; Чрэдзін Б. В.—кафэдру гісторыі інстытутаў прыватнага права; Манаў—кафэдру бухгальтэрыі і рахунказнаўства і Парменаў С.—кафэдру прыкладной эканомікі. Дацэнтамі на факультэце былі наступныя асобы: Арцымовіч А. М. па кафэдры статыстыкі, Герцык І. Я.—па кафэдры палітычнай эканоміі, Гохман С.М.— па кафэдры агульнай тэорыі права, Красінскі М. Ф. —па кафэдры беларускай мовы, Мейчык Д. М.— па кафэдры гісторыі права, Якуніп В. В.—па кафэдры рахункаводзства і бухгальтэрыі, Валадковіч — па тэй-жа кафэдры, Герчыкаў І. В.—дацэнт па кафэдры гісторыі народнай гаспадаркі Заходняй Эўропы. Асыстэнтамі былі: Гаўзэ Ф. І па кафэдры грамадзянскага права, Гуткоўскі М. Н.—па кафэдры агульнай тэорыі права і адміністрацыйнага права, Канаплін Н. А.—па кафэдры крымінальнага права да 1926 году, Сідляроўскі Л. Г.—па кафэдры крымінальнага працэсу, пакінуў асыстэнтуру з зачыненьнем Факультэту Грамадзкіх Навук, Napoў С. С.—асыстэнт па кафэдры грамадзянскага права, пакінуў асыстэнтуру з зачыненьнем Факультэту Грамадзянскіх Навук, Рубашева Л. М.—асыс. па кафэдры крымінальнага права.

З утварэньнем факультэту Грамадзкіх Навук, былі арганізаваны Прадметныя Камісіі: Эканамічная і Прававая. Гэтыя Камісіі засталіся і на Факультэце Права і Гаспадркі. Прадметныя Камісіі займалі важнае месца ў жыцьці факультэту. Прадметныя Камісіі разглядалі і абгаварвалі навучальныя праграмы, прадстаўленыя Факультэту; разглядалі навучальныя пляны, абгаварвалі кандыдатуры на новыя кафэдры, займаліся пытаньнямі аб мэтадах выкладаньня, абгаварвалі тэмы сэмінарскіх заняткаў і мэтады іх вядзеньня, разглядалі справаздачы выкладчыкаў аб выкладаньні дысцыплін і аб вядзеньні імі сэмінарскіх заняткаў, абгаварвалі тэмы для дыплёмных прац, а таксама абароны дыплёмных прац.

Гэткія-жа мэты ставілі сабе Камісіі і на Факультэце Права і Гаспадаркі. У склад Прадметных Камісій уваходзілі ўсе выкладчыкі адпаведных дысцыплін і прадстаўнікі студэнцтва.

З адчыненьнем Факультэту Грамадзкіх Навук былі арганізаваны габінэты Права і Эканомікі, а потым быў арганізаваны габінэт ста-

тыстыкі. З адчыненьнем Факультэту Права і Гаспадаркі быў адчынены габінэт Марксызму і Ленінізму, а габінэты Права і Эканомікі былі злучаны ў адзін габінэт. Акрамя гэтага быў адчынены габінэт Таваразнаўства і габінэт па вывучэньню злачынства і злачынца. Трэба адзначыць, што ў сучасны момант габінэты забясьпечваюцца ўсім неабходным. Маецца на ўвазе адчыненьне габінэту прыкладной эканомікі і рахункаводзтва.

Факультэт Грамадзкіх Навук даў 2 выпускі студэнтаў. 20 лютага 1925 году адбыўся першы выпуск. У чэрвені 1926 году адбыўся другі выпуск студэнтаў. Гэтыя першыя эканамістыя і юрыстыя ў сучасны момант працуюць з вялікім посьпехам у розных установах.

Студэнты, якія скончылі, атрымалі часовыя пасьведчаньні, якія яны былі павінны зьмяніць на дыплём пасьля абароны дыплёмнай працы. Як агульнае правіла, кожная дыплёмная праца разглядалася 2-мя выкладчыкамі. Водзыў аб дыплёмнай працы чытаўся ў Прадметнай Камісіі, і калі дыплёмная праца была прызнана здавальняючай, дык яна дапушчалася да абароны ў публічным пасяджэньні Прадметнай Камісіі.

Тэмы дыплёмных прац былі наступныя: 1) „Сельская гаспадарка і фабрычна-завадзкая прамысловасьць С.С.С.Р. у іх рыначных узаёмаадносінах“; 2) “Мэты пакараньня“; 3) “Акцыянэрныя Таварыствы з удзелам дзяржаўнага капіталу“; 4) “Пенітэнцыярныя ўстановы“. 5) „Папраўна Трудавы Кодэкс С.С.С.Р.;“ 6) “Вучэньне аб альтэрнатыўных абавязках;“ 7) “Фактары злачынства, іх віды і ўзаемаадносіны;“ 8) „Іскі аб прызнаньні і заявы аб установоўцы фактаў;“ 9) „Марксыцкая тэорыя аб імпэрыялізме“; 10) „Басфора-Дарданэльскае пытаньне і яго міжнароднае прававое становішча“; 11) „Сыстэма кары, згодна Улажэньня 1649 г. і заканадаўства Пётры I.“, 12) „Прамысловасьць на Беларусі і пэрспэктывы яе разьвіцьця“.

## Пэдагагічны факультэт.

Пэдагагічны факультэт быў утвораны з 2-х аддзяленьняў факультэту Грамадзянскіх Навук. Да гуманітарных аддзяленьняў былі прыстасаваны аддзяленьні Прыродазнаўча-Гістарычнае і Фізыка-Матэматычнае. Пляны Пэдагагічнага факультэту разглядаліся некалькі разоў. Адбываліся частыя зьмены. Да канца 5-га году існаваньня Ун-ту Пэдагогічны факультэт атрымаў наступную канструкцыю: 1-шы курс агульны. Дзяленьне па спэцыяльнасьцям пачынаецца з 2-га курсу, пры наліччы аддзяленьняў: Сацыяльна-Гістарычнага, якое падзяляецца на 3 сэкцыі,—Беларускую, Польскую і Яўрэйскую, і Літаратурна-Лінгвістычнага, з такімі-ж 3-мя сэкцыямі. На аддзяленьні Фізыка-Матэматычным і Прыродазнаўча-Гістарычным, таксама былі праведзены прызнакі належнасьці студэнтаў да аднэй з нацыянальных сэкцый.

Кіруючым органам Пэдфаку быў Дэканат і Савет Факультэту. У 1922-23 акад. годзе склад Дэканату быў гэтакі: Дэкан—праф У. М. ІГНАТОЎСКІ; Нам. Дэкана—Н. М. НІКОЛЬСКІ і сэкратар—А. Н. ВАЗЬНЯСЕНСКІ; Загадчык Прыродазнаўчага і Фізыка-Матэматычнага аддзяленьня—Я. С. ПЯТОСІН. У 1923-24 акад. годзе—Нар. Кам. Асьветы, праф. У. М. ІГНАТОЎСКІ ня меў магчымасьці прымаць пасаду Дэкана. Дэканам быў зацьверджаны праф. Н. М. НІКОЛЬСКІ, Намесьнікам Дэкану—А. К. УСЬПЕНСКІ і Сэкратаром—А. Н. ВАЗЬНЯСЕНСКІ. У 1924-25 акад. годзе Дэканат складаўся



Галоўны корпус Пэдагагічнага Факультэту.



Фізычны Інстытут.

БИБЛИОТЕ
1684

з Дэкана—праф. НІКОЛЬСКАГА. Нам. Дэкана—А. К. УСЬПЕНСКАГА і Сэкратара—студэнта ГІМЭЛЬФАРБА. Акрамя гэтага яшчэ былі сэкратары аддзяленьняў: А. Н. ВАЗЬНЯСЕНСКІ і Н. М. БЛЮДУХО.

У чэрвені 1925 году адбыліся перавыбары Дэканату. Пасады сэкратароў былі зьнішчаны. Дэканам і Загадчыкам засталіся тыя-ж асобы, але Сэкратаром быў абраны студэнт ПУТНІН. У чэрвені 1926 году новыя перавыбары Дэканату далі наступныя вынікі: Дэканам быў абраны праф. М. Н. ПІОТУХОВІЧ, Намесьнікам — А. К. УСЬПЕНСКІ і Сэкратаром—студэнт ПУТНІН. Акрамя гэтага, былі ўтвораны Загадчыкі аддзяленьняў, якія ўваходзілі ў склад Дэканату, у тым ліку Н. М. НІКОЛЬСКІ— загадчык Сацыяльна-Гістарычнага адзяленьня, І. І. ЗАМОЦІН—загадчык Літаратурна - Лінгвістычнага аддзяленьня, Н. М. БЛЮДУХО—Загадчык Прыродазнаўчага аддзяленьня і М. Б. ВЭЙНГЕР—Загадчык Яўрэйскай сэкцыі.

Дзякуючы рацыяналізацыі ў арганізацыі Дэканату і скарачэньню штатаў Дэканату, адбыліся некаторыя зьмены ў складзе Дэканату. У пачатку кастрычніка адбыліся перавыбары Дэканату, якія далі наступныя вынікі: Дэканам быў абраны М. Н. ПІОТУХОВІЧ—ён-жа Загадчык Літаратурна-Лінгвістычнага аддзяленьня; Намесьнікам—А. К. УСЬПЕНСКІ—ён-жа Загадчык Фізыка-Матэматычнага аддзяленьня; П. Я. ПАНКЕВІЧ—Загадчык Сацыяльна-Гістарычным аддзяленьням; праф. М. Н. ГАЙДУКОЎ—Загадчык Прыродазнаўча-Гістарычным аддзяленьнем і М. Б. ВЭЙНГЕР—Загадчык Яўрэйскай сэкцыяй.

Прадметамі пасяджэньня Дэканату былі: навучальныя пляны і мэтодычныя пытаньні, разгледжваньне кандыдатур прафэсароў, выкладчыкаў і асыстэнтаў, арганізацыйныя пытаньні, арганізацыйна-тэхнічныя пытаньні, узаемаадносіны са студэнцтвам, разгледжваньне пратаколаў Прадметных Камісій, розныя асобныя пытаньні і бягучыя справы, вучот студэнцкай працы, пытаньне аб беларусізацыі. Савет Факультэту, а таксама аб'яднаныя пасяджэньні Прадметных Камісій разглядалі ўсе тыя пытаньні, якія Дэканат лічыў неабходным паставіць на абгаварэньне.

Пытаньне аб мэтадах выкладаньня і беларусізацыі зьвяртала шмат увагі з боку Дэканату Пэдфаку. Выкладаньне прадметаў па мэтаду лекцыйнаму і сэмінарскаму ня цалкам здавальняла Дэканат. Дэканат лічыў неабходным шырокае прымяненьне лябараторна-групавога мэтаду, які быў уведзены ў 1925-26 акад. годзе. Аднак, ня ўсе заняткі па лябараторнаму мэтаду далі добрыя вынікі. З прычыны гэтага Праўленьню Ўн-ту прышлося скараціць агульную колькасьць прадметаў, якія выкладаліся па лябараторна-групавому мэтаду і пакінуць толькі самыя неабходныя. Адначасна Дэканат павялічыў агульную колькасьць абавязковых сэмінарскіх заняткаў. Дэканат Пэдфаку зьвярнуў асаблівую ўвагу на беларусізацыю Факультэту. Пачынаючы з 1923-24 году беларусізацыя на Пэдфаку ішла даволі хуткім тэмпам, і ў сучасны момант 65 проц. усіх гадзін, згодна навучальнаму пляну, выкладаецца на беларускай мове. У працягу 6 год Дэканат кожны год ставіў пытаньне аб навучальных плянах. Дэканат вёў рашучую барацьбу з шматпрадметнасьцю, якая вельмі дрэнна адбівалася на занятках студэнтаў. Канчаткова навучальныя пляны былі перагледжаны ў 1926-27 акад. годзе. Шматпрадметнасьць была ліквідавана, і студэнты атрымалі больш вольнага часу для сваіх самастойных заняткаў. Заняткі, як агульнае пра-

віла, вяліся раніцаю. Самыя вучэбныя пляны так былі складзены, каб элемэнт краязнаўства і грамадазнаўства займаў першае месца. У працягу 6 год наступныя асобы займалі кафэдры на Пэдфаку:

АНДРЭЯЎ Н. Н.—кафэдру фізыкі; БУЗУК П. А.—каф. агульнага моваэнаўства і гісторыі беларускай мовы; БЭРКЕНГЕЙМ Б. М.—кафэдру неарганічнай, аналітычнай і фізычнай хэміі; ВАЛЬФСОН С. Я. —кафэдру дыялектычнага матар'ялізму; ВАСІЛЕЙСКІ С. М.—кафэдру пэдалёгіі; ГАЙДУКОЎ Н. М.—кафэдру батанікі; ЖАРЫНАЎ Д. А.—кафэдру расійскай гісторыі; ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ В. М —кафэдру гісторыі Беларусі; ЗАМОЦІН І. І.—кафэдру расійскай літаратуры; ЕЎЛАХАЎ А. М.—кафэдру заходня-эўропейскай літаратуры; ІВАНОЎСКІ В. Н.—кафэдру псыхолёгіі; КАНЧАЛОЎСКІ Д. М.—кафэдру старажытнай гісторыі; ІГНАТОЎСКІ У. М.—кафэдру новай гісторыі Беларусі; ЛЯСКОЎСКІ С. А.—кафэдру агульнай гісторыі; ЛЯВОНАЎ В. А.—прафэсар па кафэдры Дзіцячых Хвароб—выкладаў курс анатоміі і фізыолёгіі чалавека; МІХАЙЛОЎСКІ А. А.—кафэдру астраноміі; НІКОЛЬСКІ Н. М.—кафэдру гісторыі рэлігіі і гісторыі Ўсходу; ПІЧЭТА У. І.—кафэдру гісторыі народнай гаспадаркі Беларусі; ПЕРЦАЎ В. Н.—кафэдру агульнай гісторыі; ПРЫЛЯЖАЯЎ Н. А.—кафэдру арганічнай хэміі; РОЗАНАЎ Л. П.—прафэсар па кафэдры фізыолёгіі—выкладаў анатомію і фізыолёгію чалавека; СІРОЦІН Е. Е. —кафэдру фізыкі; ТУРУК Ф. Ф.—кафэдру беларускай гісторыі; САЛАЎЕЎ І. М.—кафэдру псыхолёгіі; ШЧАПОЦЬЦЕЎ А. С.—кафэдру параўнальнай анатоміі; ЯНЧУК Н. А.—каф. старай беларускай пісьменнасьці; ЯСІНСКІ А. Н.—каф. агульнай гісторыі.

Дацэнцкія пасады займалі: АРЦЫМОВІЧ А. М. — па кафэдры статыстыкі; АЗЬУКІН Н. В.—эканамічная гэографія; БАРЫЧЭЎСКІ Е. І.—гісторыя расійскай літаратуры; БЛЮДУХО Н. Т.—гэолёгія і мінэролёгія—зацьверджаны прафэсарам; БАГДАНОВІЧ А. В.—беларуская мова; ВАЗЬНЯСЕНСКІ А. Н.—гісторыя расійскай літаратуры —зацьверджаны прафэсарам; ВЭЙНГЕР М. Б.—яўрэйская мова; ГЕРЦЫК І. Я.—палітычная эканомія; ГОЛЬДБЭРГ І. І.—яўрэйская мова; ДЫДЫРКА У. К.—вышэйшая матэматыка; ДРУШЧЫЦ В. Д.—беларуская гісторыя—зацьверджаны прафэсарам; ДАЎГЯЛА Д. І.—гісторыя Беларусі: КРАСКОЎСКІ І. І.—беларуская гісторыя; ЛЁСІК Я. Ю.—беларуская мова; ОЙСЛЕНДЭР Н. Е.—яўрэйская літаратура; ПЯТОСІН Я. С.—вышэйшая матэматыка; ПІАТУХОВІЧ М. Н.—новая беларуская літаратура; ПАНКЕВІЧ П. Я.—пэдагогіка; РАЎРЭБА І.—сэміцкая філёлёгія; СОСІС І.—гісторыя яўрэяў—зацьверджаны прафэсарам; СЕРБАЎ І. А.—этнаграфія; СКАНДРАКОЎ С. В.—сельскагаспадарчая эканоміка—пакінуў факультэт; САВІЧ А. А.—дацэнт па кафэдры расійскай гісторыі; СЫРКІН М. Г.—гісторыя мастацтва; СЕРБЕНТА В. А.—найнавейшая гісторыя; ФЯДЗЮШЫН А.—зоолёгія —зацьверджаны прафэсарам; ШАЛАЎРАЎ Н. В.—мэтодыка фізыкі; ШАРАЎ Н. В.—расійская літаратура—пакінуў Ун-т; ШЧАКАЦІХІН Н. Н.—гісторыя мастацтва.

Асыстэнцкія пасады займалі наступныя асобы: АЛЯКСАНДРАЎ Г. С.—мэтодыка грамадазнаўства; АКІМАВА О. Д.—па кафэдры батанікі; БЭРКЕНГЕЙМ Т. І.—па кафэдры агульнай хэміі; БЫХАЎСКІ Б. Э.—па каф. дыялектычнага матар'ялізу—зацьверджаны дацэнтам; ВОЎК-ЛЕВАНОВІЧ І. С.—па каф. беларускай мовы—зацьверджаны дацэнтам; ВЯРШУК В.—па каф. арганічнай хэміі; ГУСЯВА С. А.—па кафэдры параўнальнай анатоміі; ГРАБОЎСКІ П. З.—па каф. гэолёгіі; ГРАМЫКА М. А.—па каф. гэолёгіі і мінэролёгіі; зацьверджаны

дацэнтам. ГАЙВАРОЎСКІ А. А.—па каф. пэдолёгіі; ЯРМОЛЕНКА Н. Ф.—кафэдра аналітычная хэміі; ЗЬБІТКОЎСКІ Н. А.—кафэдра батанікі; ЗНАМЕНСКАЯ М. П.—кафэдра агульнай хэміі (пакінула Ун-т); ВІРКЕВІЧ М. Н.—кафэдра статыстыкі (пакінуў Ун-т); КРУТАЛЕВІЧ А. П.—вышэйшая матэматыка, зацьверджаны дацэнтам; ЛЯЎКОВІЧ В. Л.—кафэдра вышэйшай матэматыкі; ЛЫСОВА М. Д.—кафэдра палітычнай эканоміі (пакінула Ун-т); МАКАРЭЎСКІ Н. І.—кафэдра матэоролёгіі; ПЕРАБІЛА В. В.—кафэдра пэдагогікі; ПІНКЕВІЧ П. О.—кафэдра мэтодыкі грамадазнаўства; ПОЎЗІК М. М.—кафэдра зоолёгіі (пакінула Ун-т); РОЗЕНОЕР-ВАЛЬФСОН Р. А.—кафэдра пэдолёгіі; РУДНІЦКІ Л.- кафэдра беларускай мовы; РАКАЎ Я. Г.—каф. прафруху і прафпрактыкум; РЫВЕС С. М.—каф. пэдагогікі; СЬНЯТКОЎ Е. В.—каф. фізыкі, зацьверджан дацэнтам; СІРОЧЫНСКІ В. Н. — па каф. мэтодыкі фізыкі, зацьверджаны дацэнтам; ТЭПІН В. П.—кафэдра мэтодыка—літаратуры; ЦІР Л. З.—асыст. па кафэдры арганічнай хэміі; САГАЛОВІЧ Г.—кафэдра мэтодыкі матэматыкі; УСЬПЕНСКІ А. К.—кафэдра фізыкі—зацьверджаны дацэнтам; ЦЬВЯТКОЎ Л. Н.—кафэдра параўнальнага моваанаўства, пакінуў Ун-т; ЦЭТЭРМАН Т. О.—арганічная і аналітычная хэмія, пакінула Ун-т; ШЧАПОЦЬЦЕЎ А. Ф.—кафэдра зоолёгіі—пакінуў Ун-т; ШАХНІН В. А.—кафэдра палітычнай эканоміі, пакінуў Ун-т; БЛОХ Г. С.—выкладчык ангельскай мовы; ГЕЛЬТМАН Я. Г.—выкл. польскай мовы; БУРЖУА Л. Е.—выкл. французкай мовы; ЗЭМЕЛЬ Г. Э.- выкл. нямецкай мовы; ПЭЦОЛЬД Г. Э.—выкл. нямецкай мовы; ПАЛАНОЎСКАЯ К. О.—выкл. французскай мовы; СЭГАЛЬ Э. М.—выкл. нямецкай мовы--пакінула Ун-т; СЫРКІНА Л. Я.—выкл. нямецкай мовы.

Прадметныя Камісіі на Пэдагагічным факультэце існавалі наступныя:

1) Гістарычная,
2) Літаратурна-Мовазнаўчая,
3) Прыродазнаўчая,
4) Фізыка-Матэматычная,
5) Мэтодыка-Пэдагагічная,
6) Марксызму і Ленінізму,
7) Па замежных мовах.

Прадметныя Камісіі зьбіраліся ў працягу кожнага году, у залежнасьці ад патрэб і разглядалі тыя пытаньні, якія ставіла бягучае акадэмічнае жыцьцё.

На Пэдфаку існавалі наступныя навукова-дапаможныя ўстановы:

1) Інстытут Арганічнай і Тэхнічнай Хэміі — Дырэкт. праф. ПРЫЛЯЖАЯУ.
2) Інстытут Неарганічнай і Фізычнай Хэміі — БЭРКЕНГЕЙМ Б. М.
3) Інстытут Батанікі—Дырэктар праф. Н. М. ГАЙДУКОЎ.
4) Інстытут Фізыкі—Дырэктар праф. С. Е. СІРОЦІН.
5) Інстытут Зоолёгіі—праф. А. В. ФЯДЗЮШЫН.
6) Інстытут Параўнальнай Анатоміі і Эмбрыолёгіі — Дырэктар праф. А. С. ШЧАПОЦЬЦЕЎ.
7) Інстытут Мінэролёгіі і Гэолёгіі — праф. Н. Ф. БЛЮДУХО.
8) Габінэт пры кафэдры беларускай гісторыі — праф. В. Д. ДРУШЧЫЦ.
9) Габінэт пры каф. расійскай гісторыі—заг. праф. А. ЖАРЫНАЎ.
10) Габінэт агульнай гісторыі—Заг. праф. В. Н. ПЕРЦАЎ.

11) Габінэт беларускай мовы і літаратуры—заг. праф. М. ПІАТУХОВІЧ.

12) Габінэт расійскай і Заходня-Эўрап. літаратуры, мовы і мастацтва—загадчык праф. А. Н. ВАЗЬНЯСЕНСКІ.

13) Габінэт Краязнаўства—А. А. СМОЛІЧ.

14) Габінэт псыхолёгіі і пэдагогікі—Загадчык праф. С. М. ВАСІЛЕУСКІ.

15) Габінэт Яўрэязнаўства—загад. М. Б. ВЭЙНГЕР.

16) Габінэт матэматыкі і фізыкі—дац. Я. С. ПЯТОСІН.

Рост Пэдагагічнага факультэту, выпускі стдэнтаў Пэдфаку прымусілі Праўленьне Унівэрсытэту і Дэканат Пэдфаку пашырыць агульную дзейнасьць Пэдфаку. У працягу 5 год Пэдфак быў заняты арганізацыйнай і канструкцыйнай працай. Да пачатку пятога году інстытуты і лябараторыі, габінэты былі пашыраны, і Праўленьне Унівэрсытэту лічыла неабходным пашырыць дзейнасьць Пэдфаку за межамі Ун-ту. Праўленьне і Дэканат лічылі неабходным арганізацыю такога роду нарад выкладчыкаў пры Пэдагагічным факультэце, якія далі-б мажлівасьць абгаварыць цэлы шэраг пытаньняў мэтодычнага характару, азнаёміць з бягучай навуковай, навучальнай і мэтодычнай літаратурай. Па думцы Праўленьня і Дэканату, агульнае кіраўніцтва мэтодыка-пэдагагічнай работай павінна ляжаць на Дэканаце Пэдфаку. Гэты погляд быў ухвалены Галоўпрафасьветы, які даручыў арганізаваць Праўленьню цэлы шэраг Усебеларускіх канфэрэнцый пры Пэдагагічным факультэце. У працягу 2 год былі арганізаваны наступныя канфэрэнцыі: Фізыка-Матэматычная, Прыродазнаўчая Гістарычная, Літаратуры і Мовы і Грамадазнаўства. На канфэрэнцыях прысутнічалі выкладчыкі адпаведных прадметаў. У часы канфэрэнцый былі арганізаваны выстаўкі розных мэтодычных падручнікаў, а таксама навучальных прылад, неабходных для выкладчыка. Гэтыя канфэрэнцыі мелі вялікі посьпех і сьведчылі аб тым, што палітыка Праўленьня Ун-ту была вельмі правільнай.

Пачынаючы з 1925 году, Пэдфак стаў выпускаць скончыўшых студэнтаў, якія былі павінны пачаць сваю працу ў розных школах Беларусі. Кожны выпуск сьвяткаваўся ўрачыстым пасяджэньнем, якое было арганізавана Праўленьнем Ун-ту, Дэканатам, на якім прысутнічалі прадстаўнікі Ураду, Наркамасьветы, прафэсыйных і партыйных арганізацый. Усяго Пэдфак даў 3 выпускі, і такім чынам, даў беларускім школам цэлы шераг новых выкладчыкаў, добра падрыхтаваных з боку тэорэтычнага і з боку практычнага.

### Мэдыцынскі факультэт.

Мэдыцынскі факультэт быў адчынены ў восень 1921 году. Вялікі наплыў студэнтаў сьведчыў аб тым, што адчыненьне Мэдыцынскага факультэту было мэтазгодным. Першы год існаваньня Мэдыцынскага факультэту быў годам вельмі цяжкім, дзякуючы адсутнасьці сродкаў. Голад на Паволожжы ў значнай меры затрымаў прыток сродкаў, як з цэнтру, гэтак сама і на месцы, што было павінна мець уплыў на абсталяваньне 1 га курсу. У канцы першага навучальнага году, Праўленьне Ун-ту прыняла пастанову, каб адначасна з 2-ім курсам адчыніць 3-ці курс і, такім чынам, палажыць пачатак арганізацыйнай працы па абсталяваньню клінік. Органы Нар. Кам. Аховы здароўя і Гарздраву пайшлі насустрэч думкам Праўленьня, і для пачатку былі рамантаваны гарадзкія больніцы. Гэтым самым было пакладзена начала будаўніцтву нашых клінік.



Апэрацыйны пакой Факультэцкай хірургічнай клінікі.



Клініка нэрвовых хвароб.

Запрошаныя прафэсары: С.М.МЕЛКІХ —па кафэдры тэрапіі, М. П Сакалоўскі — па кафэдры хірургіі, з вялікай увагай і напружаннасьцю прыняліся за працу па арганізацыі клінік. Трэба сказаць, што гэта напружаная праца дала сталыя вынікі. У далейшым з дапамогай установў адчыняліся іншыя клінікі, і, такім чынам, былі адчынены наступныя клінікі : Скурных Хвароб і Вэнэролёгічная, Дзіцячая, Нэрвовая, Акушорска-Гінэколёгічная, Шпітальная Тэрапэўтычная, Шпітальная Хірургічная, Псыхіятрычная, Факультэцкая Тэрапэўтычная і Факультэцкая Хірургічная. У далейшым Праўленьне Ун-ту знайшло, што назва „Факультэцкая клініка“ і „Шпітальная клініка“, зьяўляюцца ўжо адсталымі і замяніла іх назвамі—„1-ая і 2-ая клініка„. Акрамя гэтага, былі адчынены інстытуты: Экспэрымэнтальнае Гыгіены, Пастэраўскі Інстытут, які знаходзіцца пад кіраўніцтвам Нар. Кам. Аховы Здароўя , Судовай Мэдыцыны, Інсытут Патолёгічнай Анатоміі, Гістолёгічны Інстытут, Інстытут Сацыяльнай Гыгіены, Інстытут Біолёгічнай Хэміі, Фармаколёгіі і Фармацыі.

Для выкладаньня прадметаў прыродазнаўчага характару, а таксама і фізыкі, Мэдыцынскі факультэт карыстаўся навуковымі ўстановамі Пэдфаку.

Праўленьне Ўн-ту было вельмі захоплена запрашаньнем выкладчыкаў на адпаведныя кафэдры. Гэта мэта была вельмі цяжкая, асабліва, ў першы год існаваньня Ўн-ту, калі шмат з запрошаных выкладчыкаў не рашалася пераехаць у Менск на сталае жыцьцё. Аднак, гэтыя перашкоды былі пераможаны. Мэдыцынскі факультэт стаў мець сталы склад выкладчыкаў, які паступова пашыраўся, у залежнасьці ад узросту факультэту.

Органамі кіраваньня факультэту быў Дэканат і Савет факультэтаў. Спачатку Дэканам Мэдфаку быў праф. М. Б. Кроль, які ў 1921 г. быў прызначаны прафэсарам па кафэдры Нэрвовых хвароб. М. Б. Кроль жыў у Маскве, у мэтах падтрыманьня сталага кантакту з выкладчыкамі Масквы, у мэтах запрашэньня апошніх у Менск, а таксама для закупкі неабходнага абсталяваньня для Мэдыцынскага факультэту. Сэкратаром факультэту быў абраны дацэнт А. В. Фядзюшын. У пачатку 1922 году дэканам быў абраны праф. Б. М. Беркенгейм, а М. Б. Кроль застаўся у якасьці дэкана і жыў у Маскве.

У жніўні 1922 году Дэканам быў абраны М. П. Сакалоўскі, а сэкратаром А. В. Фядзюшын. Перавыбары Дэканату 1923 году далі такі склад апошняга: Дэкан—праф. С. М. МЕЛКІХ, сэкратар—праф. Л. П. РОЗАНАЎ, сябра Прэзыдыуму—студэнт С. О. БАРКУСЭВІЧ.

У лістападзе 1924 году адбыліся новыя перавыбары Дэканату. Дэканат складаўся: з Дэкана—праф. М. КРОЛЯ, намесьніка—асыстэнта Е. Л. МАРШАКА і Сэкратара—студэнта БАШКЕВІЧА.

На 1925 год Дэканам быў абраны праф. М. КРОЛЬ, намесьнікам Дэкана—асыстэнт З. К. МАГІЛЕЎЧЫК і сэкратаром—студэнт Я. ШАПІРА.

У чэрвені 1926 году адбыліся новыя перавыбары Дэканату. Дэканам ф-ту быў абраны праф. С. М. РУБАШОЎ, намесьнікам—асыстэнт клінікі Дзіцячых Хвароб К. Ф. ПАРАЎ і сэкратаром—студэнт БАНДАРЭНКА. Праф. М. Б. КРОЛЬ быў абраны загадчыкам Навучальнай часткі.

Выбары, якія адбыліся ў кастрычніку 1927 году, далі наступны склад Дэканату: у якасьці Дэкана быў абраны праф. М. Б. КРОЛЬ, намесьніка і сэкратара—старшы асыстэнт Скурна-Вэнэрычнай клінікі д-р ПРАКАПЧУК і прадстаўніком ад студэнтаў—т. АХРАМОВІЧ.

Работа Дэканату Факультэту была вельмі цяжкая і адказная. Але трэба сказаць, што, дзякуючы энэргіі Дэканату, усе гэтыя перашкоды былі пераможаны і Мэдыцынскі факультэт узрос і стаў вышэйшай навучальнай установай, у якой працавалі вельмі кваліфікаваныя працаўнікі.

Дэканат Мэдыцынскага факультэту некалькі разоў разглядаў вучэбныя пляны, якія ў працягу 5 год мяняліся у залежнасьці ад новых пунктаў погляду на мэты мэдыцынскай адукацыі. Дэканаты Мэдфаку вельмі ўважліва сачылі за працай у гэтым напрамку, якая адбывалася ў Маскве, на Украіне і за межамі.

Перагляд навучальных плянаў, галоўным чынам, датычыўся першых двох курсаў, на якіх быў утвораны некалькі іншы расклад гадзін па тэорэтычных кафэдрах. Практычныя заняткі па клінічных дысцыплінах былі павялічаны. Пры кожнай клініцы быў арганізаваны амбуляторны прыём. Урэшце, Дэканатам былі прыняты мераприемствы, каб студэнты азнаёміліся з асновамі грамадазнаўства, Савецкага права, дыялектычнага матар'ялізму, а таксама з беларускай мовай.

Пытаньне аб мэтах Мэдыцынскага факультэту, таксама было ня раз прадметам абгаварэньня ў Дэканаце. Дэканат лічыў, што мэтаю Мэдыцынскага факультэту зьяўляецца: 1) падрыхтоўка навукова-матар'ялістычна думаючых дактароў, практычных працаўнікоў для абслугоўваньня насельніцтва, як у галінах лекавай, гэтак сама і ў санітарна-прафілактычнай; 2) падрыхтоўка навуковых працаўнікоў у галінах мэдыцыны; 3) навуковая распрацоўка навуковых пытаньняў аховы здароўя і 4) дасьледчая праца ў галінах мэдыцыны

У навучальныя праграмы Мэдыцынскага факультэту ўваходзіла: вывучэньне працэсаў, якія адбываліся ў здаровым і хворым арганізьме, вывучэньне ўсіх фактараў, якія маюць уплыў на хвораснць таго асяродку, які акружае; вывучэньне ўсіх мэтадаў аховы здароўя і барацьбы з шкодлівымі для арганізму фактарамі і азнаямленьне з фактычнымі прыёмамі санітарыі і ўходу за хворымі.

Мэдыцынскі факультэт, які ставіў сваёю мэтаю непасрэднае абслугоўваньне беларускай вёскі, быў павінен устанавіць жывую сувязь як усяго факультэту, так і асобных кафэдр з мэдыцынскімі вучасткамі.

Пытаньне аб мэтадах выкладаньня было прадметам сталай увагі з боку Дэканату. Дэканат шырока паставіў практычныя заняткі, пры гэтым так, што групы студэнтаў былі невялікія, што давала мажлівасьць весьці заняткі з вялікім посьпехам.

Пытаньне аб мэтадах выкладаньня таксама абгаварвалася і ў Прадметных Камісіях.

Першы выпуск студэнтаў паставіў пытаньне аб дзяржаўных экзаменах. Дэканат лічыў неабходным першыя дзяржаўныя экзамены правесьці па шырокаму пляну, з прычыны таго, што першы выпуск студэнтаў працаваў у ня зусім добрых абставінах, і што ён, па сваёй якасьці, быў вельмі стракатым. У далейшым дзяржаўныя экзамены прынялі некалькі іншы характар, з прычыны таго, што скончыўшымі Ун-т зьяўляліся студэнты сталага складу Мэдыцынскага факультэту. Для студэнтаў былі абавязковымі: паталёгічная анатомія, хірургічная і тэрапэўтычная клінікі, з апошніх клінік дзьве па выбару, у залежнасьці ад навуковых інтарэсаў студэнтаў. Акрамя гэтага, студэнты былі павінны трымаць экзамен па грамадазнаўству і беларусазнаўству.

Савет факультэту і агульныя нарады прадметных камісій зьбіраліся Дэканатам для абгаварэньня цэлага шэрагу пытаньняў. Ня гледзячы на тое, што навуковыя інстытуты Мэдыцынскага факультэту ня былі добра абсталяваны, на Мэдыцынскім факультэце вялася вельмі значная навуковая праца. Частка навуковых прац друкавалася ў „Працах Б. Д. У.“ і ў „Беларускай Мэдыцынскай Думцы“. Шмат прац было надрукавана ў розных часопісах, як на тэрыторыі іншых рэспублік, гэтак сама і спэцыяльных выданьнях за межамі, і ўсё-ж, яшчэ цэлы шэраг прац застаўся ненадрукаваным.

Пры кожнай клініцы, а таксама пры інстытутах адбываліся канфэрэнцыі, на якіх чыталіся даклады і рэфэраты, дэманстраваліся хворыя. Адначасна ўтвараліся агульнагарадзкія канфэрэнцыі па тэй ці іншай спэцыяльнасьці. Мэдыцынскі факультэт прыймаў дзейны ўдзел у розных навуковых зьездах, як саюзнага характару, таксама і рэспубліканскага, у РСФСР і УССР. Цэлы шэраг працаўнікоў атрымаў навуковыя камандыроўкі, як на абшарах Саюзу, таксама і за межы. Вядомая частка навуковых працаўнікоў, якія атрымалі камандыроўкі за межы, атрымлівалі дапамогу з боку Праўленьня Ўн-ту. Прафэсары: М. Б. КРОЛЬ, Ф. А. ГАЎСМАН, С. Д. КАМІНСКІ, Б. Я. ЭЛЬБЕРД,—прымалі ўдзел у цэлым шэрагу адпаведных навуковых зьездаў у Нямеччыне і Аўстрыі

Мэдыцынскі факультэт знаходзіўся ў самай цеснай сувязі з органамі Аховы Здароўя Рэспублікі. Нар. Кам. Ах. Здароўя і Акрздраў прадставілі ў распараджэньне Мэдыцынскага факультэту цэлы шэраг сваіх навуковых устаноў. Прафэсары Ўн-ту былі сталымі сябрамі Мэдыцынскага Савету, як дарадчага органу пры Нар. Кам. Ах. Здароўя. Мэдыцынскі факультэт вытвараў розныя групавыя дасьледваньні, а таксама разглядаў з боку мэдыцынскага студэнтаў Ўн-ту. На пасяджэньнях Навукова Мэдыцынскага Савету, а таксама Прэзыдыуму ЦП Саюзу Мэдсанпрацы, Дэканы факультэту выступалі з дакладамі ў якіх яны знаёмілі з працай Мэдыцынскага факультэту і з пастаноўкай на ім выкладаньня.

Прадметныя Камісіі, якія мелі вялікае значэньне ў жыцьці Мэдыцынскага факульту, былі наступныя:- Хірургічная, Тэрапэўтычная, Анатома-Фізыолёгічная, Біолёгічная, Прыродазнаўча-Навуковая. Акрамя гэтага, на Мэдыцынскім факультэце працавала некалькі студэнцкіх гурткоў: па нармальнай анатоміі, фізыолёгіі, два гурткі па тэрапіі, па нэўралёгіі пэдыатрыі і па органах унутранай сэкрэцыі. На чале кожнага гуртку стаялі студэнты, але прафэсары зьяўляліся караўнікамі гурткоў. Акрамя гэтага, студэнты Мэдыцынскага факультэту прымалі ўдзел у працы Мэдыцынскай сэкцыі Краязнаўчага таварыства.

На Мэдыцынскім ф-це, у якасьці прафэсароў былі наступныя асобы: БЯСТУЖАЎ А. Ф.—кафэдра біолёгічнай хэміі і фармакалёгіі; БУРАК С. М.—кафэдра клінікі вуха, горла і носа; ВЫДРЫН М. Л.—кафэдра акушорства і гініколёгіі; ГАЎСМАН Ф А.—кафэдра тэрапіі; КРОЛЬ М. Б.—кафэдра нэрвовых хвароб і фізыотэрапіі; КАМІНСКІ С. Д.—кафэдра вочных хвароб; ЛЕНЦ А. К.—кафэдра псыхіятрыі; ЛЯБЁДКІН С. І.—кафэдра нармальнай анатоміі; МЕЛКІХ С. М.—кафэдра тэрапіі; МАЎРАДЗІАДЗІ П. А.—кафэдра гістолёгіі; РУБАШОЎ. С. М.—кафэдра хірургіі; РОЗАНАЎ Л. П.—кафэдра фізыолёгіі; МРАНГОВІЎС В. Ю.—кафэдра скурных і вэнэрычных хвароб; ЛЯОНАЎ В. А.—кафэдра дзіцячых хвароб; САКАЛОЎСКІ М. П.—кафэдра хі-

ругії; ЦІТОЎ І. Т.—кафэдра паталёгічнай анатоміі і агульнай паталёгіі; ЭЛЬБЕРТ Б. Я.—кафэдра бактэрыолёгіі і мікрабіолёгіі; ЭКЗЭМПЛЯРСКІ В. М. па кафэдры агульнай гыгіены.

У якасьці дацэнтаў працавалі: БАРСУКОЎ М. І.—каф. сацыяльнай гыгіены; ШАПІРА М. Н.—каф. ортопэдыі; МАРШАК Е. І.—кафэдра сухот; КОРЧЫЦ А. В.—каф. опэрацыйнай хірургіі.

У якасьці асыстэнтаў працавалі наступныя асобы: БАРСКІ В.—кафэдра мікраолёгіі; БАРУХІН М. Л.—кафэдра нармальнай анатоміі; ГЕЛЬДБЕРГ С. І.—агульная гыгіена; ГЛОД-ВЯШУК В. І.—патолёгічная анатомія; ЗУБКОВІЧ Е. М.—гістолёгія; КУГЕЛЬ Р. А.—аналітычная хэмія; ЛАБАНОВІЧ А. Д.—аналітычная хэмія; МАГІЛЕЎЧЫК З. К.—агульная гыгіена; НІКАЛАЕВА-СЬПІРЫДОНАВА Е.—фызыолёгія; НАЙДУС Д. .—агульная гыгіена; РАХОЎСКІ Я.—мікрабіолёгія; САВЕЛЬЗОН С. І.—патолёгічная анатомія; СМОЛЬСКІ М. Б.—фармаколёгія; СТАНКЕВІЧ Е. Г.—нармальная гістолёгія; СУЦІН І. А —Мікрабіолёгія; СМУЛЕВІЧ Б. Я.—сацыяльная гыгіена; ТАРАНОВІЧ Л. Е.—Біолёгічная хэмія; ТАЎБКІН А.—нармальная анатомія; ШАМАРДЗІН Н. С.—біолёгічная хэмія; ЧАРВЯКОЎ В. Ф.—паталёгічная анатомія.

У якасьці асыстэнтаў клінік працавалі наступныя асобы: БАГДАНОВІЧ І. І. —Скурна-Вэнэрычная клініка; БОНЧ-АСМАЛОЎСКАЯ —Хірургічная кл.; ГОЛЬДБЛЯТ Г. О. —Псыхіатрычная кл.; ГІНЗБУРГ Р. Е. —Тэрапэўтычная кл.; ГУРЭВІЧ А. К. —Дзіцячых хвароб; ДВОРЖЭЦ М. А. —Вочная клініка; ЗАХАРАВА-СІДЛЯРЭЎСКАЯ О. К. —Тэрапэўтычная кл.; ІРГЕР Ю. М. —Хірургічная кл.; КАМІНСКАЯ-ПАЎЛАВА —Вочная кл.; КРОЛЬ Г. —Акушорска-Гінэколёгічная; ЛАПІДУС Р. І. —Хірургічная клініка; ЛЕВЭНБЭРГ —Нэрвовая клініка; ЛІЎШЫЦ С. М. —Загадчык Рэнтгэнаўскага габінэту; МАНАНЗОН Х. І. —Тэрапэўтычная клініка; МАРШАК Е. Л. —Тэрапэўтычная кл.; МАНГЕЙМА – Хірургічная; МІРЕР В. І. —Хірургічная клініка; ПАЎТАЎ М —клін. Вуха, горла і носа; ПАКРОЎСКІ В. А.—Акушорска—Гінэколёгічная; ПАПОЎ К. Т.—Дзіцячая клініка; РАФІЛЬЗОН Р. Р.—Акушорска—Гінэколёгічная; РОЗЭНТАЛЬ С. К. —кожна - Венэрычная; СІТЭРМАН Л. Я.—Тэрапэўтычная клініка; СЬЛЯПЯН М. Ф.—Нэрвовая клініка; САЛОМІН—Тэрапэўтычная клініка; ТРЭМПОВІЧ П. В.—Хірургічная клініка; ФЁДАРАВА—Е. А.—Нэрвовая клініка; ФЛЕКЕЛЬ І.—Тэрапэўтычная; ФЭЛЬДМАН Б. Р. —Клініка вуха, горла і носа; ХАЗАНАЎ М.—Нэрвовая клініка; ЧАРЫШКАВА Л.—Дзіцячая клініка; ШАПІРА М.—Хіругічная клініка

У якосьці ардынатараў, працавалі наступныя асобы: АФОНСКІ С. А.—Нэрвовая клініка; АФОНСКІ Н.—Вушная клініка; БАЛІЦКАЯ Т. —Акушорска-Гінэколёгічная; БАБАК В. В. —Хірургічная; БАШМАКОВА С. М. —Скурна-Вэнэрычная; БАГАРАД Ф. А. Нэрвовая клініка; БЕЛАУС Б. С. —Вочная клініка; ВЭБЭР М. Р. —Хірургічная клініка; ВОЎШЫНА—Дзіцячая; ВАСІЛЕЎСКІ Н.—Тэрапэўтычная; ВАЛАДКОВІЧ Д.—Дзіцячая; ДЗІХЦЯР С. Р.—сацыяльнай гыгіены; ДРАГУН Б. Е.—Хірургічная клініка; ЖУРАЎСКАЯ—Хірургічная клініка; ІРГЕР Л. Я.—Тэрапэўтычная клініка; ІОШАР Б. М.—Нэрвовая клініка; КАМІНСКІ Д. С.—Вочная клініка; КЛЕЙНЕР Р. М.—Тэрапэўтычная кл.; КАЛІТОЎСКІ Е. Ф.—Нэрвовая кл.; КОРЗУН П. І. —Хірургічная; КАЦЭНБОГЕН Г. З.—Акушорска—Гінэкол.; КУТОЎСКІ-СТАРЫНСКІ — Тэрапэўтычная клін.; ЛУЦКЕВІЧ—Тэрапэўт.; КУЛЕША О. С.—Тэрапэўтычн.; ЛІПЕЦ І. І —Тэрапэўтычная клініка; ЛОСЯЎ Н. А.—Вочная; ЛЕВІН З. С.—Дзіцячая; МАЗЭЛЬ С. І.—

Тэрапэўтычная клініка; МАЙЗЭЛЬ С. А.—Акушэрская клін.; МАЙЗЭЛЬ А. І —Скурна-Вэнэрычная клін.; НЕЙФАХ Я. Я.—Тэрапэўтычная клініка; ПРАТУСЕВІЧ Б А.—Тэрапэўтычная клін.;ПРАТУСЕВІЧ М. А. —Акушорска-Гін. клін; ПАЛЯНСКІС. М.—Вушная клініка; СЬЛЯПЯН Б. В.—Вочная клініка; САРОКА М. І.—Хірургічная клініка; СЛУЦКАЯ Х. М.—Псыхіятрычная клініка; СЬМІРНОЎ А. А.—Псыхіятрычная клініка; РАСКІНА Р. І.—Псыхіятрычная клініка; ФРЫДЛЯНД Е. Л. —Дзіцячая клініка; УРГІН М. С.—Тэрапэўтычная клініка; ХУДЗЯКОВА К. П.—Акушорска-Гінэколегічная кл.; ЦІШКІН Б. М.—Хірургічная клініка; ЦЫРКІН С. М.—Акушорская клін.

Склад ардынатараў і асыстэнтаў на Мэдфаку мяняўся ў залежнасьці ад сканчэньня і стажа.

Пры Мэдыцынскім факультэце існавалі навукова-дапаможныя ўстановы, якія былі павінны здавальняць патрэбы факультэту. Да гэтых установаў адносіліся: Інстытут нармальнай Анатоміі Дырэктар —С. ЛЯБЁДКІН, Інстытут Патолёгічнай анатоміі—Дырэктар І.ЦІТОЎ, інстытут фізыолёгіі—Дырэктар Л. П. РОЗАНАЎ, Інстытут Нармальна й Анатоміі—Дыр П. А. МАЎРАДЗІАДЗІ, Інстытут. Рэнтгэналёгіі—Заг. С. М. ЛІЎШЫЦ, Інстытутт Біолёгічнай Хэміі—Дыр. А. П. БЯСТУЖАЎ, Інстытут фармакалёгіі—Дырэктар А. П.БЯСТУЖАЎ, Інстытут Мікрабіолёгіі—Дыр. Б.Я. ЭЛЬБЕРТ, Інстытут Экспэрымэнтальнай гыгіены—Дырэктар Б. Я. ЭЛЬБЕРТ, Інстытут Сацыяльнай Гыгіены—Загадчык—БАРСУКОЎ, Клініка Нэрвовых хвароб—Дырэктар М. Б. КРОЛЬ, клініка Скурна—Вэнэрычных хвароб—Дырэктар В. Ю. МРАНГОВІУС, клініка Акушорска-Гінэколёгічная—Дыр. М. Л. ВЫДРЫН, 1-ая Тэрапэўтычная клініка—Дыр. С. М. МЕЛКІХ, 2-ая Тэрапэўтычная клініка—Дырэкта Ф. А. ГАЎСМАН, 1-ая Хірургічная клініка—Дыр. С. М. РУБАШОЎ, 2-ая Хірургічная клініка—Дыр. М. П. САКАЛОЎСКІ, Клініка Дзіцячых Хвароб—Дырэктар В. А. ЛЯОНАЎ, Псыхіятрычная клініка -Дыр. А. К ЛЕНЦ, Вочная клініка—Дырэктар С. Д. КАМІНСКІ, клініка хвароб Вуха, Горла і Носа—Дырэктар С. М. БУРАК.

Усе гэтыя навуковыя ўстановы, ня гледзячы на тое, што яны яшчэ ня поўнасьцю абсталяваны, сьведчаць аб росьце Мэдыцынскага факультэту.

Мэдыцынскі факультт меў ужо з выпускі дактароў—першы зборны і два выпускі студэнтаў, якія вучыліся ва унівэрсытэце з 1-га курсу. Агульныя водзывы аб іх працы сьведчаць аб тым, што яны атрымалі ва Ўн-це добрую падрыхтоўку.

## 14. Рабочы факультэт.

Рабочы факультэт быў першым факультэтам, які быў адчынены пры Ўнівэрсытэце. Гэта зусім зразумела. Рабочы факультэт быў павінен даць мажлівасьць працоўным масам атрымаць сярэднюю адукацыю, каб потым мець мажлівасьць працаваць у вышэйшых установах. Рабочы факультэт павінен быў даць Ун-ту той самы сацыяльны склад, які зьяўляўся неабходным для Ўнівэрсытэту. Першыя гады Рабочага факультэту былі вельмі цяжкімі, дзякуючы адсутнасьці сродкаў, ела потым, калі Ўнівэрсытэт стаў мець сталы бюджэт, дык і Рабочы факультэт атрымаў значныя сродкі, што дало яму мажлівасьць арганізаваць габінэты і лябараторыі і паставіць выкладаньне на адпаведную вышыню.

Спачатку начале факультэту ў працягу 4 год стаяў В. П. Тэпін, а потым С. З. Сюнім, месца якого ў канцы навучальнага 1926-27 году заняў М. Т. Лойка. Дзякуючы энэргіі ўсіх Загадчыкаў факультэту, апошні прыняў тую форму, якую ён мае ў сучасны момант і карыстаецца адпаведнай высокай рэпутацыяй. Дэканат Рабфаку загадваў усёю працаю на факультэце і ставіў на абгаварэньне ўсе тыя пэдагагічныя і мэтадычныя пытаньні, якія высоўваліся на першы плян акадэмічным жыцьцём.

Для Дэканату Рабфаку таксама мела вялікае значэньне пытаньне аб мэтадах выкладаньня. Вельмі ўважлівае вывучэньне гэтага пытаньня прымусіла Дэканат перайсьці на лябараторна-групавы мэтад, што было магчыма, дзякуючы добраму абсталяваньню габінэтаў і лябараторый Трэба сказаць, што гэты мэтад даў свае значныя вынікі.

Адначасна Дэканат Рабочага факультэту прымаў меры да пераводу выкладаньня на беларускую мову. У гэтай галіне зроблена ўсё. Рабочы факультэт працуе на беларускай мове. З другога боку неабходна даць працоўным яўрэям мажлівасьць вучыцца на яўрэйскай мове, прымусіла Дэканат адчыніць яўрэйскае аддзяленьне.

На рабочым факультэце існуюць лябараторыі: Прыродазнаўчая, Фізычны габінэт, Хімічны габінэт, а таксама і габінэты па іншым прадметам, дзякуючы якім зьяўлялася мажлівасьць шырокай пастаноўкі заняткаў па Дальтон-пляну. Акрамя гэтага, на Рабфаку вывучалася нямецкая мова і існавалі розныя гурткі: Мастацкі, Харавы, Спартыўны, Музычны, Літаратурны. Пры Рабфаку была і майстэрня, якая абслугоўвала патрэбы факультэту.
Рабфак зрабіў ужо некалькі выпускаў. Частка скончыўшых рабфак была камандыравана ў індустрыяльныя ВНУ; другая частка паступіла ў ВНУ БССР. У сучасны момант перглядаюцца пляны Рабфаку з той мэтай, каб Рабочы факультет выключна абслугоўваў патрэбы ВНУ БССР.

У сучасны момант наступныя асобы працуюць, у якасьці настаўнікаў, лябарантаў Рабочага факультэту.

## 15. Дзяржаўная бібліатэка.

З заснаваньнем Унівэрсытэту быў закладзены фундамэнт бібліатэкі Унівэрсытэту, якая адначасна была абвешчана Бібліатэкай Дзяржаўнай. У працягу 5 год Б-ка значна вырасла. Бібліатэка, як рэспубліканскі кнігазбор, атрымлівае абавязковы экзэмпляр выданьняў РСФСР і УССР. Цэлы шэраг бібліотэк быў куплены Б-кай. Б-ка мела мажлівасьць уступіць у абмен з рознымі бібліатэчнымі ўстановамі. Для гэтага пры Бібліатэцы маецца асобны абменны фонд. Адпушчаныя сродкі далі мажлівасьць добра паставіць выпіску замежных часопісаў па спэцыяльнасьцям, і з гэтага боку Б-ка таксама забясьпечана. І выпіска замежнай літаратуры пастаўлена таксама здавальняючым чынам. Магчымасьць купляць кнігі з дзяржаўнага фонду ў Ленінградзе значна папоўніла бібліатэку Ун-ту. Розныя навуковыя ўстановы РСФСР і УССР прыслалі ў Б-ку свае выданьні. Б-ка ўзрасла і замацавалася. Дзякуючы гэтаму, Праўленьнем Ун-ту было пастаўлена пытаньне аб выдзяленьні Б-кі ў самастойную навуковую адзінку. Гэты праэкт быў спаткаҥы Наркамасьветы ўважліва, і Бібліатэка, на падставе дэкрэту Савету Народных Камісараў БССР, пачынаючы з 1926-27 навучальнага году стала самастойнай адзінкай, але, згодна статуту, Дзяржаўная Бібліатэка зьяўляецца

адначасна фундамэнтальнай бібліатэкай Ун-ту. На чале Б-кі стаіць старшыня. Пры Б-цы існуе Савет, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі Вышэйшых Навучальных Установ і Н. К. Асьветы. Дырэктарам Б-кі быў назначаны Я. Б. СІМАНОУСКІ, які ў працягу 5 год з вялікай энэргіяй арганізаваў Бібліатэку. У сучасны момант у Б-цы маецца звыш 3.000 тамоў і адчуваецца недахоп у будынку.

# СЬПІСАК

Настаўнікаў, лябарантаў рабочага факультэту Беларускага Дзяржяўнага Унівэрсытэту.

*на 1927—1928 вучэбны год.*

### Беларуская мова.

I к. Біндзюк П. М.
Хома Ў. І. (яўр. ад.)

II к. Самковіч І. К.
Хома Ў. І.

III к. Пратасэвіч І. І.

### Расейская мова.

I к. Нікольскі А. М.
Фалькові К. Я. (яўр. ад.)

II к. Нікольскі А. М.
Сімановіч Г. Д.

III к. Замоцін І. І.
Тэпін Б. П.

### Яўрэйская мова.

I к. Царт

### Палітграмата.

I к. Каган Л. І.

### Ленінізм.

II к. Кугель Р. Е.
Нісенбаум Ю. І.

### Паліт-эканомія.

III к. Баканаў М. П.

### Гістор. клясав. барацьбы.

II і III к. Герчыкаў І. В.
Каменскі А. Д

### Геаграфія.

II к. Лойка М. Т.
Малеў Я І.

I к. Шкляеў М. П.
Ханутаў Э. М. (яўр. ад)

### Прыродазнаўства.

I і II к. Раждзесьцьвенскі А. М.
Пінус М. І.
Валасевіч М. І.

### Фізіка.

II к. Паўлюкевіч У. В.

III к. Пэлеп М. Я.
Кохамская Г. І

### Хэмія.

III к. Кугель Р. А.

### Нямецкая мова.

II і III к. Пецольд Г. Э.
I к. Рубцова А. А.

### Вайсковыя прадметы.

I і II к. Пятроў М. М.

### Матэматыка.

I к. Кохамскі Б. І.
Сагаловіч Г. Н. (яўр. ад.)

II к. Гадыцкі—Цьвірка К. М.
Івіцкі М. В.

III к. Дыдырка У. К.
Ляўковіч Б. Л.

### Чарчэньне.

II і III к. Барышнікаў А. Т.

### Лябаранты.

Нісенбаум Ю. І.
Валасевіч М. І.
Бараненкаў М. Г.
Кухата

**Графічн. гамат. (рысав.)**

I к. Шханаў К. Г.

**Мастацкі гурток.**

Ціханаў К. Г.

**Харавы гурток.**

Леўчанка Ф. Г.

**Спартыўны гурток.**

Тайц Ю.

**Музычны гурток.**

Бынаў П. Я.

**Літаратурны гурток.**

Пратасевіч І. І.

**Прэпаратары.**

Шаўкоў.

**Загадчык майстэрні.**

Фальковіч К. О.

Праф. М. Б. КРОЛЬ

# Першыя крокі па арганізацыі мэдфаку Б. Дз. У. (Успаміны).



Праф. М. Б. Кроль

У сярэдзіне жніўня 1920 г. я атрымаў запрашэньне ўдзельнічаць у асобнай камісіі пры Н. К Асьвеце ў Маскве па арганізацыі ў Менску Унівэрсытэту. У гэтай камісіі прымаў актыўны ўдзел праф. Л. С. Мінор якога па справядлівасьці трэба лічыць духоўным бацькам Мэдфак у Б. Дз. У. Л. С. Мінор даводзіў у к-сіі неабходнасьць арганізацыі ў першую чаргу „разрешенного состава медфакультета“ з прадстаўнікоў важнейшых дысцыплін з тым, каб з падобнага ядра арганічна разьвіваўся ўжо і ўвесь факультэт: Прынцып гэты хоць і быў ухвален к-сіяй, але ажыцьцяўленьня не атрымаў ні тады, ні ў будучым. З мэдыкаў, апрача Л. С. Мінора і мяне ў падрыхтоўчых арганізацыйных кроках прымаў удзел толькі яшчэ маскоўскі прыват доцэнт інтэрністы *М. С. Давыдаў.* Факультэт-жа будаваўся не концэнтрычна, а, калі можна так сказаць, эксцэнтрычна зьнізу ўверх з першага курсу.

У кастрычніку пытаньне настолькі стала назраваць, што было вырашана адправіць к-сію ў Менск для высьвятленьня на месцы ўсіх магчымасьцяй. Паездка адбылася ў канцы 1920 г. У ёй удзельнічаў, стаўшы ў дальейшым рэктарам Б. Дз. У., прафэсар *В. І. Пічэта,* этнограф *Н. А. Янчук,* заотэхнік *А. А. Колонтар,* заолёг *Н. М. Кулегін,* антраполёг *А. А. Барзоў,* гісторык *Ф. Ф. Турук,* хэмікі *А. М. Беркенгейм і Вейцман* і мэдыкі *Л. С. Мінор.* Я і Л. С. Мінор дастаў у тав. Ларына „міжнародны“ вагон, у якім камісія 26 сьнежня адбыла на першыя разьведкі па рэалізацыі даўнішняй ідэі Беларускага Унівэрсытэту, атрымаўшай сваё ажыцьцяўленьне толькі пры Савецкай уладзе.

У Менску нас зьдзівілі руіны будынкаў, спаленых палякамі пры адступленьні. Усё сьведчыла аб тым, што мы знаходзімся ў многапацярпеўшай пагранічнай паласе, якая служыла арэнай непасрэдных ваенных дзеяньняў.

Многа шыльдаў было яшчэ на польскай мове, дзе-ні-дзе і на нямецкай мове, як і назвы вуліц. Адчувалася энэргічная і ўпартая арганізацыйная праца па ўкараненьні і ўзмацненьні прынцыпаў Савецкай ўлады. Пасьля недахопу прадуктаў у Маскве нас зьдзівіла вялікая колькасьць запасаў у Менску, якая прывозілася сялянамі на рынкі (Троіцкі, цяперашнюю плошчу Парыскай Камуны), і якой гандлявалі і мясцовыя крамнікі. Некаторая частка нашай энэргіі і нашага часу трацілася на закупкі такіх смачных прыпасаў, як крупы, фасоля і інш.

Мясцовыя органы, кіраўнічыя, партыйны і прафэсыянальныя спаткалі нас вельмі ветліва. Адразу адчулася вялікая бадзёрасьць дзякуючы іх адносінам да ідэі ўнівэрсытэту і мы сталі пэўнымі, што справа з мёртвай точкі будзе зьдзьвінута. Да прыезду нашай к-сіі мясцовая „унівэрсытэцкая“ к-сія пад старшынствам, быўшага тады наркамздравам д-ра С. Д. Камінскага, цяпер прафэсара ўнівэрсытэту яшчэ не пачынала канкрэтных крокаў па будове ўнівэрсытэту і на сумеснай нарадзе пад старшынствам С. Д. Камінскага было вырашана разьбіцца на асобныя падкамісіі, якія сталі рыскаць па гораду ў шуканьнях падыходзячых памяшканьняў для факультэтаў.

Для асноўнага аддзяленьня мэд. фак. быў знойдзен вялікі будынак б. духоўнай сэмінарыі, дзе цяпер зьмяшчаецца аб'яднаная вайсковая школа. Там апрача хэмічных лябараторый, габінэту фізыкі і інш. установ прыродазнаўчага факультэту, маглі зьмясьціцца і інстытуты фізыолёгіі, гістолёгіі і агульнай паталёгіі. Для анатамічнага тэатру мною быў намечаны зруйнаваны будынак фабрыкі „Вікторыя“. З прычыны блізкасьці яго да 1-ай Сав. б-цы і да б. рэальнай школы Хайкіна, дзе цяпер Комуністычны Унівэрсытэт і дзе мне здавалася зручным зьмясьціць пропадэўтычныя клінікі 3 курсу. Будынак гэты ў далейшым павінен быў перайсьці да кафэдры паталёгічнай анатоміі. Для клінік хірургічнай і тэрапэўтычнай ў курсу здаліся мне найбольш падыходзячымі—прасторныя і сьветлыя залі б. гімназіі Фальковіча, дзе цяпер зьмяшчаецца рабочы факультэт. Пад гінэколёгічную клініку быў адведзены галоўны будынак 2-ой сав. б-цы, пад нэрвовую—будынак б. грамадзкага клюбу, пад дзіцячую—дзіцячая бальніца. У 1-ай сав. бальніцы намечаны былі спэцыяльныя клінікі для хвароб вока, вуха, носа і горла, скураных і агульная паліклініка. Для клінік 5 курсу памяшканьняў намечана ня было. Усё разьмешчанае разглядалася намі, як часовае. Найбольш падыходзячым месцам для пабудовы клінічнага гарадку нам здавалася памяшканьне б. вайсковага шпіталю, узарванае белапалякамі пры адступленьні. Нашы праэкты адносна мэдфаку і другіх факультэтаў былі ухвалены і ў пачатку студзеня „Маскоўская к-сія прафэсароў“ выехала з Менску з упэўненасьцю, што справа пушчана на рэйкі. Толькі-б сродкі, толькі-б знайшліся навуковыя дзеячы, згодныя на пераезд для працы пры цяжкіх умовах першага часу.

Пачатак 1921 г. быў вельмі трывожным для асоб зацікаўленых у ажыцьцяўленьні Унівэрсытэту ў Менску. У некаторых установах, асабліва Вайскова-Санітарных, узьнікл і сумненьні ў мэтазгоднасьці двух мэд. факультэтаў у галоднай краіне. Вага, здавалася, схілялася на карысьць Смаленску. Усё было ўзьнята на ногі. І, бязумоўна, не мая дакладная запіска, не запіска Л. С. Мінора, з абаснаваньнем неабходнасьці мэд. фак. у Менску—адыгралі ролю у жаданым вырашэньні пытаньня, а матывы больш складаныя, палітычныя і экономічныя. Бяспрэчна, крайняя напружанасьць сіл і сродкаў, патрачаных на закладку Б. Дз. У., цалкам спраўдзілася ў далейшым. Трэба

падкрэсьліць, што ніколі арганізатарамі Б. Дз. У. пытаньне ня ставілася альтэрнатыўна: Менск, а не Смаленск. Заўжды гаварылася: ня толькі Смаленск, але і Менск.

У той час у Маскве дзейнічала рабочая камісія па арганізацыі Б. Дз. У. пры часовым Праўленьні Ўн-ту, якая складалася з тав. Грынберга, В. І. Пічэты і Ф. Ф. Турука. К-сія вяла перагаворы з кандыдатамі на кафэдры У-ту. На нарадах 22 і 29 сакавіка 1921 г. пад старшынствам В. І. Пічэты былі прыняты вучэбныя пляны мэдфаку выпрацаваныя М. Б. Кролем, Л. С. Мінорам і П. І. Карузіным. Удзел у іх абгаварваньні прымаў і М. С. Давыдаў, намечаны для ўнутранай клінікі, але так і не пераехаўшы ў Менск.

У красавіку 1921 г. выехала ў Менск другая к-сія, у якой ад мэдыкаў удзельнічаў толькі я. У Менску мы знайшлі частку намечаных будынкаў занятымі. Так, будынак б. духоўнай сэмінарыі быў перадапы вайсковаму ведамству, на фабрыцы б. „Вікторыя" разьмясьцілася нейкая сьлясарная майстурня. К—сія яшчэ раз дакладна вывучала ўсе магчымасьці, кансультавала інжэнэраў і прадставіла дакладную запіску з пералічнем усіх мер, неабходных для стварэньня факультэтаў.

17 красавіка 1921 г. адбылася пад старшынствам А. Г. Чарвякова „злучаная нарада прадстаўнікоў Саўнаркому і Прэзыдыўму ЦВК (т. т. Чарвякоў і Адамовіч), прадстаўнікоў часовага Праўленьня Б. Дз. У. (Ф. Ф. Турук); Маскоўскай к-сіі прафэсароў (Калантар, А. М. Беркенгейм, Таль і Кроль) і менскай пяцёркі па арганізацыі Б. Дз. У (т. Кюсэ)". У пасяджэньні ўдзельнічалі т. т. Кнорын (старш. Ц Б. Кампартыі Бел.), Каранеўскі (зам. Наркамасьветы Бел.), Ігрер (заг. арг.-гасп. част. Б. Дз. У.), Рудэрман (прадст. Прафсаюзаў), Земец (заг. палітасьветы). На гэтым пасяджэньні „канстатавалі важнасьць працы, праробленай часовым Праўленнем і к-сіяй прафэсароў і прынялі пастаноўку справы за правільную". Было вырашана перадаць Наркамасьвеце і Б. Дз. У. усе вышэй пералічаныя будынкі, усе тры б-цы, а таксама будынкі б. Менскага вайсковага шпіталю, з належачымі вучасткамі зямлі, саўхоз Лошыца і 2000 дзесяцін лесу б. Ваньковіча. Ухвалілі зараз жа прыступіць да адчыненьня факультэтаў рабочага, грамадзкага, мэдыцынскага і прыродазнаўчага. Быў прыняты яшчэ рад практычных рашэньняў аб арганізацыі канцалярска-тэхнічнага органу, аб выбраньні І. І. Мэтліна кіраўніком справамі менскай к-сіі, аб палепшаньні быту прафэсароў і г. д.

На другі дзень адбылася пастанова прэзыдыуму ЦВК, якая зацьвердзіла пастановы аб адчыненьні Унівэрсытэту, аб перадачы яму ўсіх вышэй пералічаных будынкаў, аб узьняцьці хадайніцтва перад Урадам РСФСР, аб асыгнаваньні залатога фонду для замежных пакупак і г. д. У гэты-ж дзень адбылася „шырокая аб'яднаная нарада арганізацыйнай пяцёркі, прадстаўнікоў часовага Праўленьня і к-сіі прафэсароў сумесна з прадстаўнікамі розных ведамств і спэцыяльнасьцяй".

Калі мы ехалі ў Маскву, усім нам было ясна, што ўнівэрсытэт будзе адчынены не пазьней восені. Ужо ў маі быў пачаты прыём заяў ад жадаючых уступіць ва Ўнівэрсытэт. Нарэшце, 8 ліпеня 1921 году Калегіяй Н. К. Асьветы Беларусіі было назначана Праўленьне Б. Дз., У. у складзе рэктара В. І. Пічэты, В. М. Ігнатоўскага, М. Л. Фрумкінай і Ф. Ф. Турука, 5-ае месца студэнта часова пакінута вакантным.

19 верасьня 1921 г. Дзяржаўным Навуковым Саветам у Маскве былі зацьверджаны першымі прафэсарамі мэдыцынскага факультэту Б. Дз. У: 1) Н. Н. Андрэяў па кафэдры фізыкі; 2) Б. М. Бэркенгэйм па хэміі; 3) М. Б. Кроль па кафэдры нэрвовых хвароб; 4) В. В. Ляпёшкін па батаніцы і 5) А. А. Калужскі па кафэдры агульнага земляробства. Апрача таго, цяпер пакойны А. А. Лунц—часова замяшчаў кафэдру гісталёгіі.

У наступны раз я прыехаў у Менск у канцы верасьня, калі ўжо закончана была праца па прыёму студэнтаў і належала пакласьці пачатак вучэбных заняткаў. Пад маім старшынствам у якасьці часовага дэкану адбываліся першыя паседжаньні малалічбнага мэдфаку. 30 кастрычніка 1921 г. адбыўся першы ўрачысты акт унівэрсытэту, на якім рысутнічалі сябры Ураду на чале, з А. Г. Чарвяковым прадстаўнікі партыйных, прафэсыянальных арганізацый, пры каласальным наплыве публікі і студэнтаў. Былі сказаны дзьве актавыя прамовы і прывітаньні: праф. Салаўёвым „аб сучасных плянах пэдагагічнай навукі“ і мною на тэму „Мысьленьне і мова“ (надрук. у I томе „Труды Б. Г. У.“, і амаль поўнасьцю перадрукаваны ў „Психологической хрестоматии“ выд. проф. Карнілавым 1927 г.).

На другі дзень пачаліся вучэбныя заняткі на мэд. фак. Апрача пералічаных прафэсароў быў запрошаны выкладчык зоолёгіі на пэдаг. фак. Фядзюшын. Кафэдра анатоміі заставалася вольнай. Прыяжжаў для чытаньня курсу проф. К. Карузін з Масквы. Практычныя заняткі веў, і паставіў іх на належную вышыню, запрошаны прозэктарам д-р І. М. Перэльман, энэргіі і працаздольнасьці якога факультэт абавязан вельмі многім.

Калі ўспомніць гэроічны пэрыяд, які разам з усім унівэрсытэтам тады перажываў мэдфак., нельга ня схіліцца перад усімі тым, хто тут жыў і працаваў, творачы вялікую культурную справу пры самых няспрыяючых умовах. Праўда, і ў другіх частках нашага Саюзу ў той час умовы ня былі больш спрыяючымі. Але тут, у Менску, існавалі яшчэ спрэчкі аб тым, ці выйдзе што небудзь, ці зацьвердзіцца факультэт, ці заваюе ён становішча, ці спраўдзіць ён даверые, надзеі, якія былі ўскладзены на яго сапраўднымі тварцамі, працоўнымі масамі Беларусі, якія нічога не шкадавалі для яго стварэньня. Усякі дробны посьпех быў радаснай зьявай. Калекцыі Фядзюшына, хэмічныя вынаходкі Бэркенгейма—вось чым жыў тады мэд. фак. Нельга не падкрэсьліць вялікіх заслуг і першага рэктара В. І. Пічэты перад мэдфакам. Выключнай зьяўляецца і дапамога, якую аказвалі студэнты і іх прадстаўнікі ў будове ўнівэрсытэту.

Справядлівасьць патрабуе сказаць, што не ўва ўсіх хапала вытрыманасьці і цярпеньня. Некаторыя, як д-р Вэйцман, з першых-жа дзён апынуліся на тым баку мяжы. Быў адзін прафэсар, які з першых-жа дзён прадвяшчаў бліжэйшую гібель мэдфаку і ўнівэрсытэту, наогул, і адгаварываў другіх ад пераезду ў Менск. Проф. Ляпёшкін праз год атрымаў камандыроўку за граніцу, з якой не вярнуўся, прыняўшы кафэдру ў Празе. Таксама многа скэптычных заўваг давялося пачуць ад мясцовых дактароў. Цяпер пакойны д-р Ліпманаў, усімі паважаемы тагачасны старшыня „об-ва минских врачей“, належаў да тых ня многіх, якія з самага пачатку горача ўпэўніліся ў будучыню мэдфаку і аказываў яго першым будаўнікам самую актыўуную дапамогу, як маральную, гэтак і сваёй працай.

Буйным дэфэктам у справе арганізацыі мэдфаку зьявілася адсутнасьць прафэсара мэдыка, які тут-жа пераехаў-бы ў Менск і мог-бы стаць на чале факультэту. Кафэдра нэрвовых хвароб мела адчыніцца толькі праз два гады, і пераехаць у менск выключна для адміністрацыйнай працы, кінуўшы працу клінічную, я, бязмоўна, не мог. Таму я тады быў дэканам толькі фікцыйным, хоць і мелася пастанова факультэту аб тым, каб адзін з сяброў дэканату жыў у Маскве, пакуль не скантруіруецца факультэт. Пасьля доўгіх просьб удалося ўгаварыць праф. Б. М. Бэркенгейма прыняць на сябе абавязакі дэкану. Але ўжо на наступным паседжаньні ён падаў у адстаўку. Затым некаторы час справамі факультэту загадваў сэкратар яго. Фадзюшын і на правах майго намесьніка, др. І. М. Перальман. У Маскве прадаўжалі падысківаць кандыдатаў для мэдыцынскіх кафэдр. Таксама і Праўленьне ў Менску клапацілася аб працягненьні кандыдатаў, асабліва клініцыстаў.

У канцы студзеня 1921 г. я зноў прыехаў у Менск, дзе пад маім старшынствам адбылося факультэцкае паседжаньне, на якім падводзіліся вынікі выкананьня вучэбных плянаў за першае паўгодзьдзе. Яны былі досыць плачэўнымі, нармальна быў выкананы плян толькі па анатоміі, батаніцы і заолёгіі. Па хэміі і фізыцы—нездавальняючы.

У мой прыезд у канцы красавіка 1922 г., я быў шчаслівы прывесьці заявы двух выдатных прадстаўнікоў Маскоўскай мэдыцыны —проф. С. М. Мелкіх, на кафэдру тэрапіі і Б. С. Вэйзбрада, на кафэдру хірургіі. Абое, зразумела, былі прыняты на тым-жа паседжаньні аднагалосна, з іх пераехаў у Менск праз год С. М. Мелкіх, які ў якасьці дэкану вельмі многа зрабіў для арганізацыі і ўзмацненьня мэдфаку. 14 чэрвеня 1922 г. мэдфак абагаціўся шэрагам новых сяброў. Былі выбраны на кафэдру фізыкі—Е. Е. Сіроцін, на кафэдру хірургічнай клінікі М. П. Сакалоўскі, на кафэдру фармакалёгіі праф. Бястужаў. Надзвычайна важным трэба лічыць рашэньне адчыніць з новым вучэбным годам разам другім друкурсамтаксама і трэці курс, гэтым значна паскорылася магчымасьць пераезду у Менск клініцыстаў. 14 чэрвеня быў вызначан дэканам мэдфаку пераехаўшы ў Менск праф. М. П. Сакалоўскі, які, такім чынам, зьявіўся першым дэканам мэдфаку, працаваўшым на месцы над арганізацыяй факультэту.

Далейшае разьвіцьё мэдфаку ішло, бязумоўна, не па таму шляху, які з надмерным оптымізмам і без неабходнага вучоту сродкаў быў намечаны „к-сіяй прафэсароў“. Ён ішоў шляхам скарыстоўваньня гарадзкіх больніц для клінік па прыкладу 2-га Маскоўскага Унівэрсытэту. Дзеячы факультэту ўвязалі сваю працу з гарвыканкомам і гарздраўаддзелам, загадчык апошнім д-р Сьляпян з выключнай прадбачлівасьцю ўлавіў усю вялізарную карысьць, якую павінна была атрымаць гарадзкая здраваахова да вуніі мэдфаку і мясцовых лкавых устаноў. Клопатамі наркамздрава Стакоўскага, а затым М. П. Барсукова і пры актыўным удзеле М. Р. Сьляпяна, мэдфаку ўдалося наладзіць свае клінікі ў гарадзкіх бальніцах. У прыватнасьці, я, асабліва многім, абавязан М. Р. Сьляпяну, а таксама і бзўшаму тады начкамхоза тав. Карпу за наладжваньне нэрвовай клінікі, якая была закончана толькі ў 1924 г., калі я і здолеў канчаткова перасяліцца ў Менск.

С. Я. ВАЛЬФСОН.

# Адрыўкі з успамінаў і думкі



Праф. С. Я. Вальфсон

Бел. Дзярж. Унівэрсытэт—адзін з важнейшых помнікаў Кастрычніка на Беларусі.

Унівэрсытэт наш стварыўся на 4-м годзе Савецкай улады, але гэта быў толькі 1-шы год існаваньня вольнай Савецкай Беларусі.

Калі яшчэ краватачылі раны вайны і акупацыі, урад Б.С С.Р. прыступіў да стварэньня ўнівэрсытэту.

Думка аб унівэрсытэце здавалася многім на агульным фоне ніішчаты, разрухі і культурнай адсталасьці нашай рэспублікі—ўтапічнай, неажыцьцявімай...

Хто не проэктаваў у свой час Унівэрсытэту ў Менску?

Аб тым, што „Северо-Западному краю“ патрэбна вышэйшая школа „шамкалі“ старычкі з цэнзавых гарадзкіх дум..

Аб тым-жа бескарысна гаварылі „самоопределявшиеся“ волею Сталыпіна куцыя земствы краю!

Аб тым-жа „подумывала“ акупацыйная ўлада. Гэта факт аб якім варта напомніць: улада арганізаванага бандытызму, улада шомпала і дэфэнзывы даручала шаноўным спэцыялістым ад навукі складаць проэкты Менскага Унівэрсытэту... Няхай мізэрны, з багаслоўскім факультэтам на чале, з выкладаньнем на чужой для масы польскай мове, але ўсё-ж Унівэрсытэт.....

І толькі рэволюцыя, чый руйнуючы дух ёсьць дух творчы, стварыла сапраўдны расаднік ведаў, культуры і навукі, якім зьяўляецца Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт....

У дні гістарычнай гадавіны, калі падводзяцца вынікі дзесяцігодняй рэвалюцыйнай творчасьці на ўсіх вучастках нашага соцыялістычнага будаўніцтва, усплываюць на думку асобныя адрывістыя ўспаміны з 6 гадоў жыцьця Беларускага Унівэрсытэту.

Маленькі—чатыры квадратовых сажняў—пакой у будынку былой гімназіі Фальковіча, цяпер Праўленьне будучага Унівэрсытэту, на рагу Магазыннай і Чырвона-армейскай вуліц...

У пакойчыку—чалавек 15 прафэсароў і выкладчыкаў, заўтра—30 кастрычніка 1921 году—пачынаючага жыць Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

Маючыя за сабой трыдцацігадовы акадэмічны шлях, „маститые“ вучоныя і маладыя навуковыя працаўнікі, якія толькі рыхтуюцца ўступіць на унівэрсытэцкую кафэдру... Ідзе першае паседжаньне Унівэрсытэцкага Савету. У пакойчыку густа накурана. Клубы сіняватага дыму не даюць магчымасьці добра разглядзець адзін другога. Дым паступова расьсейваецца і праразаюцца асобныя контуры.

Папялявая, соль і перац—шэвэлюра Ўладзіміра Іванавіча Пічэты. У. І. гаворыць доўга і з захапленьнем. Задачы Унівэрсытэту. Цяжкасьць працы. Характарыстыкі асобных працаўнікоў. Заклікі да дружнай сумеснай дзейнасьці. Нам належыць зрабіць вялікую гістарычную справу. Будзем яе сумесна тварыць...

Разгортваецца дыскусія, абгаварваюцца мэтадычныя пытаньні, уносяцца апошнія корэктывы ў вучэбны плян, канструіруюцца прадметныя к-сіі.

Дым клубіцца... Скрозь клубы дыму выдзяляецца асырыйскім клінком чорная барада Д. П. Канчалаўскага. Побач з ім, пад срэбранай пакрыўкай валасоў, жоўтавата—пяргаментны, ужо адзначаны пячаткаю набліжаючайся сьмерці, твар Д. М. Мэйчыка. Да канца сёмага дзясятку год дасягнуў ён таго, аб чым марыў на зары жыцьця з „спазьненьнем“ на 50 год атрымаў стары Мэйчык магчымасьць падняцца на кафэдру права, права на якую было даўно заваёвана яго навуковымі правамі, але якое анулiравалася забітым рэжымам. Мэйчык не жадаў плаціць за кафэдру рэнэгацтвам, хоць быў рэлігійным. Гавораць аб яго прадмеце. І зусім па юнацку ўзьбліскваюць, здавалася, загаслыя, старчаскія вочы...

Ля вакна, у крыху зьдзьвінутай на патыліцу мяховай шапцы, у сінім абшурпаным, паліце, абвязаны бязьмежна даўгой шальлю—Улад. Нікалаевіч Іваноўскі. Яскрава выдзяляецца яго высокі, філёзофскі лоб, калі ён гаворыць аб вучэбным пляне і прапануе прачытаць курс гісторыі вышэйшай адукацыі. Нэрвова жэстыкулюе І. Я. Герцык. Пытліва глядзіць на суседзяў Г. М. Салаўёў, і на губах яго зьяўляецца ледзь прыкметная іранічная ўсьмешка. Густой плямай чарнее „Зіноўеўская“ шэвэлюра ў самым кутку, каля печы, Зам. Наркамасьветы С. З. Кацэнбогена....

У другім кутку ўмясьціўся такі няпрыкметны, такі скромны, атулены сярэбранай сівізнай вялікі вучоны Н. А. Янчук—буйнейшы знаток Беларуск. літэратуры і выдатны этнограф. Ён паволі і сыстэматычна рэжа тонкімі кавалачкамі ляжачую перад ім на газэтным лісьце каўбасу, час ад часу робячы тонкія і каштоўныя заўвагі.

Ідзе дыскусія. У яе вузка—спэцыяльных пытаньнях, у яе маленькіх дзелавых пунктах адчуваецца, аднак, некаторая асаблівая ўрачыстасьць, навяваемая сьвядомасьцю таго, што заўтра ўдзельнікі дыскусіі стануць удзельнікамі будаўніцтва, вялікага культурнага будынку, што заўтра пачнецца цяжкая будоўля...

Гадзін шэсьць падрад цягнулася першае паседжаньне першай Унівэрсытэцкай Рады. Прайшло яно хутка і няпрыкметна.

Першым пачаў функцыяніраваць Факультэт Грамадзкіх Навук.

Пачатак заняткаў ва Унівэрсытэце быў назначан на 12 гадз. раніцы 31 кастрычніка. З прычыны займаемай пасады Нам. Дэкану Факультэту, я прышоў гадзінам к 10—ці ў будынак былой рэальнай школы Хайкіна на Магазыннай (у далейшым стаўшай Унівэрсытэцкай) вуліцы, дзе цяпер зьмяшчаецца Камвуз. Пад увесь факультэт быў аддадзены адзін толькі паверх, а ў гэтым паверсе $^3/_4$ памяшканьня засталося занятным чыгуначнай школай, якая ўпарта адмаўлялася звольніць месца унівэрсытэцкім „акупантам“ „ці вый-

дзе што з вашага унівэрсытэту, і ці будзе ён ,наогул, існаваць—яшчэ вялікае пытаньне“ казаў мне адзін з адміністратараў школы, а вось жывую і наладжаную справу вы руйнуеце... Неабходнасьць выступаць у ролі „разрушителя“ школа была, бязумоўна, няпрыемнай, але нязьбежнай.

У актавай залі я сустрэўся з рэктарам. У. І. самотна блукаў па вялізарным пустым пакоі, у якім праз гадзіну павінна было загарэцца ўнівэрсытэцкае жыцьцё. „Ведаеце, скора ўжо пачнуць зьбірацца студэнты, а глядзіце, што робіцца“... Малюнак, сапраўды, быў ня з тых, што адухаўляюць. Перш за ўсё, актавая заля была зусім... пустая. Як-жа быць? У прымыкаючым да залі карыдорчыку было навалена некалькі дзясяткаў лавак і табурэтак, дастаўленых напярэдадні з Наркамасьветы. будынку нікога ня было—ні служачых ні ўборшчыкаў. У. І. сказаў. „Трэба сьпяшацца. Давайце, будзем самі наводзіць парадак“.

Мы ўзяліся цератасківаць і растаўляць лаўкі, знайшли невялічкі столік, які знаходзіўся ў ня ўстойлівай роўнасьці і дапасавалі, яго „да кафэдры“. Я намаляваў плякат чырвона-сінім алоўкам „Аўдыторыя № 1“. „Уваход у часе лекцыі забараняецца“ і наладзіў яго ля дзьвярэй......

Хутка пачалі зьяўляцца студэнты, а крыху пазьней да адказу перапоўненай залі соценны натоўп смагла лавіў „чаканую“ прамову Д. П. Канчалоўскага аб культуры Міжземнага мора ў эпоху панаваньня Рыму.

Беларускі Дзяржаўны Ўнівэрсытэт радзіўся... Праўда, умовы яго існаваньня ў першыя месяцы былі суровымі. Аўдыторыі нярэдка ўяўлялі напружана слухаючы лектара соценны натоўп, які стаяў між чатырох сьцен. Стаялі студэнты—адсутнічалі лаўкі, стаяў прафэсар—адсутнічала крэсла. У галёшах, у паліто, у шубах, некаторыя з паднятымі каўнярамі.

А ў факультэцкай канцэлярыі пісалі ў пальчатках і алоўкамі: чарнілы замярзалі.
Але ўнівэрсытэт жыў...

* * *

Унівэрсытэт з першага дню быў абкружаны асаблівым уплывам і спачуваньнем ураду партыі. Першыя ўнівэрсытэцкія працаўнікі адчувалі гэта на кожным кроку. Ня толькі габінэт Наркамасьветы У. М. Ігнатоўскага, але і старш. ЦВК А. Г. Чарвякова, часта бачылі прадстаўнікоў Унівэрсытэту, прыходаячых за субсыдыяй на арганізацыю габінэту альбо набыцьцё калекцый для хэмічнай лябараторыі.

Унівэрсытэт быў дзяцішчам рэвалюцыі і рэвалюцыйная ўлада гэтага не забывала. Унівэрсытэт будавалі дружна і сумесна: старшыня Ц. В. К-у і факультэцкі загканц. Рэктар унівэрсытэту і студэнт рабфаку... Кожны ведаў і адчуваў, што дапамагае вялікай і магутнай справе.

Адным з першых муляроў нашага ўнівэрсытэцкага будынку быў В. Г. Кнорын. Ён жыва цікавіўся кожнай драбніцай, якая адносілася да ўнівэрсытэту і ня раз забягаў ён да мяне позьняй ноччу перагаварыць аб тым ці іншым унівэрсытэцкім „дельце“.

Мы ўгаварылі яго ўзяць чытаньне курсу па экономіцы пераходнага часу. В. Г. Кнорын не згаджаўся аргумэнтуючы перагрузкай на пасту сэкратара партыі, аднак здаўся перад нашым націскам. І з выключнай акуратнасьцю выконваў свае абавязкі выкладчыка...

Унівэрсытэт цёпла разьвітаўся з т. Кнорыным. Дэлегацыя ад прафэсуры адзначыла на разьвітальным паседжаньні, якое адбылося ў клюбе Маркса, яго заслугі перад унівэрсытэтам, а В. Г. закончыў свой адказ узгалосам „Няхай жыве наш марксыцкі Ўнівэрсытэт!“...

* * *

Праз тры з паловаю гады пасьля яго заснаваньня Унівэрсытэт пачаў выплачываць свой доўг рабочым і сялянскім масам Савецкай Беларусі, на свой убогі бюджэт будаваўшым рэспубліканскі навукова-культурны цэнтр.

21 лютага 1925 году Ўнівэрсытэт выпусьціў з сваіх сьцен першых 60 спэцыялістых: 26 юрыстых і 34 эканамістых.

Да канца дайшло 14 проц. з паступіўшых пры заснаваньні Ўнівэрсытэту на факультэт грамадзкіх навук. Тыя ўмовы, пры якіх узьнікаў Унівэрсытэт, рабілі немагчымым на першых парах ня толькі клясавы, але наогул, які-б там ня быў сур'ёзны адбор студэнцтва. Прыходзілася браць той матар'ял, які быў у наяўнасьці, матар'ял часта няпрыгодны для тых мэтаў, якія ставіў сабе наш унівэрсытэт з першага-ж моманту яго ўзьнікненьня. Прыходзілася браць гэты матар'ял у надзеі на тое, што Ўнівэрсытэт здолее прапусьціць яго скрозь свае гарніла, пераварыць яго ў сваім катле, у надзеі на тое, што жыцьцё правядзе свой суровы і натуральны адбор. Нашы меркаваньні спраўдзіліся. Натуральны адбор адбыўся па ўсёй лініі. Усё тое, што было ў першым наборы чужога рабоча-сялянскаму ўнівэрсытэту, сацыяльна няпрыгоднага для ажыцьцяўленьня тых мэт, якімі задаўся Беларускі Ўнівэрсытэт, няўстойлівага, няпрыгоднага для сур'ёзнай акадэмічнай працы—усё гэта само сабой адпала і зьнікла. Тыя 60, якія дайшлі да канца, выявілі сябе, як цьвёрдыя ўпартыя працаўнікі, якія здолеюць спраўдзіць сябе і па засьценамі Ўнівэрсытэту. Дзень першага выпуску быў днём унівэрсытэцкіх імянін. Гэты дзень сьведчыў аб тым, што Ўнівэрсытэт вытрымаў экзамен, які паставіла яму жыцьцё, што ён заваяваў сабе права на існаваньне, што ён закончыў першы, найбольш цяжкі, арганізацыйны этап свайго будаўніцтва.

* * *

З часу першага выпуску прайшло яшчэ два з паловаю гады. Унівэрсытэт даў Беларусі яшчэ многія сотні так патрэбных ёй працаўнікоў—дактароў, пэдагогаў, эканамістых, юрыстых... Няма цяпер, амаль што на усёй тэрыторыі БССР ніводнага буйнага пункту, дзе-б мы не спаткаліся з выхадцам з сьцен Беларускага Ўнівэрсытэту. Тысячы маладых, часта захопленых лепшымі імкненьнямі, ўзброеных надзейнаю зброяю ведаў, спэцыялістых, працуе не пакладаючы рук над гаспадаркай і культурай Беларускай Савецкай Рэспублікі. Унівэрсытэт горды і шчасьлівы сазнаваць, што гэта — яго выхаванцы, гэтыя лепшыя і перадавыя сыны масы, якія акунуліся ў хвалі ведаў і сьвету... І няма цяпер мядзьвежжага кутка ў Беларусі, дзе ня

ведалі-б трох літар „Б. Дз. У.“, дзе сялянскія дзяўчаты, дзе местачковыя хлапцы ня марылі б аб Менску і яго ўнівэрсытэце—Ўнівэрсытэце рабочых і сялян.

* * *

Наш Унівэрсытэт—Дзяржаўны. Гэта не ярлычок, не этыкетка, гэта—многазначучы і да многагаабавязваючы факт: *Унівэрсытэт Дзяржавы пераходнага часу. Вышэйшая школа рабочае Дзяржавы.* Гэта ня правіла, а коэфіцыэнт, які вызначае ўвесь характар дзейнасьці, увесь зьмест, усё жыцьцё Б. Дз. У.

Нашым лепшым пажаданьнем роднаму Ўнівэрсытэту ў дні Кастрычнікавай Гадавіны—вера ў тое, што наступныя гады яго існаваньня будуць дастойнымі яго першых гадоў.

Няхай расьце, пашыраецца і ўзмацняецца наш слаўны Ўнівэрсытэт, адзін з шматлікіх помнікаў нашай вялічавай эпохі—эпохі рэвалюцыйнай барацьбы, рэвалюцыйнай перамогі і рэвалюцыйнай творчасьці рабочых мас...

Праф. М. М ПІОТУХОВІЧ.

Вэ 3-м радзе

# Старовка ўспамінаў.



Праф. М. М. Піотуховіч.

У рэвалюцыйнай навальніцы, пад грукат яшчэ ня сьціхаўшых гармат грамадзянскай вайны, шэсьць год таму назад на Беларусі зацяплілася вогнішча асьветы—Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт. Выкліканы да жыцьця Вялікім Кастрычнікам, Б. Дз. У. рос і ўзмацняўся па меры таго, як расло і разьвівалася ў нас рэвалюцыйнае будаўніцтва: вогнішча паступова пераварачалася ў шугаючае полымя, якое зараз на далёкую адлегласьць адкідае ад сябе яскравыя праменьні сьвятла і культуры.

У працэсе чарговай будзённай працы, часам ня зусім ясна заўважваюцца дасягненьні сучаснага; цэгліна за цэглінай кладзецца ў вялікі будынак, але каб абхапіць увесь рост гэтага будынка ў цэлым, трэба некалькі адыйсьці назад—тады контуры будынка абрысуюцца яскравей і рэльефней.

І вось зараз, у момант Вялікага Сьвята 10-й гадавіны Кастрычніка, міма волі хочацца ажывіць некаторыя вобразы прошлага: як аганькі, адзін за другім успыхваюць у памяці гэтыя вобразы, такія далёкія, адышоўшыя ўжо ў нябыт, і адначасна такія блізкія, родныя, бо ўсё гэта пережыта, усё гэта калісьці хвалявалася само і хвалявала другіх.

Жыва прадстаўляецца знадворная абстаноўка аўдыторый ў першыя гады існаваньня БДзУ і паасобкі Пэдагагічнага Факультэту, на якім прышлося з самага пачатку працаваць пішучаму гэтыя радкі. Бедна і няпрытульна было ў гэтых аўдыторыях. Нізкія лавы, на якіх раней сядзелі вучні падгатоўчай клясы а цяпер з вялікай натугай для сябе ўсаджваліся барадатыя і шаноўныя дзядзькі студэнты; запэцканыя, даўно ня бачыўшыя рамонту сьцены, часам слабое сьвятло сьвечкі замест электрычнасьці—ў такой жабрацкай абстаноўцы прыходзілася пачынаць працу. Але ў грудзёх студэнцтва і прафэсуры палыхаў бадзёры юнакацкі энтузіязм, верылася, што пачынаецца справа вагромністай гістарычнай важнасьці, і гэты энтузіязм, гэта магутная вера ў будучыню як-то складвалі жабрацтва і няпрытульнасьць знадворнай абтсаноўкі, яна як-то не заўважвалася: і ў аўдыторыях, часам халодных, мала пратопленых, было па свойму цёпла і прытульна, бо ў іх моцна біўся пульс сьвежай навуковай думкі, у іх раздаваліся бадзёрыя і радасныя галасы працоўнай

моладзі, якая Кастрычнікавай Рэвалюцыяй непасрэдна ад сахі і варштату прызвана была ў муры Вышэйшай Навучальнай Установы.

Радасьць творчасьці, творчы ўздым прымушалі мірыцца з рознымі недахопамі, а такіх недахопаў было на першых парах ня мала. Ня было, напрыклад, у першы год існаваньня этнолёга-лінгвістычнага адзяленьня (1921-1925 акад. годзе) нават сталага раскладу лекцый: большасьць профэсуры станавілі сабой асобы, якія прыяжджалі з Масквы, Смаленску; на долю працаўнікоў, стала жыўшых у Менску, выпадала замяшчаць свабодныя гадзіны, якія ўтвараліся пры адсутнасьці каго-небудзь з прыежджых. З гэтай прычыны нагрузка мясцовых працаўнікоў была не раўнамерная: бывалі тыдні, калі амаль кожны дзень прыходзілася весьці заняткі звыш нормы.

Ня было далей навуковага абсталяваньня кафэдр. Памятаецца, як у 1922 г. быў адчынены габінэт беларускай мовы і літаратуры. З Дзяржаўнай бібліатэкі былі адабраны непатрэбныя ёй дублетныя экзэмпляры, якія склалі сабой каля 100 назваў; усе кніжкі памясьціліся на 2-х невялічкіх паліцах, і гэтыя паліцы прадстаўлялі сабой увесь фонд „габінэта“. Ня было канца розным вастротам і кпінам скептыкаў: „вось дык габінэт, адразу можна забраць увесь у партфэль“—чуліся часам насьмешлівыя галасы некаторых студэнтаў. Але былі сярод іх і оптымістыя, якія лічылі, што і маленькі кніжны фонд прадстаўляў сабой ужо пачатак сур'ёзнай справы навуковага абсталяваньня кафэдры. Жыцьцё паказала, што былі правы оптымістыя: зараз габінэт мае каля 2.000 назваў, ім набыта нават шмат каштоўных выданьняў, якія прадстаўляюць зараз бібліографічную рэдкасьць, асабліва ў галіне мастацкага фольклёра.

Рэвалюцыйнае будаўніцтва перамагло скептыкаў і ва ўсіх іншых галінах жыцьця.

Памятаецца, асаблівы скэптыцізм выяўлялі некаторыя асобы ў адносінах да выкладаньня ва Ўнівэрсытэце на беларускай мове. Невялічкай жменцы беларускіх працаўнікоў (проф. У. М. ІГНАТОЎСКІ, доц. Я.Ю. ЛЁСІК і пішучы гэтыя радкі) тут сапраўды прыходзілася быць піанэрамі зусім новай справы.

Белоруская мова, мова Францыска Скарыны, Васілія Цяпінскага, дзякуючы політыцы полонізацыі і русіфікацыі, у працягу 2-х стагодзьдзяў паступова зьніжалася на ступень амаль што выключна народнай сялянскай мовы; яна лічылася „мужыцкай“ мовай. І толькі Кастрычнік, прынёсшы беларускаму народу разам з соцыяльным і нацыянальнае вызваленьне, шырока расчыніў перад гэтай „мужыцкай“ мовай дзьверы Вышэйшай Навучальнай Установы. Гаворачы словамі нашага народнага поэта Янкі КУПАЛЫ, можна сказаць, што сапраўды зараз:

Беларусь на куце  
У хаце сваёй села—  
Чарка мёду ў руцэ,  
Пазірае сьмела.

Але ў першыя гады існаваньня БДзУ моцна яшчэ давала сябе адчуваць улада традыцый; выкладаньне на беларускай мове разглядалася некоторымі асобамі, як кур'ёз; імі ня мысьлілася, як гэта можна вышэйшую навуку ў вышэйшай установе выкладаць на „мужыцкай“ мове. У аўдыторыю часта прыходзілі студэнты іншых аддзяленьняў і нават іншых Факультэтаў толькі дзеля таго, каб паслухаць як гэта можна выкладаць навуку па беларуску. Але паступова лёд

скэптыцызму таяў. Вялікую ролю ў гэтым адыгралі наладжваўшыяся па ініцыятыве Рэктара У. І. ПІЧЭТЫ ўрачыстыя пасяджэньні, якія пасьвячаліся паасобным беларускім поэтам і пісьменьнікам (Янка КУПАЛА, Якуб КОЛАС, М. БАГДАНОВІЧ і інш). На сходах рабіліся даклады аб творчасьці пісьменьнікаў; звычайна на іх зьбіралася вагромністая маса слухачоў; заля ледзь магла ўмясьціць усіх жадаючых; даклады праходзілі з вялікім уздымам і мелі вялізарнае значэньне: яны будзілі цікавасьць да беларускасьці шырокіх колаў грамадзянства. Тамашы няверныя навочна бачылі, што і ў беларускай мове можна, рабіць навуковыя даклады ня горш чым у іншых мовах...

Цяпер скэптыцызм пераможаны. На Пэдфаку зараз 60% працоўных гадзін выкладаецца ў мове беларускай і 15%—у мове яўрэйскай; гэта яскравы выраз дасягненьняў, зробленых Пэдфакам у галіне здаровай нацыянальнай палітыкі, якую праводзіць Савецкая ўлада пад кіраўніцтвам Камуністычнай Партыі.

Так ва ўспамінах аб прошласьці Пэдфаку БДУ цьмяныя вобразы паступова перамагаюцца сьветлымі, бо ў самым жыцьці перамагалі творчыя будаўнічыя сілы.

Вось чаму ўсе працаўнікі БДУ сьвята 10-й гадавіны Кастрычніка сустракаюць з пачуцьцем падвойнай радасьці: гэта, па першае, агульная радасьць савецкіх грамадзян, якія сьвяткуюць перамогу рэвалюцыі, і, па-другое, гэта радасьць члена мясцовага калектыву, які расьце і сьпее пад сонцам Кастрычніка.

## Выканбюро профсэкцый.

Думка аб утвараньні адзінага цэнтру існуючых у Б. Дз. У. студэнцкіх арганізацый ўзьнікла праз год пасьля адчыненьня Унівэрсытэту. Ды і наогул, была неабходнасьць дакладна азначыць функцыі і ўвязаць працу многіх існуючых у той час арганізацый. Апошнімі былі на факультэтах Акадэмічныя сэкцыі, а на Мэдыцынскім факультэце—Экономсэкцыя з коопэратывам. Колькасьць студэнтаў паступова ўзрастала; жыцьцё магутна патрабавала шырокага разгортваньня палітыка-асьветнай працы і арганічнай сувязі студэнцтва з пролетарскай грамадзкасьцю. У сьнежні 1922 г. гэтая думка была праведзена ў жыцьцё. Студэнцтва Б. Дз. У., па прыкладу іншых В. Н. У—оў, пачала арганізіавацца і аб'ядпацца па профэсынальнаму прынцыпу (па прыналежнасьці да таго ці іншага профсаюзу) у адпаведныя профсэкцыі, з цэнтральным органам—Выканбюро Профсэкцый на чале. Апрача ўзмацненьня сувязі студэнцтва з тым альбо іншым профсаюзам, гэтым аб'яднаньнем дасягнута была сувязь паміж студэнтамі розных факультэтаў, бо ў Профсэкцыі ўваходзілі сябры Прафсаюзаў, незалежна ад факультэтаў, на якіх яны вучыліся. У далейшым, пачынаючы з 1924 году, профсэкцыі пачалі перабудоўвацца па вытворча—факультэцкім адзнакам, якія прывялі да таго, што ўсе мэдыкі знаходзіліся выключна ў профсэкцыі Мэдсантруд, Пэдфакаўцы—ў профсэкцыі Прац. Асьв. і г. д. У маі 1923 году была склікана 1-ая конфэрэнцыя студэнтаў Б. Дз. У., сяброў профсэкцый, якая выдзяліла Выканбюро 1-га скліканьня. У далейшым на гэтых конфэрэнцыях абмяркоўваліся розныя пытаньні жыцьця і працы ўнівэрсытэту і студэнцтва.

З першых крокаў сваёй працы Выканбюро прыходзілася аддаваць найбольшую ўвагу экономічнай працы, з прычыны таго, што матар'яльнае становішча студэнтаў было вельмі цяжкім. Пры Выканбюро існавала з самага пачатку 4 аддзелы: Экономічны, Палітыка—Асьветны, Організацыйны і Акадэмічны. Аднак ў розныя пэрыяды праца праводзілася поўным тэмпам не ва ўсіх галінах.

Уся праца Выканбюро з мая па верасень 1923 году праходзіла пад углом зроку свайго організацыйнага афармленьня наладжаньня сувязі з савецкімі, профсаюзнымі і грамадзкімі арганізацыямі і ў падрыхтоўцы, асабліва ў экономічнай частцы, да наступнага 1923/24 навучальнага году.

На вясновым, 1923 годзе на V Усебеларускім зьезьдзе Профсаюзаў Выканбюро профсэкцый прыняло актыўны ўдзел, атрымаўшы два мандаты, ад імя арганізаванага студэнцтва Бел. Дзярж. Унівэрсытэту. З восені 1923 году, вялася падрыхтоўчая праца па арганізацыі „Тыдня Пролетарскага студэнцтва", які праводзіўся ў сьнежні па Беларусі і Гомельшчыне з вялікім посьпехам, як ў сэньсе экономічным, гэтак і у сэньсе разгортваньня палітыка—асьветнай працы, прапаганды задач Б. Дз. У, як культурнага цэнтру, і ў сэньсе ўзмацненьня сувязі студэнцтва і Унівэрсытэту з шырокімі рабоча-сялянскімі масамі.

Наступным буйным мерапрыемствам Выканбюро было разьвязаньне пытаньня аб Касах Узаемадапамогі, якія існавалі разрозьнена на факультэтах, бяз уставаў і Палажэньняў. Пасьля правядзеньня рэгістрацыі ў маштабе ўсяго ўнівэрсытэту і выработкі ўставаў, палажэньняў, форм і мэтадаў працы, Выканбюро склікала зноў зацьверджаных сяброў касы, на сходзе якіх было выбрана Праўленьне. Апошняе ў сваёй дзейнасьці па прынцыпіяльным пытаньням кіравалася ўвагамі Выканбюро. Існаваўшыя разрозьнена па факультэтах з сталоўкі былі зьліты к пачатку навучальнага году ў адну. Былі адрэмантаваны інтэрнаты Рабфаку, Мэдфаку і Пэдфаку. Ад камхозу атрымалі 50 пакояў. Многа ўвагі было аддадзена Выканбюро арганізацыі шавецкай майстэрні, цырульні, пральні і другіх прадпрыемств, зьвязаных з задаваленьнем патрэб і камунальных паслуг студэнтаў.

Аддаючы ўсю ўвагу экономічным пытаньням, Выканбюро, ў пачатку свайго існаваньня, куды слабей кіравала акадэмічнай і культурна-асьветнай працамі. Пры Выканбюро наступнага скліканьня шырока разгарнулася політыка—асьветная праца, у выніку якой ўдалося прыцягнуць студэнцтва да пролетарскай грамадзкасьці. Што датычыцца акадэмічнай працы, дык яна найбольш поўна, бяз усякага кіраўніцтва з боку Выканбюро, праводзілася на Факультэтах, у выніку чаго ў 1925/26 навучальным годзе ўтворана ліквідацыя Акадэмічнага аддзелу, з выключным правядзеньнем гэтай працы факультэцкімі органамі.

Для замацаваньня сувязі студэнцтва з прафсаюзамі, была склікана ў ліпені 1923 году ў нечарговая 2-ая конфэрэнцыя Пролетарскага Студэнцтва, з удзелам прадстаўнікоў усіх губ. аддзелаў профсаюзаў. Апошняя прайшла вельмі ажыўлена і сваю мэту цалкам спраўдзіла. Выканбюро 1-ага скліканьня арганізавала ў Б. Дз. У Гомельскае зямлячаства.

1923-24 навучальны год паставіў перад Выканбюро ва ўсю шыр пытаньне аб узьняцьці грамадзкай актыўнасьці студэнтаў. З прычыны таго, што Ц. В. К. Беларусі адпусьціў зьверх стыпэндыі штомесячную субсыдыю ў 3.000 руб., экономічнае становішча студэнцтва значна палепшылася. Аднačасова Праўленьне Касы Узаемадапамогі пасьпела так разгарнуць сваю працу, што здолела абслугоўваць, галоўным чынам у экономічных адносінах, усё большую і большую колькасьць сваіх сяброў, шляхам выдачы аднаčасовых пасобій і пазык „возвратных і безвозвратных". Профсэкцыі колькасна павялічваліся, якасна ўзмацнялася сувязь з губ. аддзелам і з усёй прафсаюзнай масай, ўзрастала і павялічвалася матар'яльная дапамога з боку губаддзелаў саюзаў адпаведным профсэкцыям. Сваімі сродкамі профсэкцыіі загадвалі па ўласнаму мяркаваньню, аказваючы матар'яльную дапамогу сябром данай профсэкцыі.

Усяго ва Унівэрсытэце было 18 профсэкцыі, з колькасьцю сяброў звыш 530 чалавек з агульнай колькасьці 3330 студэнтаў. З гэтага часу пачалася праца па ўцягваньню ў профсэкцыі студэнтаў з працоўнага сялянства, якія зьяўляліся сябрамі Касы ўзаемадапамогі. У лістападзе 1924 г. была склікана IV конфэрэнцыя, якая выбрала Выканбюро 3-га скліканьня. Яна вырашыла пытаньне коопэрыраваньня студэнтаў на льготных умовах (скарачэньнем паявых, сяброўскіх і аднаčасовых ўзносаў) Падрыхтована і праведзена праз Саўнарком 1 Р. С. І. пытаньне аб унясеньні у каштарыс Наркамасьветы расходаў па аплаце пэўнага штату працаўнікоў Выканбюро і на культурныя патрэбы. З гэтага часу правядзены ў закона-

даўчым парадку Саўнаркому дэкрэт аб летняй практыцы, на чарзе стаяла таксама абгаварэньне пытаньня аб мэтадах заняткаў і прынцыпах праверкі ведаў студэнтаў. Летняя практыка з кожным годам праводзіцца ўсё лепш і лепш, бо ўсё лепш выяўляюцца патрэбы мясцовай прамысловасьці і гаспадаркі, і ўсё больш дакладнай робіцца праца практыкантаў, адпаведна мясцовым умовам.

Эканамічнае становішча студэнцтва к восені 1924 г. выявілася ў наступным: больш — менш абсталяваная сталоўка адпушчала штодзённа 1800 абедаў, па сабекошту 18-20 кап., прычым, абеды выдаваліся ня толькі стыпэндыятам, але і тым сябрам касы Узаемадапамогі, якія мелі ў іх асаблівую патрэбу; цырульня прапушчала штодня 150 студэнтаў; бясплатна ў пяці студэнтцкіх інтэрнатах знаходзілася да 300 студэнтаў, у большасьці стыпэндыятаў.

Разгортвалася палітыка—асьветная праца. Пры Палітасьветаддзеле існавалі наступныя гурткі: мастацкі—42 чал., харавы і музычны — 131 чал., 3 драматычных гурткі: Беларускі, Яўрэйскі і Расейскі —130 чал.; ячэйка П. Н.—200 чал.; лектарскі колектыў—28 чал.; Бязбожнікаў—77 чал.; фізкультуры—70 чал. і гурток „Культурная дапамога весцы“ — 150 чал. Апошні ў 1925 годзе ўліўся ў Шэфвобчаства, якое выконвала шэфства над Самахвалавіцкім раёнам Менскай акругі. Наступная чарговая конфэрэнцыя арганізаванага студэнцтва адбылася ў кастрычніку 1925 году.

Асноўнай працай Выканбюро IV скліканьня была: рэарганізацыя профсэкцый па вытворча-факультэцкаму прынцыпу. У выніку колькасьць профсэкцыі скарацілася да 14, прычым з іх 10 існавлі на Рабочым Факультэце, з прычыны няяснасьці іх будучага ўхілу. Найбольш многалічбеннымі былі профсэкцыі: мэдсантруд—на Мэдфаку, Працаасьветы—на Пэдфаку і Саўгандльслужачых—на факультэце права і Гаспадаркі (б. Ф. Г. Н.) Асноўным пытаньнем у справе палепшаньня матар'яльнага становішча студэнцтва, апрача разгортваньня эканамічнай працы выканбюро і касы Ўзаемадапамогі, было на 1924-25 навучальны год павялічаньне разьмэру стыпэндыі і колькасьці стыпэндый —Усяго было адпушчана па дзяржбюджэту 1000 стыпэндый, з якіх 400 Рабфаку. Разьмер стыпэндыі роўны 12 р, у 1925-26 навучальн. годзе даведзены да 17 р. З пачатку навучальнага году сталі рэгулярна выходзіць насьценныя газэты па факультэтах. Газэты, з прычыны актыўнага і масавага ўдзелу студэнцтва, найбольш поўна асьвятлялі жыцьце Ўнівэрсытэту і былі адбіткам яго грамадзка-акадэмічнага жыцьця.

Каса Ўзаемадапамогі і Палітасьветаддзел поступова паглыбляюць сваю працу, удасканальваюць ўсё больш і больш свае мэтады на аснове вопыту мінулых гадоў і ўсё бліжэй падводзяць студэнцтва да жыцьця нашай акружаючай пралетарскай грамадзкасьці. Выканбюро гэтага скліканьня таксама, як і наступных скліканьняў, нясупынна высоўвала перед адпаведнымі савецкімі і грамадзкімі арганізацыямі пытаньне аб неабходнасьці стварэньня студэнцкага клюбу. Адсутнасьць спэцыяльнага памяшканьня перашкаджае рэалізацыі гэтага пытаньня ў жыцьці.

Прыняты шэраг конкрэтных мер у адносінах беларусізацыі. У 1924/25 нав. годзе апараты Выканбюро і яго аддзелы на мясцох у сваёй працы перайшлі выключна на беларускую мову. У 1926 годзе ўзмацнілася праца Краязнаўчага Таварыства, была наладжана сувязь з аб'яднаньнем „Маладняк“, Інбелкультам. Бібліатэка папоўнена бел. літаратурай і г. д.

Палітасьветадзел праз свае сэкцыі кіраваў працай наступных арганізацый: ячэйкі ПН—419 ч., МОПР'у—560 ч., Нот. -36 ч., Авіяхім—200 ч., Краязнаўчае таварыства—75 ч., ОСО—80 ч., Радыё—60 ч., Бязбожнік—35, Эспэранта—36. Струнна-Музычны гурток—82, Драмгурток—80, ІЗО—25, Спартгурток - 250, Шахматны—110 чал. Такім чынам, у актыўную політыка-асьветную працу ВНУ уцягнута 2081 чал., што складае каля 60 проц. З прычыны таго, што эканамічна-гаспадарчая праца да гэтага часу займала ў працы ўсіх складаў Выканбюро амаль ні цэнтральнае месца, Выканбюро VII скліканьня рэалізавала пытаньне аб перадачы сталовых, разьмеркаваньне стыпэндый і другіх гаспадарчых функцый, гаспадарчаму аддзелу Праўленьня Унівэрсытэту. Другія ўстановы, якія абслугоўвалі студэнцтва на началах „самоокупаемости“ (цырульня і інш.) перададзены ў вядзеньне Касы Узаемадапамогі.

К пачатку 1926-27 навуч. году праведзена праца па праверцы дзейнасьці студэнцкіх арганізацый за ўвесь час, маючы на мэце адначасова ўдасканаліць працу і ўнясьці ў яе элемэнты навуковай арганізацыі працы. У працягу 1926 навучальнага году не аднойчы падымалася пытаньне аб зьліцьці Выканбюро БДзУ з Белбюро студэнцтва, але апошняе не адбылося, з прычыны неабходнасьці мець пры БДз. Унівэрсытэце самастойны, студэнцкі, кіраўнічы і арганізацыйны асяродак.

Апошні 1926-27 г. адзначан надзвычайнай актыўнасьцю студэнцтва. Студэнцтва ўсё больш патрабуе ад стударганізацый, якія ўсю сваю працу будуюць такім чынам, каб усю гэтую актыўнасьць студэнцтва накіраваць у здаровае русло.

Арганізацыйныя формы будовы паляпшаюцца. Праца і грамадзкая нагрузка рацыяналізуюцца.

Палепшаньню матар'яльнага становішча студэнцтва садзейнічала разгорнутая праца па каапэрыраваньню, крэдытаваньню ўзаемадапамогі. У апошнім адбыліся аранізацыйныя зьмены ў сэнсе дэцэнтралізацыі і арганізацыі самастойных кас на факультэтах.

Асабліва выявілася актыўнасьць, як ўсяго студэнцтва, гэтак і студэнцкіх арганізацый ў пытаньнях навучальнага жыцьця Ун-ту. Зноў была створана пры Выканбюро Акадэмкамісія.

Прапрацоўка навучальных плянаў, пытаньні летняй практыкі, уздым кваліфікацыі, рацыяналізацыя навучальнага жыцьця, высоўваньне і падрыхтоўка навуковых працаўнікоў, выданьне шэрагу падручнікаў і праграм—вось асноўныя моманты працы акадэмкамісіі.

Мінулы год досыць выразна выявіў настроі студэнцтва, якое вытрымала з гонарам экзамен савецкага грамадзянства. Акадэм. пасьпяваемасьць колькасна і якасна ўзрасла.

Студэнцтва чула і своечасова рэагіруе на ўсе зьмены ў міжнародных абставінах і солідарызуецца з усім пролетарыятам, часткаю якога яно зьяўляецца.

Пролет. студ. БДзУ пераступае парог дзесяцігодзьдзя Вялікага Кастрычніка, уяўляючы сабой арганізаваную сілу пралетарскай інтэлігэнцыі, дзеяні і імкненьні якой накіраваны да барацьбы за перамогу рабочай клясы, за захаваньне і ўмацненьне заваёў Кастрычніка.

# З партыйнай працы ў Б. Дз. У.

К дзесяцігодзьдзю гадавіны Кастрычніка, калі рабочыя і сяляне Беларусі побач з складанымі задачамі і клопатамі па будаўніцтву Савецкай дзяржавы падводзяць вынікі сваім дасягненьням за 10 год, мы дэманструем некаторыя вынікі партыйнага будаўніцтва ў нашым унівэрсытэце.

Ці трэба гаварыць асабліва шырока аб дасягненьнях, калі за плячыма шэсьць год працы. І якой працы—ўпартай, цяжкой, цесна зьвязанай з ростам і разьвіцьцём Ун-ту.

Ун-т вырас, ўзмацніўся, стаў сапраўднай кузьняй пралетарскай ідэолёгіі, пусьціў глыбока свае веды ў гушчы беларускай рабоча-сялянскай масы.

Пройдзены шлях будаўніцтва і арганізацыі Унівэрсытэту быў нязвычайным, як нязвычайнымі былі ўмовы, у якіх разьвіваўся новы культурны асяродак на Беларусі.

Кожны год, побач з агульным уздымам нашай сацыялістычнай гаспадаркі і ўзмацненьнем краіны ў цэлым, узьняцьцем актыўнасьці рабоча сялянскіх мас, уносіў многа новага, бадзёрага і здаровага ў жыцьцё Беларускага дзяржаўнага Унівэрсытэту.

Адпаведна гэтаму, парт. колектыў—пярвічная ячэйка камуністычн. партыі ва Ун-це,—адпаведная перад партыяй і пралетарыятам у цэлым, перабудоўваў свае рады і працу, у сувязі з агульнымі задачамі і мясцовымі патрабаваньнямі.

* * *

1921-1922 г. г. Маленькія разрозьненыя групкі комуністых на асобных факультэтах. Усе яшчэ мала ведаюць адзін другога. Няма яшчэ вопыту ў кіраўніцтве ўнівэрсытэцкай грамадзкасьцю. Няма яшчэ адзінага магутнага камуністычнага калектыву, які-б напраўляў і кіраваў ўнівэрсытэцкім жыцьцём. Невядомы яшчэ формы арганізацыі студэнцтва і мэтады працы. На факультэтах, ў прыватнасьці на мэдфаку, дзе парт. калектыў быў найбольш актыўным, былі хутчэй знойдзены формы і мэтады працы, як па акадэмічнай арганізацыі, гэтак і па эканамічным і палітычна-асьветным жыцьці. Гэты вопыт к наступнаму году быў перанесены, на другія факультэты і першпачатковыя ячэйкі студ. арганізацый на мэдфаку былі пачаткам адпаведных агальна-ўнівэрсытэцкіх арганізацый.

* * *

1922-1923 г. г. Такім-жа тэмпам, як йшло жыцьцё, расло і шырылася будаўніцтва нашага маладога Унівэрсытэту. Яго трэба было ахапіць, накіроўваць, і з гэтай мэтай асобныя комуністычныя ячэйкі, якія існавалі на мэдфаку і на факультэце грмадзкіх навук,—зьліваюцца ў адну агульную камуністычную ячэйку БДзУ. Разьвіваецца шырокая самадзейнасьць студэнцтва. Пралет. студэнцтва няможа


Бюро ячэйкі
К.П.(б)Б
Бел. Дзярж. Універсытэту.
(XI-1927 г.)

быць толькі пасыўным слухачом у сьценах вышэйшай школы. Яно адначасова зьяўляецца і актыўным удзельнікам усіх мерапрыёмств па будаўніцтву сваёй школы. Студ. арганізацыі, а праз іх і студэнцтва ўдзельнічаюць у працы прадметных камісій. Ствараецца акадэм. сэкцыя. Студэнцтва пасылае сваіх прадстаўнікоў ў дэканаты, Саветы Факультэтаў Унівэрсытэту, і ў Праўленьне Унівэрсытэту. І вось, камуністычны калектыў ўвесь час кіруе гэтай аджыўшай грамадзкай актыўнасьцю студэнцтва. Патрэбы і запросы студэнцтва ўвесь час клапатліва прымаюцца пад увагу камуністычным калектывам.

* * *

1923-1924 г. Да гэтага часу ўжо магутны колектыў з 369 партыйцаў, працаваў настойліва і ўпарта, сумесна з усім студэнцтвам па далейшаму ўзмацненьню БДзУ. 134 таварышы актыўна працавалі ў вытворчых ячэйках гораду Менску. 170 таварышоў вялі партыйную працу сярод пролетарскіх мас ранічнага Рабфаку. 65 таварышоў накіравана для штодзённай „органічнай“ працы на трох асноўных факультэттх БДзУ. За гэты-ж час ячэйка перажывае разам з усёй партыяй і прац. масай сьмерць свайго правадыра У. І. Леніна.

Сувязь з беспартыйным студэнцтвам усе больш і больш ўзмацнялася. Сходы колектыву наведваюцца агромністай колькасьцю беспарт. студэнцтва. Заля ўжо ня можа зьмясьціць усіх прысутных. У ячэйку паступае звыш 100 заяў ад жадаючых уступіць ў партыю. Вядзецца шырокая гуртковая палітыка-выхаваўчая праца сярод студэнцтва і арганізуюцца марксыцкія сэмінары для сяброў колектыву.

Вялікую ўвагу аддае ячэйка партыі ячэйцы КСМ якая да гэтага часу ахапіла амаль ўсю рабоча-сялянскаю моладзь Унівэрсытэту і энэргічна вядзе ў сваіх радох баявую выхаваўчую працу. 110 маладых кіпучых камсамольцаў настойліва патрабавалі паглыбленьня кіраўніцтва парт. колектыва Камсамолам, і яно было поўнасьцю забясьпечана.

Насьпявае ліквідацыя факультэту Грамадзкіх навук. Калектыў праводзіць вялікую тлумачальную працу, а ў сувязі з ліквідацыяй Ф.Г.Н. стаіць пытаньне аб перанясеньні асяродка ўвагі на Пэдфак, дзе сконцэнтравана аснаўная маса пролетарскага студэнцтва. Гэта вядзе да неабходнасьці стварыць асобныя ячэйкі на Мэдфаку і Пэдфаку з агульна-ўнівэрс. калектывам.

У такім становішчы ячэйкі існавалі да студзеня 1926 г. гэтым раз'яднаньнем ячэек была дасягнута вялікая спайка, ўзмацненьне парт.-выхаваўчай працы, яшчэ большая сувязь з масамі беспартыйнага прал. студэнцтва, больш поўнае кіраўніцтва грамадзка-акадэмічнымі арганізацыямі факультэту.

Але разам з тым ўсё-ж цярпела кіраўніцтва агульна-ўнівэрсытэцкімі арганізацыямі, бо ня было адзінага кіруючага партыйнага асяродку.

* * *

1925-1926 г. г. Жыцьцё Унівэрсытэту абагачаецца адчыненьнем новага Факультэту Права і Гаспадаркі. Партыйнае жыцьцё—стварэньнем адзінага партыйнага колектыву, які падзяляецца на ячэйкі па факультэтах, і на чале якога стаіць партыйны і агіт.-проп. арганізатары. Шырока разгортваецца партыйная праца. Паглыбляецца кіраўніцтва студэнцкімі арганізацыямі. Партыйная вучоба арганізуецца па сыстэме самаадукацыі, якая кіруецца заўсёдным кадрам

консультантаў. Паглыбляецца кіраўніцтва камсамольскай і шэфскай працай над сельсаветам і над вайсковымі часткамі.

*

1926-1927 г. г. Унівэрсытэт ўзмацніўся. Парт. колектывы на факультэтах узрасьлі пад адзіным кіраўніцтвам Бюро ячэйкі. Канчаткова вызначаны нармальныя ўзаемаадносіны паміж кіраўнічымі, партыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі.

Ячэйкі КПБ узрасьлі колькасна, якасна ўзмацніліся. Удзельная вага іх высокая, як па свайму складу, гэтак і па свайму аўтарытэту і ўплыву на масы студэнцтва і навуковых працаўнікоў.

Вось ў агульных рысах асноўныя моманты нашай партыйнай працы ва Унівэрсытэце. І калі ў першыя м-цы, ва ўмовах выключна цяжкіх, расла спайка, узмацнялася шчыльнасьць радаў, шырыўся ўплыў на студэнцтва, множыўся вопыт, адраджалася праца і накіроўвалася жыцьцё ўсяго факультэту, дык сягодня, да дню кастрычніка, мы асабліва востра адчуваем нашую сілу і моц.

Пралетарскае студэнцтва з намі. Яно перапаўняе нашыя ячэйкавыя сходы, і мы можам налічыць агромністую групу сяброў, якія імкнуцца ў партыю, сапраўдных, адданых нашых прыхільнікаў.

Замацаваньне дасягнутых вынікаў, пытаньні яшчэ большага ажыўленьня ўнутры—партыйнага жыцьця, мерапрыёмствы па ўзмацненьню марксыцка-ленінскай падрыхтоўкі партыйнай масы, выхаваньне нашай камсамольскай зьмены, папаўненьне ячэйкі за лік лепшых пралетарскіх элемэнтаў, іх падрыхтоўка для партыі—яскравымі штрыхамі кладуцца ў пэрспэктыву нашай далейшай партыйнай працы і застаюцца такімі-ж яснымі і рэльефнымі, як ў першым шасьці годзьдзі, праз якое мы так урачыста перашагнулі.

Я. МАРУК.

# Навукова-дасьледчая краязнаўчая праца ў Б. Дз. У.

Краязнаўчыя гурткі і таварыствы стала пачалі арганізоўвацца на Беларусі толькі у 1924 годзе. Ва унівэрсытэце краязнаўчая праца вялася амаль ня з першага дню існаваньня. Кожная кафэдра, у тым, ці іншым напрамку імкнулася дасьледаваць край і яго асаблівасьці.

Студэнцтва з самага пачатку было зацікаўлена краязнаўчай працай. Але апошняй шмат перашкаджала адсутнасьць сувязі з іншымі краязнаўчымі арганізацыямі, і таксама адсутнасьць сваёй студэнцкай арганізацыі, якая праводзіла-б самаадукацыйную працу сярод студэнцтва, бо на адных імкненьні, на адных жаданьнях, без адпаведнай самаадукацыі і падрыхтоўкі нельга весьці дасьледчай працы.

Краязнаўчая конфэрэнцыя, якая адбылася роўна 3 гады назад з задаваленьнем адзначыла краязнаўчы характар працы ва унівэрсытэце і побач з гэтым канстатавала дрэннае становішча ў справе студэнцкага краязнаўчага руху, які ня мае кіраўнічай студэнцкай краязнаўчай арганізацыі.

У тым жа 1924 годзе рэктар БДУ, проф. В. Ів. Пічэта, пісаў што беларускае студэнцтва павінна прыймаць самы актыўны ўдзел у краязнаўчай працы, што без студэнцкай дапамогі краязнаўчыя організацыі ня здолеюць многа зрабіць. І калі ў 1905 годзе і пазьней беларускія студэнцкія гурткі вывучалі сваю краіну і яе нацыянальна-культурныя ўмовы, дык цяпер, калі адчынены ўсе шляхі ў пытаньнях краязнаўства, студэнцкія арганізацыі павінны стаць цэнтрам краязнаўства. „Знаток сваёй радзімы, ёсьць сіла без якой народная праца ня можа быць пасьпяховай“.

У пачатку 1925 году ў артыкуле „Задачы студэнцтва Беларусі“ б. сэкратар Ц. К. К. П. (б.) Б. т. Крыніцкі адзначаў: „Неабходна студэнцкім арганізацыям у сваіх шэрагах злучыць тых людзей, якія любяць Беларусь, зьвязаны з ёй, хочуць і лічаць сваім абавязкам зьвярнуцца да тых рабочых і да таго сялянства, якія іх выдзялілі на вучобу. Неабходна ў гэтых арганізацыях высока падняць краязнаўчую працу, якая падрыхтуе людзей, знаёмых з прыродазнаўчымі, гістарычнымі і іншымі ўмовамі Беларусі“.

Шмат студэнтаў высоўвалі пытаньне аб стварэньні студэнцкай краязнаўчай арганізацыі ў Б. Дз. У. Некаторыя нават прапанавалі арганізаваць таксама і агульна-Беларускую студэнцкую краязнаўчую асоцыяцыю, якая-б мела уплыў, як арганізацыйна, гэтак і навукова на ўсе студэнцкія гурткі ў В. Н. У. Беларусі.

Такім чынам мы бачым, што у 1924-25 годзе з усіх бакоў было высунута пытаньне аб утварэньні краязнаўчай студэнцкай арганізацыі, мэтай якой павінна быць удумлівае самай сутнасьці пытаньня, мэтадолёгічная распрацоўка і, наогул, дапамога студэнцтву ахапіць усе тыя моманты, якімі жыве і з якімі зьвязана ўся маса насельніцтва роднай краіны.

Што-ж было зроблена ў гэтым напрамку і якія мы маем дасягненьні?

З самага пачатку нельга ня прызнацца, што студэнцкія проф-арганізацыі, якія ва ўсіх пытаньнях ідуць па чале, у пытаньні краязнаўства, ня зьвярнулі сваечасова патрэбнай увагі на гэту справу.

Праўда, што ў 1924-25 годзе, калі асобныя студэнты і грамадзкія дзеячы высоўвалі гэта пытаньне, стударганізацыі займаліся вельмі важнымі пытаньнямі пабудовы Унівэрсытэту і політвыхаваўчай працы, але-ж факт застаецца фактам—краязнаўчае навуковае таварыства Б. Дз. У. арганізаванае ў 1925-26 годзе, аформілася канчаткова толькі ў 1926-27 годзе. Тут-жа трэба адзначыць, што і да гэтага часу многа студэнцкіх арганізацый ня прыймаюць ніякага ўдзелу ў краязнаўчай працы і ня цікавяцца ёю. Зразумела, што адсутнасьць падтрыманьня з боку іншых студэнцкіх арганізацый адбілася на працы краязнаўчага т-ва.

Апошняе ставіць перад сабой тры мэты.

Галоўная—вывучэньне сваёй краіны—Беларусі, шляхам зьбіраньня краязнаўчага матар'ялу індывідуальна, таксама шляхам экспэдыцый, экскурсій і г. д.

Другая мэта—навукова дасьледчая распрацоўка матар'ялаў, ужо сабраных студэнцтвам.

Трэцьця мэта—падрыхтоўка з колаў студэнцтва навуковых, з краязнаўчым ухілам, працаўнікоў; даць магчымасьць студэнту самастойна выявіць сябе практычна ў навуковым напрамку.

Такім чынам, галоўнай задачай таварыства зьяўляецца аб'яднаньне навакол сябе ўсю навуковую думку лепшай часткі студэнцтва і ў сваю чаргу даць студэнцтву новы цікавы зьмест грамадзкай працы.

Побач з тым навукова дасьледчыя экспэдыцыі і экскурсіі павінны задаволіць і культурна-асьветныя запатрабаваньні студэнцкай моладзі.

Прафэсарскі і настаўніцкі склад прыймае ўдзел у працы, праўда ня ўсе ў аднолькавай меры.

Лік сяброў таварыства на 1-IX—26, быў 70, зараз жа палічваецца 171 чалавек. Мала уцягнута жанчын (39), мала мэдфакаўцаў (35) і праўгасаўцаў (17). Недастатны і лік партыйцаў (сяброў і канд. КПБ—16, КСМ—29). Апошнія перагружаны і пры ўсім сваім жаданьні ня могуць цалкам аддацца краязнаўчай працы. З агульнага ліку сяброў таварыства, працуюць ў ім толькі 50 проц. і гэта наводзіць на думку аб неабходнасьці шэрагу мерапрыемств у сэнсе больш уважлівых адносін да прыёму новых сяброў т-ва.

З прычыны адсутнасьці сродкаў, з трох намечаных экспэдыцый, адбылася толькі адна ў Тураўскі раён Мазырскай акругі, якая мела агульна-дзяржаўнае значэньне. Матар'ялы распрацоўваюцца і будуць надрукаваны асобным зборнікам. Экспэдыцыяй зроблена вялікая грамадзка-культурна асьветная праца сярод сялянства: праведзена 30 папулярных лекцый і дакладаў на розныя тэмы.

Таксама за адсутнасьцю сродкаў ня ўдалося арганізаваць асобных далёкіх экскурсій, але т-ва дабілася уключэньня сваіх сяброў у лік агульных экскурсій Выканпрофбюро.

Галоўная праца т-ва—навукова-дасьледчая, якая праводзіцца па сэкцыях і камісіях. Усяго утворана і аформлена 6 сэкцый: прыродазнаўча-геаграфічная, сацыяльна-эканамічная, культурна-гісторычная, мэтадычная, сэкцыя мовы літаратуры і яўрэйская сэкцыя. Больш працаздольнымі зьяўляюцца мэдычная і культурна-гістарычная сэкцыі.

Так, мэдычная сэкцыя заслухала шэраг навуковых дакладаў, і паміж іншым, студэнцкія даклады на наступныя тэмы: „Як і чым лечыцца наша вёска“, „Вальляк па Менску“, „Вальляк па Віцебшчыне і Аршаншчыне“, „Санітарна-Гігіенічны досьлед Асіпавіцкага раёну“, „Як адбіліся хваробы на народнай творчасьці“, „Лекавыя травы па Беларусі і іх ужытак у народнай мэдыцыне“.

Яўрэйская сэкцыя арганізавана зусім нядаўна і аб працы яе яшчэ рана гаварыць. Мэтай яе зьяўляецца вывучэньне быту, эканомікі, мовы і літаратуры яўрэяў на Беларусі.

Калі мы ў 10-ую гадавіну Кастрычнікавай рэвалюцыі і 6-ю гадавіну існаваньня Б. Дз. У. аглядаемся на пройдзены шлях, мы павінны адзначыць ўзрост і ўзмацненьне, асабліва за апошні год, краязнаўчай працы ў Б. Д. У. У гэты-ж час нельга ня спыніцца на недахопах, да зьнішчэньня якіх павінна імкнуцца наша грамадзкасьць. І галоўным недахопам зьяўляецца, як ужо вышэй было гаворана, некаторая індыфэрэнтнасьць да справы краязнаўства з боку шэрагу студэнцкіх арганізацый. Недахопам зьяўляецца таксама няўвязка нашай краязнаўчай працы з вучэбнымі плянамі. Чарговай задачай павінна зьявіцца барацьба за зьнішчэньне гэтых недахопаў.

Студэнт павінен вывучаць родны край і вывучыўшы змагацца за яго культурнае і эканамічнае адраджэньне.

ЭЛЬКІНД.

## ОСО ў Б. Дз. У.

Адказам працоўных мас С.С.С.Р.на памятную ноту Кэрзона было ўтварэньне дабрахвотных таварыств, мэта якіх—акаваць матар'яльную і іншую дапамогу Чырвонай Арміі і падрыхтоўка да абароны ў выпадку ваеннай інтэрвэнцыі.

Пролетарскае студэнцтва СССР хутка адгукнулася на заклік савецкай грамадзкасці. У Б. Д. У. былі арганізаваны ячэйкі „ОДВФ“ і „Добрахім“. Праца гэтых ячэяк у тэрмін 1923—1926 т. г. заключалася ў уцягненьні новых сяброў, зьбіраньні сяброўскіх узносаў. Практычнай працы ваенізацыі не праводзілася. Паралелізм у працы двух таварыств „ОДВФ“ і „Доброхім“, якія ставілі перад сабой адну мэту абароны краіны, адбіўся на працы ячэяк у Б. Д. У. у сэньсе непрадукцыйнасьці.

Пасьля зьліяньня, зноў арганізаваўшаяся ячэйка „Добрахім“ налічвала 180 сяброў, сярод якіх значна паглыбілася праца, пачалі працу гурткі і хімкаманды. Побач з разгортваючайся працай Авіахіму ўзрастала праца ячэйкі ОСО, якая мела ў сваім распараджэньні стралковыя гурткі, гурткі вайсковых ведаў, навуковыя гурткі і г. д. З пачатку працы ячэйка ОСО налічвала 90 сяброў, але праца ОСО праводзілася сярод усёй масы студэнцтва.

У пачатку 1927 году зьліліся таварыствы Добрахім і ОСО ў адно—Осоавіахім Новая ячэйка ў Б. Д. У. адразу налічвае 406 чал. И фактычна толькі з гэтага часу праца ваенізацыі была накіравана па належнай плыні. Да 1927 году праца мела характар бальшасьцю „Компанейский“. У гэтым жа годзе мы маем у Б. Д. У. стройную арганізацыю ячэяк Осоавіахіму па ўсім факультэтам і на 1-ае лістапада лік сяброў узрос больш чым на 100 проц.—876 чал. Гэта паказвае што студэнцтва ўявіла сабе задачы абароны. Усяго мы маем у БДУ 5 ячэяк (па Мэдфаку, Пэдфаку, Праўгасу, Рабфаку і пры мясцкоме супрацаўнікоў).

Агульнае кіраўніцтва працай сканцэнтравана ў бюро, пры якім, працуюць 7 сэкцый: ваеннасанітарная, ваенна-палявой хірургіі, стралкова—тактычная, вайсковай зброі, дзьве ваенна—хімічныя і артылерыйская. Гурткоў налічваецца—26, у якіх працуюць 404 студэнты. Заняткі гурткоў праводзяцца па пляну нясупынна. Частка працы праведзена пад кіраўніцтвам прафэсуры.

У параўнаньні з агульным лікам студнцтва ячэйка яшчэ колькасна малая, але працай сваёй яна ахапіла большую частку студэнтаў. Аб гэтым сьведчаць вечары і экскурсіі ў якіх прыймаюць удзел студэнты не сябры ОСО.

Ячэйка цесна зьвязана з акруговым саветам ОСО. Навакол ячэйкі маецца актыў з 103 чалавек. Дасягненьнем ячэйкі зьяўляецца ўцягненьне ў працу жанчын. Ваенна-санітарныя курсы складаюцца амаль што поўнасьцю з студэнтак.

Заняткі праводзяцца ў ціры, прапускная здольнасць якога яшчэ малая і ў гэтым годзе ён будзе пашыраны.

С. МЕКЛЕР.

# Штрыхі быту.

## 1. Харчаваньне.

Большасьць студэнцкай масы харчуецца ў сталоўках. Студэнцкая сталоўка прапушчае штодня да 1000 чалавек, некалькі сот абедае ў шостай сталоўцы М. Ц. Р. К., у якой ад 2-х да 3-х гадзін дня—час вольны ад лекцый і практыкумаў—можна ўбачыць студэнтаў усіх факультэтаў і курсаў.

На першым годзе існаваньня Унівэрсытэту сталоўкі ня было. Ў 1921—22 годзе на плошчы Волі, недалёка ад будынку, дзе зараз зьмяшчаецца Саўнарком, знаходзіўся коопэратыў „Медик“, дзе студэнты Мэдфаку атрымлівалі штомесячны паёк—муку, цукер, алей, замарожанае соленае мяса і г. д. Муку мянялі на хлеб, мяса часта „збывалі“ у абмен на больш страўныя прадметы, само мяса варыць ня было ў чым і на чым.

Аднойчы, праўда, рашылі хлопцы ў інтэрнаце па камсамольскай вуліцы прыгатаваць мясное блюда. Дасталі кацялок, бульбы і, самае галоўнае, пару дашок ад суседзкага плоту. Дзьве цэгліны замянілі таганок, а ўласныя лёгкія адыгрывалі ролю кавальных мяхоў—сырыя дошкі доўга не хацелі гарэць. Калі патух апошні вугалёк і апэтыт дайшоў да вышэйшага пункту, выявілася, што „топліва“ не хапіла. Мяса і бульба зварылася толькі на палову. Але... ня выкідываць-жэ... Голад ня цётка? Калі можна грызьці граніт навукі, чаму нельга грызьці недаваранаю саланінку. І грызьлі. Грызьлі пад акампанімэнт хрусьцеўшай пад зубамі сыраватай бульбы.....

Сталоўка адчынілася ў пачатку 1923 г. Знаходзілася яна ў вядзеньні касы ўзаемадапамогі, экономаддзелу Выканбюро, а цяпер ёй загадвае Праўленьне Ўнівэрсытэту. У сталоўцы апрача абеда можна па дзяшовай цане атрымаць сьняданьне і вячэру.

У радзе пакояў інтэрнатаў, у большасьці жаночых, арганізавана калектыўнае харчаваньне. Уносяць паі—кожны жылец у сярэднім 6 руб. і на гэтыя грошы сьнедаюць і вячэраюць. Рыхтуе сьнеданьне дзяжурны па пакою, пры чым, што і як прыгатаваць цалкам залежыць ад гаспадарчых здольнасьцяй дзяжурнага. Трэба сказаць, што задача гэта нялёгкая: накарміць чалавека ў дзень два разы за 20 к., тут патрэбны і гаспадарчыя здольнасьці і уменьне поўнасьцю правесьці рэжым экономіі. Многае залежыць ад характару дзяжурнага; адны ідуць па лініі „наименьшего сопротивления“—купляюць у коопэратыве, каўбасу, масла і інш. , гатуюць на прымусе гарачыя стравы—бульбу варыць, жарыць грэнкі і, нават, тушаць моркву. Фонд харчаваньня непарушаны; толькі ў асабліва важных выпадках, калі трэба купіць падарунак чырвонаармейцам, якія варочаюцца з манэўраў, альбо, калі прыяжджае на гастролі Маскоўскі тэатр, пазычаюць у фондзе грошы да наступнай стыпэндыяльнай палучкі.

Гаворачы аб харчаваньні студэнтаў, нельга не закрануць таго факту, што ў дні рэволюцыйных сьвят, у дні, калі ўсюды харчаваньне паляпшаецца наша студэнцкая сталоўка не працуе зусім і напярэдадні выдаюцца сухія прадукты—хлеб, каўбаса і г. д.

У выніку—сьвята ў нашым быту зусім не адчуваецца, альбо праўдзівей адчуваецца ня так, як павінна было-б. І ў юморыстычнай музычнай газэце на вечары, ў адно з такіх сьвят, студэнцтва сьпявала пра сваю дэмонстрацыю „по улицам ходила большая крокодила, она, она голодная была“.

Гэты факт адзначаўся і ў наказах Прафкомам. Абяцалі ў гэтым годзе справу выправіць.

## 2. Інтэрнат.

Гаварыць аб значэньні інтэрнату ў быту нашага студэнцтва ня прыходзіцца. Ва ўмовах кватэрнага крызісу Менску наяўнасьць інтэрнату на 450 чал. зьяўляецца вялікім дасягненьнем стударганізацый. Але гэтага ня досыць. Усяго толькі 50 проц. стыпэндыятаў жыве ў інтэрнатах, тады, як жадаючых многа больш. І штодзённыя кватэрныя батальіі, перапоўненасьць пакояў „сверхкоечные обитатели“ —усё гэта падкрэсьлівае неабходнасьць далейшага павялічэньня, кват. плошчы інтэрнатаў.

У 1921 г.—першы год існаваньня Ўн-ту інтэрнатаў ня было. У 1922 г. адчыніўся інтэрнат па Камсамольск. вул. на 30 ч. Цесната беднае абсталяваньне, холад ня будзем граха таіць ужо прайшла судзебная даўнасьць, можна прызнацца калі неўмагату было ад марозу калі замярзала вада ў шклянцы на стале, йшлі студэнты ў анатамку і са страхам вялікім (баяліся стоража), „умыкалі вязанки“ дроў.

У 1923 г. беларуская Т-ва „Чырвонага крыжу“ абсталявала студэнцтву інтэрнат па Беларускай вуліцы на 30 чал. Намячаўся ён спэцыяльна для студэнтак—і нават надпіс быў адпаведны:— „інтэрнат для студэнтак“,—але жылі ў ім і хлопцы. Пры інтэрнаце быў добры фруктовы сад, пасылаліся туды таварышы слабыя здароўем—лічыўся інтэрнат, як-бы домам адпачынку. У 26 г. быў гэты інтэрнат перададзены гідратэхнікуму.

У 24 г. на 100 месц павялічылася жыл. плошча—стударганізацыі атрымалі будынак па вул. Энгельса. Жывучыя цяпер у гэтым інтэрнаце наўрад ці ўяўляюць сабе, які быў выгляд інтэрнату ў той час. „Старычкі“ успамінаюць з неахвотай, і асабліва падкрэсьліваюць фанэрныя перагародкі з жорсткімі клапамі...

У 25 г. Пэдфак пераехаў на Земляробскі завулак і зволыніў пад інтэрнат трохпавярховы будынак па Ленінскай. Гэта дало павялічэньне на 150 ложкаў. Адрэмантаваны інтэрнат па вул. Энгельса, зачынены, у мэтах зьнішчэньня распыленасьці і захаваньня экономічнага адзінства, невялічкі інтэрнат па камсамольскай.

За апошні год у сувязі з пераездам кафэдр Мэдфаку (гістолёгіі і фізіолёгіі) жылплошча зноў узрасла.

І ў цяперешні момант мы маем 450 ложак. Ужо няма і ўпаміне драўляных тапчаноў першых год, іх выцясьнілі жалезныя ложкі, ужо ня прыходзіцца вечарамі насіць дровы з анатомкі. Інтэрнаты рэгулярна апальваюцца, няма былой цесьнаты, не параўняць санітарнае становішча пакояў. Апошняе ва многім залежыць ад саміх жыльцоў і нярэдка большыя і мнагалюдныя жаночыя пакоі, куды чысьцей ўтрымліваюцца, чым маленькія пакоі, якія лягчэй прыбраць і ў якіх жывуць усяго 2—3 чалавекі „моцнага“ полу.

Унутраны распарарадак строга захоўваецца жыльцамі і няма месца ўжо тым „мастацтвам“, аб якіх два гады назад гаварыў на студконфэрэнцыі тав. Слонім, калі студэнты дзеля „фізычных досьледаў“ праводзілі кароткае замыканьне, і інтэрнат некалькі дзён ня меў сьвету, калі цяжка было змагацца з недысцыплінаванасьцю асобных жыльцоў. Зьмяніўся знадворны выгляд пакояў:— фэранкі, партрэты, кветкі—ўсё гэта драбніцы, але драбніцы, гаворачыя аб няўхільным росьце сьвядомасьці таго, што інтэрнат трэба берагчы аздобіць, бо тым самым аздабляецца наш быт, нашае жыцьцё.

Зьнішчана безкарыснае і нясупыннае хаджэньне жыльцоў інтэрнату па пакоях суседзяў, якое перашкаджала займацца, няма былой зьнявагі да сажыцеля.

Аглядаючыся на шлях прароблены інтэрнатамі мы павінны канстатаваць іх рост, побач з ростам і ўсяго нашага маладога В. У. З‘у.

Мы ўпэўнены, што рост гэты будзе прадаўжацца і далей.

БИБЛИОТ...А
№ 4066
1684

# ЗЬМЕСТ.


| | | Стар. |
|---|---|---|
| 1. Проф. В. І. Пічэта . . | —Беларускі Дзяржаўны Ўнівэрсытэт напярэдадні 10-годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі . . . . | 5 |
| 2. Проф. М. Б. Кроль . . . | —Першыя крокі па арганізацыі Мэдфаку Б. Дз. У. (успаміны) . . . . . . . . . . . . . . . . | 47 |
| 3. Проф. С. Я. Вальфсон . | —Адрыўкі з успамінаў і думкі . . . . . . . . . . | 52 |
| 4. Проф. М. М. Піатуховіч. | —Старонкі ўспамінаў . . . . . . . . . . . . . . | 57 |
| 5. | —Выканбюро профсэкцый . . . . . . . . . . . | 60 |
| 6. | —З партыйнай працы ў Б. Дз. У. . . . . . . . . | 64 |
| 7. Я Марук . . . . . . . | —Навукова-дасьледчая краязнаўчая праца ў Б. Дз. У. | 67 |
| 8. Эльнінд . . . . . | —ОСО ў Б. Дз. У.. . . . . . . . . . . . . . . . . | 70 |
| 9. С. Меклер . . . . . . . | —Штрыхі быту . . . . . . . . . . . . . . . . . | 71 |


1980

# Памылкі друку.

| Стар. | Надрукавана: | Павінна быць: |
| --- | --- | --- |
| 11 | 8 радок зьнізу: якой рэктар | на якой рэктар |
| 39 | 6 радок зьнізу: К. Ф. Параў | К. Ф. Папоў |
| 41 | 8 радок зьнізу: Гаісман Ф. Я. | Гаўсман Ф. Я. |
| 43 | 17 радок зьверху: Інстытут Нармальнай Анатоміі | Інстытут Нармальнай Гісталёгіі |
| 47 | 12 радок зьверху: „разрешенного состава | „разреженного состава |
| 48 | 7 радок зьнізу: у галоднай краіне | у заходняй краіне |
| „ | 26 радок зьнізу: ў курсу | V курсу |
| 51 | 16 радок зьверху: знаў | зноў |
| „ | 21 радок зьнізу: разам другім друкурсам-таксама | разам з другім курсам, таксама |
| 54 | 13 радок зьверху: будынку | У будынку |
| 57 | 5 радок зьнізу: складвалі | скрадвалі |